КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 4 (227) ◂ 28 студзеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ТРОХГАДОВЫ ЗАКЛАДНІК**

Стар. 5

**НАЗАРБАЕЎ НАЗАЎСЁДЫ**

Пра апошнія падзеі ў Казахстане журналіст газеты «НЧ» размаўляе з Андрэем Грышыным, палітолагам з Алма-Аты

Стар. 27

**СТАРЫ НОВЫ СВЕТ**

У Бостан мяне занесла ўсяго на паўдня, з неба ліло бязбожна, апроч таго, ці не ўпершыню ў жыцці я не ведала, у які бок мне ісці

Стар. 30

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**АЛЕНА ТАНКАЧОВА**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ЛАГОДНАЯ КАПІТУЛЯЦЫЯ

Вольга ХВОІН

**Расія аднавіла пастаўкі нафты ў Беларусь 25 студзеня. Умовы паставак афіцыйна не каментуюць ні ў Маскве, ні ў Мінску. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, беларускаму боку давялося пайсці на саступкі Расіі.**




Расійскія нафтавыя кампаніі спынілі пастаўкі нафты ў Беларусь з 1 студзеня бягучага года ў сувязі з адсутнасцю дамоваў на 2011 год. У 20-х днях студзеня беларускія НПЗ апынуліся пад пагрозай спынення.

У адпаведнасці з міжурадавым пагадненнем аб размеркаванні экспартных пошлін ад 9 снежня 2010 года, з 1 студзеня 2011-га Беларусь можа закупляць расійскую нафту і нафтапрадукты без выплаты пошлін. Была ўзгодненая закупка Беларуссю ў бягучым годзе 21,7 мільёна тон нафты, у тым ліку 18 мільёнаў тон трубаправодным транспартам.

Расійскія кампаніі настойвалі на падвышэнні коштаў на нафту для Беларусі, паколькі Мінск з 1 лютага падняў мыты на транзіт нафты на 12,5 працэнта. Нафтавыя кампаніі прапанавалі закласці ў формулу цаны бяспошлінай нафты дадатковыя 46 долараў на тону. Паводле іх ацэнак, гэта дазволіць забяспечыць роўную даходнасць пры пастаўках нафты і нафтапрадуктаў на экспарт. Найбуйнейшымі пастаўшчыкамі расійскай нафты ў Беларусь з'яўляюцца «Лукойл», «Сургутнефтегаз» і «Роснефть».

Як перадае БелаПАН, прэс-сакратар канцэрна «Белнафтахім» Марына Касцючэнка, спаслаўшыся на камерцыйную таямніцу, адмовілася даць інфармацыю наконт запланаваных на студзень аб'ёмаў паставак нафты на беларускія НПЗ, а таксама пра формулу кошту на нафту, аб якой 25 студзеня дамовіліся беларускія і расійскія кампаніі. «Гэта камерцыйныя пытанні. Мы такую інфармацыю не давалі, не даем і даваць не будзем», — сказала Касцючэнка.

Відавочна, Расія ўпэўнена пераходзіць да рынкавых адносін нават «з брацкімі народамі» ў сферы гандлю энергарэсурсамі. Генеральны дырэктар «Гомельтранснефть Дружба» Сяргей Сасноўскі 25 студзеня паведаміў, што да канца студзеня кампанія плануе перапампаваць больш за 200 тысяч тон расійскай нафты для Мазырскага НПЗ.

20 студзеня прэм'ер-міністр Беларусі Міхась Мясніковіч здзейсніў першую працоўную сустрэчу па-за межамі краіны — у Маскве з кіраўніком расійскага ўрада Уладзімірам Пуціным. Падчас перамоў абмяркоўваўся шэраг пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку аб умовах пастаўкі нафты ў 2011 годзе, аб кошце прыроднага газу на 2011 год, будаўніцтве беларускай АЭС. Пасля перамоў Мясніковіч паведаміў, што Расія і Беларусь практычна вызначылі формулу разліку кошту на газ да 2015 года. «Ёсць графік руху па роўнадаходных коштах. Гэта — 2015 год. У гэтым плане разгледжаныя дэталі, як рухацца да 2015 года. Мы дамовіліся, практычна вызначылі формулу, як будзе вырашацца пытанне разлікаў», — сказаў беларускі прэм'ер.

Таксама была дасягнутая дамоўленасць, што базавая дамова з Расіяй па будаўніцтве беларускай АЭС будзе падпісана ў першым квартале 2011 года. Па словах Мясніковіча, «з расійскім бокам у гэтым пытанні знойдзена поўнае паразуменне». Пуцін адзначыў, што каля 40% у рэалізацыі праекту па будаўніцтве АЭС можа быць выканана беларускім бокам самастойна. Паводле паведамленняў СМІ, Пуцін пацвердзіў гатоўнасць Расіі крэдытаваць праект.

Да ўсяго расійскі прэм'ер заявіў, што Беларусь атрымае ад Расіі субсідыі ў аб'ёме 4,124 мільярда долараў за кошт бязмытнай пастаўкі нафты. Хаця і кошт на нафту Беларусь атрымала больш высокі, чым планавалася.

Як бачым, у перыяд няміласці Захаду да Беларусі Расія ўзяла курс на падтрымку нязменнай беларускай палітычнай сістэмы. Аднак не на безагаворачных умовах, тым больш і расстаноўка сілаў на палітычным полі спрыяе правядзенню палітыкі Расіі, а прасторы для манеўраў «паміж Захадам і Усходам» у Аляксандра Лукашэнкі цяпер фактычна няма.

Масква не надта старанна грае ролю добрага суседа — рэгулярна ў СМІ працягваюць з'яўляюцца крытычныя матэрыялы на тэму выбараў і паслявыбарных падзей. Так, у аўтарскай праграме Яўгена Рывенкі на РТР быў паказаны даволі крытычны сюжэт з нагоды інаўгурацыі Лукашэнкі. А расійская газета «Ведамасці» апублікавала інфармацыю, што ЦВК Расіі засакрэціў уражанні расійскіх назіральнікаў ад беларускіх выбараў. «Уражанні гэтыя негатыўныя, але Масква вырашыла прызнаць вынікі галасавання», — піша газета.

Такім чынам, можна чакаць, што ў патрэбны момант Расія выцягне ў якасці аргументу негатыўную справаздачу. Але пакуль псаваць ушчэнт адносіны з Беларуссю не мае сэнсу, бо яна знаходзіцца ва ўмовах, калі не пагаджацца з прапановамі нешматлікіх саюзнікаў амаль немагчыма.

ЗВАРОТ

# АД ІМЯ ЛЮДСКАСЦІ

**Дачка арыштаванага кандыдата ў прэзідэнты Мікалая Статкевіча, якая знаходзіцца ў Германіі, стала там ініцыятарам збору подпісаў пад лістом да Лукашэнкі з заклікам да вызвалення ўсіх арыштаваных па палітычных прычынах.**

Толькі за некалькі гадзін пасля старту ініцыятывы было сабрана больш за 2 тысячы подпісаў. Падпісацца любы жадаючы жыхар Германіі можа на сайце www.lass-sie-frei.de

«Гэты зварот ад імя волі, дэмакратыі і правоў чалавека, якія з'яўляюцца універсальнымі і непадзельнымі. Гэты зварот ад імя людскасці, — гаворыцца ў адкрытым лісце, які адрасаваны Аляксандру Лукашэнку. — Вызваліце зняволеных!»

Сярод тых, хто ўжо паставіў свой подпіс пад лістом, — лідэр Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі Зігмар Габрыэль, лідэры Партыі Зялёных Клаўдзія Рот і Чэм Оздэмір, кіраўнік ведамства канцлера Германіі Рональд Пофала, Упаўнаважаны па правах чалавека Германіі Маркус Лёнінг, акцёры Ханэс Янніке і Джудзіт Докер, мадэратар Мо Асуманг, міністр-прэзідэнт Брандэнбурга Маціас Платцэк, лідар фракцыі СПД у Бундэстагу Франк-Вальтар Штайнмаер, лідар Маладых Хрысціянскіх дэмакратаў Філіп Місфельдэр.

Тыя, хто падпісаўся пад заклікам, разглядаюць арышт як «сур'ёзнае парушэнне асноўных правоў чалавека» і патрабуюць справядлівага судовага разгляду. Яны таксама выказваюць сваю занепакоенасць станам здароўя зняволеных. «Лекары, адвакаты і сем'і зняволеных павінны, нарэшце, атрымаць магчымасць наведвання палітычных зняволеных», — пішуць яны Лукашэнку.

ВІЗІТ

# З ПАСЛАННЕМ АД ХІЛАРЫ КЛІНТАН

Аляксей КАРОЛЬ

**Падзеі 19 снежня і пасля іх не адпавядаюць тым абавязальніцтвам, якія брала на сябе Беларусь. Гэтыя падзеі абурылі цывілізаваны сусвет і патрабуюць адказу.**

Так ахарактарызаваў на сваёй прэсавай канферэнцыі 24 сакавіка стаўленне да сітуацыі ў Беларусі з боку Амерыкі намеснік памочніка дзяржсакратара ЗША Томас Меліа.

Мэта яго візіту, з якім ён прыехаў па даручэнні дзяржсакратара Хілары Клінтан, — перадаць беларускаму ўраду пасланне, сэнс якога вельмі просты: «Мы працягнулі руку дружбы і прапанавалі пашырыць наша двухбаковае супрацоўніцтва. І, як мы казалі ўжо шмат разоў, пашырэнне нашых дачыненняў залежыць ад сітуацыі з правамі чалавека і ад паляпшэння дэмакратычных і палітычных працэсаў у Беларусі».

Другая мэта яго візіту — сустрэцца з сем'ямі арыштаваных, з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці і палітычных арганізацый, пачуць незалежныя меркаванні.

Умовы ўтрымання арыштаваных, іх ізаляцыя ад стасункаў з адвакатамі і з роднымі, падкрэсліў Томас Меліа, выклікаюць абурэнне.

Брусэль і Вашынгтон, паведаміў прадстаўнік Хілары Клінтан, праводзяць пастаянныя кансультацыі наконт магчымай рэакцыі, да санкцый уключна, адносна беларускага рэжыму. Менавіта адносна рэжыму — чыноўнікаў, якія датычныя да рэпрэсій, да парушэнняў правоў чалавека, а таксама да дзяржаўных прадпрыемстваў.

Пазіцыя ЗША даведзена да беларускіх уладаў, у тым ліку і падчас яго сустрэчы ў беларускім МЗС на ўзроўні аддзелаў. Міністр і намеснікі міністра, сказаў Томас Меліа, з ім не сустрэліся, магчыма, па прычыне сваёй занятасці.

Такім чынам, выбар зараз выключна ў руках беларускага ўрада. І адзіны спосаб пазбегнуць кропкавых санкцый — змяніць свае паводзіны. Найперш і тэрмінова, адзначыў ён, «вызваліць усіх, хто знаходзіцца ў турмах пасля падзеяў 19 снежня. Зняць усе абвінавачванні з іх і з тых, хто не знаходзіцца ў зняволенні».

На пытанне пра верагоднасць паступовага, па прыступках, узмацнення санкцый, Томас Меліа адказаў, што праблема санкцый — якія, калі і як — менавіта зараз і абмяркоўваецца. Гэтыя некалькі дзён і ёсць у Лукашэнкі. Стратэгію ж Лукашэнкі, заўважыў ён, адказваючы на другое пытанне — аб палітыцы лавіравання Лукашэнкі паміж Захадам і Усходам, — іншы раз цяжка зразумець. Лавіруе, будуе масты, сёння іншае, чым было ўчора. «Мы працягнулі руку. Думаем, для Беларусі карысна мець з ЗША добрыя адносіны».

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# МІНІСТРУ НЕ СОРАМНА

Вольга ХВОІН

**Матэрыялы крымінальнай справы актыўных удзельнікаў масавых беспарадкаў 19 снежня будуць накіраваныя ў суд у першыя дні лютага. Пра гэта журналістам паведаміў міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў.**



Прэс-канферэнцыя першыя сорак хвілін ішла ў пратакольна-спакойнай манеры. Куляшоў зачытваў паведамленне аб выніках працы органаў МУС за мінулы год. Але, калі пачаліся пытанні, міністр з цяжкасцю трымаў сябе ў руках.

На пытанне, чаму супрацоўнікі міліцыі не ачапілі Дом ураду звонку, а сядзелі ўнутры яго і чакалі, калі градус падзей уздымацца вышэй, Куляшоў запэўніў, што ўсё рабілася для таго, каб потым «не абвінавацілі ў абмежаванні свабоднага волевыяўлення грамадзян». «Вы сабраліся на Кастрычніцкай плошчы, там былі супрацоўнікі міліцыі? Не! Вы зможаце ў Берліне правесці падобныя акцыі каля Бундэстага? У нас была адна мэта, прараўляючы высокае валоданне сабой, не справакаваць натоўп на супрацьстаянне. Я не мог дапусціць таго, каб полымя вогнішча, якое запалілі кандыдаты ў прэзідэнты, так званыя рэвалюцыянеры, парушыла парадак і стабільнасць», — сказаў міністр МУС.

Калі ў яго спыталіся, ці не адчувае ён, як мужчына, сораму за свае дзеянні, за збіццё дзяўчат, жанчын, ці не мае намеру зняць пагоны, Анатоль Куляшоў заявіў: «Я ганаруся сваёй прафесіяй. Ганаруся, што стаю на абароне законнасці. У мяне няма права не выконваць закон. 19 снежня я захаваў мір, спакой і стабільнасць. Мне не сорамна. Калі б пачалася другая хваля, то была б бойня».

Анатоль Куляшоў запэўніў, што «міліцыя дзейнічала далікатна і прафесійна», а «прафілактычная дэманстрацыя сілы» не мела выніку. «Мы чулі ў радыёперахопах, што былі заклікі ўзбройвацца цаглінамі і камянямі. У выніку былі затрыманыя найбольш актыўныя, якія ад пачатку ішлі на парушэнне закону», — заявіў міністр.

На пытанне фатографа, чаму ў яго забралі флэш-карту са здымкамі, Куляшоў сказаў, што, відаць, яго пасведчанне выклікала падазрэнні, а потым дадаў: «А ці было нармальна, калі майго супрацоўніка з дапамогай фота- і відэакамер пачалі збіваць журналісты?» Заля, поўная работнікаў камер і дыктафонаў, выбухнула ў адказ смехам. Міністр таксама запэўніў, што напад на Някляева і журналістаў здзейснілі не міліцыянты, а калі б там былі нейкія факты, што да гэтага датычная міліцыя, то журналісты б гэта зафіксавалі. Аргументы, што ўсіх, у тым ліку і журналістаў, адразу ж паклалі «мордай у снег», эфекту не мелі.

Куляшоў паведаміў, што на пачатку лютага справы актыўных удзельнікаў масавых беспарадкаў 19 снежня будуць накіраваныя ў суд. Матэрыялы ў дачыненні да экс-кандыдатаў у прэзідэнты будуць накіраваныя ў суд пазней.

Анатоль Куляшоў заявіў, што справу аб масавых беспарадках 19 снежня перакваліфікоўваць не будуць. Аднак падчас прэс-канферэнцыі ён сам неадназначна гаварыў аб спробе ўзброенага захопу ўлады, ваеннага перавароту.

КАНВЕЕР

# СТУДЭНТАЎ АДЛІЧАЮЦЬ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Адбываюцца допыты, ператрусы і адлічэнні студэнтаў «за плошчу». Пайшоў другі месяц пасля акцыі пратэсту 19 снежня, а працы ў КДБ і міліцыі не стала меней.**

Моладзевую актывістку АГП Таццяну Грыбоўскую адлічылі з мінскага педагагічнага ўніверсітэта. Яна без праблем здала заліковую сесію і два іспыты. Але з двума астатнімі іспытамі ўзніклі праблемы. Паводле словаў дзяўчыны, яна была падрыхтаваная і адказвала ўпэўнена. Але выкладчыкі ёй сказалі, што яна «не з таго пачала жыццё» і што «нармальныя студэнты павінны вучыцца, а не па плошчах хадзіць». Таццяну адлічаюць з фармулёўкай «за непаспяховасць».

Новыя ператрусы адбыліся 26 студзеня ў Гомелі. КДБ правёў вобшукі ў кватэрах старшыні абласной арганізацыі АГП Васіля Палякова, а таксама кіраўніка арганізацыі «Прававая ініцыятыва» Леаніда Судаленкі. Паўторны ператрус камітэтчыкі разам з міліцыяй правялі і ў рэгіянальным офісе АГП. Агулам забралі 6 кампутараў, а таксама ксераксы, прынтары, дыктафоны.

Актывісту АГП Даніле Кляўко адмовіліся паказаць ордэр. Ператрус у яго кватэры 25 студзеня праводзілі жанчына ў міліцэйскай форме і тры мужчыны. Адзін з іх увесь час здымаў на камеру. «Ператрэслі ўсю хату. Знайшлі толькі камізэльку «За Някляева!» і ў канцы запатрабавалі распісацца на нейкай паперы, чаго я не зрабіў», — паведаміў Даніла Кляўко. Ён звярнуўся з заявай у міліцыю. Начальнік райаддзела сказаў, што нікога з супрацоўнікаў міліцыі з ператрусам не пасылаў. І паабяцаў распачаць па гэтым факце крымінальную справу.

У мазырскага праваабаронцы Уладзіміра Ценяпуна 21 студзеня чэкісты забралі кампутар сынастудэнта з дыпломнай працай.

У Мінску ў Яўгена Іванюка, даверанай асобы экс-кандыдата Міхалевіча, чэкісты вынеслі два сістэмныя блокі ад кампутараў.

Ператрусы правялі і ў баранавіцкіх актывістаў Вячаслава Болбата і Таццяны Малашчанкі. Забралі кампутары, дакументы, улёткі.

КДБ правёў таксама допыты актывістаў АГП Паўла Яловіка (паўторна) і Арцёма Агафонава.

А актывіст АГП Усевалад Шашарын пасля другога допыту ў КДБ наконт падзей 19 снежня апынуўся ў ізалятары на Акрэсціна. Суд Маскоўскага раёна Мінска 21 студзеня вынес пастанову аб арышце на 9 сутак. У чым абвінавацілі актывіста, яго калегі ў судзе не высветлілі.

19-гадоваму Руслану Нікіценку ўпраўленне КДБ па Гомельскай вобласці 25 студзеня вынесла папярэджанне. «Калі яшчэ раз буду прымаць удзел у несанкцыянаваных акцыях, то магу быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці», — паведаміў ён.

Сясцёр Юлю і Кацярыну Пашко з Брэста «за плошчу» папярэдзіла абласная пракуратура.

А з берасцейкай Касяй Сяльдзеўскай прафілактычную гутарку даручана правесці ўчастковаму. Дзяўчына была затрымана на плошчы ў Мінску і адсядзела 10 сутак на Акрэсціна. «Міліцыянт сказаў, што яму трэба са мной паразмаўляць наконт таго, што я няправільна жыву», — паведаміла яна Радыё «Свабода».

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ПА КАНСТЫТУЦЫІ, АЛЕ З АГАВОРКАМІ

Вольга ХВОІН

**Старшыня Канстытуцыйнага суда Пётр Міклашэвіч заявіў падчас прэсавай канферэнцыі, што канстытуцыйныя нормы не павінны быць без абмежаванняў.**

Пётр Міклашэвіч, калі гаварыў пра разгон вулічнай акцыі пратэсту 19 снежня 2010 года, заявіў, што свабода сходаў і мітынгаў мусіць абмяжоўвацца бяспекай грамадзян.

«Канстытуцыя дае права грамадскім аб'яднанням, грамадзянам выказваць сваё меркаванне публічна. Але правядзенне масавых мерапрыемстваў звязана з бяспекай іх удзельнікаў і іншых грамадзян. Таму, як і ў іншых краінах, у нас заканадаўча рэгламентуецца іх правядзенне», — сказаў Міклашэвіч, і тым самым прызнаў, што Беларусь жыве не паводле галоўнага закона дзяржавы — Канстытуцыі, — а паводле падзаконных актаў, інструкцый міністэрстваў і ведамстваў і г. д.

«Літаральна тлумачыць, што ёсць канстытуцыйная норма, і яна павінна выконвацца без абмежаванняў, нельга. Што тычыцца магчымасці абмежаванняў — яны дапушчальныя на заканадаўчым узроўні», — заявіў старшыня Канстытуцыйнага суда.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ХТО ВІНАВАТЫ Ў САНКЦЫЯХ?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Хто вінаваты ў санкцыях супраць Беларусі? Хто падставіў Аляксандра Лукашэнку? Хто даў каманду на разгон дэманстрацыі 19 снежня ў Мінску? Хто сапсаваў адносіны з Еўропай? Нечакана мы атрымалі на гэтыя пытанні адказы.**



Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па некаторых унутрыпалітычных пытаннях заявіў, што многія цяпер спрабуюць абвінаваціць КДБ, МУС і ўвесь сілавы блок краіны ў тым, што яны нібыта дэзынфармавалі і ашукалі прэзідэнта. «Я папрашу ў гэтай сувязі ўсім супакоіцца і зразумець адну рэч: першым, хто абараняе суверэнітэт і незалежнасць краіны і тую сістэму, якая функцыянуе, з'яўляецца прэзідэнт. Ніякіх дзеянняў праваахоўныя органы не рабілі, не робяць і не будуць рабіць па навяздзенні парадку ў краіне без санкцыі прэзідэнта», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Між тым, ён прапанаваў ураду падрыхтаваць меры ў адказ у выпадку ўвядзення супраць Беларусі нейкіх санкцый. «У выпадку, калі хтосьці паспрабуе ўвесці супраць краіны эканамічныя або іншыя санкцыі, мы павінны неадкладна адрэагаваць, падрыхтаваць меры ў адказ, аж да самых жорсткіх, — цытуе Лукашэнку дзяржаўнае агенцтва БелТА. — Ні пад каго прагінацца мы не маем намеру, і нахіляць нас нікому не дазволена. І тысячу гэта павінна абсалютна ўсіх, хто паспрабуе ціснуць і блакаваць краіну, хай гэта будзе асобная група краін або нават Еўрасаюз у цэлым».

Лукашэнка заявіў, што чакае ад Міністэрства замежных спраў «канкрэтных прапаноў па супрацьдзеянні антыбеларускай кампаніі за мяжой». «Нам неабходна выпрацаваць комплекс мер, якія не дазволяць зрабіць нашу краіну пешкай у чужой гульні і нанесці ўдар па нашай эканоміцы, бяспецы і суверэнітэце», — падкрэсліў ён.

Фінская прэса таксама выдала сенсацыю. Па іх звестках, буйныя фінскія інвестары адмовіліся ад запланаванай раней паездкі ў Беларусь. І гэта яшчэ да канчатковага ўвядзення санкцый.

Міністр унутраных справаў Анатоль Куляшоў 26 студзеня ўпершыню з'явіўся перад журналістамі ад моманту выбараў. І зрабіў сваё прызнанне. Аказваецца, 19 снежня Куляшоў захаваў мір, спакой і стабільнасць. «Мне не соромна. Калі б пачалася другая хваля, то была б бойня», — сказаў Куляшоў. Карэспандэнт «Нашай Нівы» запытаўся, ці сам Куляшоў аддаваў загад на разгон Плошчы, ці яно прымалася на больш высокім узроўні. Міністр адказаў, што ён.

Хто хлусіць: Лукашэнка альбо Куляшоў? Ці міністр унутраных спраў вырашыў, што яму ў Еўропе анічога не свеціць, і паспрабаваў узяць віну на сябе, на карысць свайго шэфа?

А Еўропа працягвае «бамбіць» афіцыйны Мінск заявамі і прапановамі. Група дэпутатаў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы заклікае ўсіх сябраў Савета Еўропы запатрабаваць ад беларускіх улад правядзення новых выбараў прэзідэнта. З такой заявай выступіў 21 дэпутат ПАСЕ.

Тэкст дакумента размешчаны на сайце ПАСЕ. Падпісанты асуджаюць фальсіфікацыю выбараў, арышты пасля іх і ўсе іншыя «прыкметы недастатковай павагі правоў чалавека беларускімі ўладамі». Дэпутаты ПАСЕ заклікаюць усіх сябраў Савета Еўропы асудзіць гвалт у Беларусі, не выкарыстоўваць спіс з 12 умоў, прыняты ЕС у лістападзе 2006 года, на базе якіх Еўракамісія будуе свае адносіны з Беларуссю. Асноўнай умовай для спынення санкцый павінна стаць правядзенне новых выбараў у Беларусі, падкрэсліваецца ў заяве.

У аўторак, 25 студзеня, урад Латвіі на закрытай частцы пасяджэння ў прынцыпе падтрымаў забарону на ўезд для беларускіх службовых асобаў, пры гэтым у сферы эканамічных санкцый Латвія заклікае ацэньваць кожны праект супрацоўніцтва асобна. Прадстаўнік МЗС Ілзэ Юхансоне паведаміла, што ўрад зацвердзіў пазіцыю Латвіі, якую краіна займе на нарадзе міністраў замежных справаў ЕС 31 студзеня, дзе яе будзе прадстаўляць міністр замежных справаў Гіртс Валдзіс Крыстоўскіс.

Адным з галоўных пытанняў на нарадзе будзе ўвядзенне санкцый у дачыненні да Беларусі. Да нарады рыхтуецца рашэнне аб аднаўленні забароны на ўезд для беларускіх службовых асобаў, у тым ліку для прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, супрацоўнікаў міліцыі і журналістаў. Гаворка ідзе пра спіс прыкладна са 160 чалавек, хоць паміж краінамі ЕС яшчэ працягваюцца дыскусіі пра тых, хто будзе ў яго ўключаны.

Карацей, да часу «ікс» беларускіх уладаў засталося зусім няшмат. І думаць, што мы напужаем Еўропу нейкімі «зваротнымі» санкцыямі — глупства. Ну чым мы можам іх прыцісну ць? Стварыць свой «спіс неўяздных». Дык яны і самі сюды не вельмі імкнуцца…

Адзінае, па чым Беларусь ускочыла ў апошні вагон цягніка, — спорт. 26 студзеня ў Мінску падпісаная дамова паміж Дырэкцыяй па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі 2014 года ў Мінску і швейцарскай кампаніяй «Інфронт». Пра гэта паведамілі ў Федэрацыі хакея Беларусі. Швейцарская кампанія «Інфронт» з'яўляецца адным з сусветных лідараў у галіне спартовага маркетынгу. Яна была партнёрам Міжнароднай федэрацыі хакея падчас чэмпіянатаў свету 2009 і 2010 гадоў. Дагэтуль было вядома, што кампанія возьме ўдзел у арганізацыі трох наступных сусветных першынстваў па хакеі. Цяпер яна далучыцца і да падрыхтоўкі мінскага чэмпіянату.

Аднак скептыкі заўважаюць, што гэта дамова — толькі дамова пра намеры. І няясна, што будзе далей.

> Буйныя фінскія інвестары адмовіліся ад запланаванай раней паездкі ў Беларусь. І гэта яшчэ да канчатковага ўвядзення санкцы

Як МЗС Беларусі будзе выконваць гэтыя патрабаванні — невядома. Вядома толькі, што нашых чыноўнікаў ужо за мяжу не пускаюць. Прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных у эфіры тэлеканала АНТ заявіў, што ў Берлін не пусцілі намесніцу міністра сельскай гаспадаркі Надзею Каткавец. Яна мусіла прадстаўляць краіну на сельскагаспадарчай выставе «Зялёны тыдзень–2011». Аднак у апошні момант запрашэнне беларускай чыноўніцы скасавалі.

Савіных лічыць гэта абсурдным і звязвае з увядзеннем візавых санкцый супраць беларускага кіраўніцтва.

Сапраўды, Еўрапарламент прызнаваць вынікаў выбараў і запатрабаваць новых выбараў.

Аўтары заявы таксама заклікаюць перагледзець двухбаковыя адносіны з афіцыйным Мінскам. Яны прапануюць вызначыць спіс беларускіх чыноўнікаў, адказных за правядзенне выбараў і парушэнне правоў чалавека, якім будзе забаронены ўезд на тэрыторыю краін — сябраў Савета Еўропы. Парламентарыі заклікаюць устанавіць «суровыя» эканамічныя санкцыі супраць беларускіх улад, якія павінны дзейнічаць, пакуль у краіне не пачнуць выконвацца правы чалавека. Пры гэтым прапаноўваецца

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ЯРАСЛАЎ РАМАНЧУК

Экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Яраслаў Раманчук апублікаваў у сваім блогу ўласны погляд на акцыю апазіцыі 19 снежня ў Мінску. Ён мяркуе, што за падзеі на плошчы Незалежнасці адказныя яго былыя супернікі па прэзідэнцкай гонцы — Андрэй Саннікаў і Мікалай Статкевіч. З падобнай заявай Раманчук выступіў на другі дзень пасля выбараў, што выклікала абурэнне ў шэрагах апазіцыі. Цяпер Яраслаў Раманчук піша, што незалежна ад таго, хто рыхтаваў акцыю 19 снежня, людзі пайшлі да Дома ўрада толькі пасля таго, як экс-кандыдаты Андрэй Саннікаў і Мікалай Статкевіч прынялі рашэнне «ісці» на плошчу Незалежнасці. Разам з тым Раманчук зазначае, што прадстаўнікі перадвыбарных штабоў іншых кандыдатаў на плошчы не высоўвалі ніякіх «сцэнараў» развіцця акцыі.

«Я няcу частку сваёй адказнасці за тое, што здарылася ў Мінску ўвечары і ўначы 19 снежня. Я шкадую, што не спыніў людзей на Кастрычніцкай плошчы. Мне было б варта самому да гэтага дня пацікавіцца, што рыхтуюць іншыя кандыдаты, да чаго рыхтуюцца іншыя сілы. Мне трэба было б быць больш красамоўным і ўпэўніць людзей не паддавацца на правакацыі і не быць іх часткай. Плошча — гэта знак волі, месца выказвання грамадзянскай пазіцыі. Яна мусіць быць мірнай», — заявіў Яраслаў Раманчук.

Па меркаванні экс-кандыдата, найбольшыя страты ад беспарадкаў у Мінску ў дзень выбараў панеслі «тыя дэмакратычныя лідары, палітычныя партыі і арганізацыі, якія праводзілі канструктыўную кампанію, накіраваную на пашырэнне ліку прыхільнікаў перамен». Пасля гэтых падзей, па меркаванні Раманчука, у бліжэйшыя гады ў Беларусі ёсць некалькі шляхоў развіцця: поўная самаізаляцыя, кіраваная дэмакратыя і далучэнне да Расіі.

### АНДРЭЙ КУРЭЙЧЫК




Драматург Андрэй Курэйчык перадаў міністру культуры Беларусі Паўлу Латушку сцэнарый кінапраекта «Скарына». Сцэнарый уяўляе мастацкае даследаванне творчага і жыццёвага шляху выбітнага дзеяча беларускай культуры XVI стагоддзя. «Я цярпець не магу «салодзенькія», «ура-патрыятычныя» фільмы пра вядомых людзей, дзе яны свяцейшыя за анёлаў, — цытуе Курэйчыка яго прэс-служба. — У мяне Скарына не абстрактны асветнік, а чалавек, якога раздзіраюць супярэчнасці. Ён можа і вылаяцца, і зрабіць памылкі. Кахае жанчын. Шукае вялікіх грошай. Ён чалавек ва ўсіх яго прыгожых і непрыгожых учынках. Але чалавек з прынцыпамі і глыбокай любоўю да сваёй радзімы. Гэта — Марк Цукенберг (заснавальнік Facebook) або Стыў Джобс (кіраўнік «Apple») свайго часу. Чалавек, які спрабуе ўкараніць ноў-хаў у краіне з сярэднявечнай логікай. Вядома, гэта выклікае канфлікт з грамадствам. І Скарына вымушаны эміграваць і памерці на чужыне — у Празе, працуючы прыдворным садоўнікам».

На думку аўтара, галоўным пасылам яго сцэнарыя з'яўляецца «заклік да грамадства і дзяржавы берагчы сваіх мастакоў і вучоных, нават калі іх творчасць або грамадзянская пазіцыя не заўсёды зразумелыя».

У якасці асноўных аб'ектаў для здымак Курэйчык бачыць адрэстаўраваныя Мірскі і Нясвіжскі замкі. Галоўныя ролі, на яго думку, павінны сыграць лепшыя беларускія акцёры. Паводле слоў драматурга, гэты праект можа стаць «яркім, амбіцыйным і самым нацыянальным за ўсе гады незалежнасці Беларусі». «Гэта першы ў маім жыцці сцэнарый, які я пісаў не на замову, а па загадзе душы», — сказаў драматург.



### ДАР'Я ДОМРАЧАВА

Беларуская біятланістка Дар'я Домрачава заняла трэцяе месца ў гонцы з масавым стартам на шостым этапе Кубка свету ў італьянскім Антхольцы.

Дыстанцыю 12,5 кіламетра спартсменка пераадолела за 34 хвіліны 2,1 секунды без промахаў на чатырох агнявых рубяжах. Домрачава на 5,8 секунды адстала ад пераможцы, нарвежкі Торы Бергер, і на 5,2 секунды — ад францужанкі Мары-Лор Брунэ.

У цяперашнім сезоне біятланістка з Беларусі чацвёрты раз увайшла ў тройку найлепшых. Яна займала другое месца ў спрынце і трэцяе — у гонцы праследу на другім этапе ў аўстрыйскім Хохфільцэне (10 і 12 снежня), а таксама трэцяе месца ў спрынце на першым этапе ў шведскім Эстэрсундзе (3 снежня).

У агульным заліку Кубка свету Домрачава займае 11-е месца (405 балаў). Залік узначальваюць фінка Кайса Мякарайнен (560 балаў), шведка Хелена Экхальм (546) і немка Андрэа Хенкель (523).

РАЗВАЖАННІ

# САНКЦЫІ Ў НЕПАСЛЯДОЎНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЕ

Вольга ХВОІН

**Еўрапейскі парламент пасля поствыбарчых падзей у Беларусі прыняў цвёрдую рэзалюцыю. Дэпутаты заклікаюць Раду ЕС на пасяджэнні 31 студзеня ўвесці забарону на выдачу віз для шэрагу беларускіх службоўцаў і замарозіць іх рахункі ў краінах Еўрасаюза.**



## ...І нахіляць нас нікому не дазволена

У дакуменце падкрэсліваецца, што санкцыі павінны дзейнічаць да таго часу, пакуль беларуская ўлады не вызваляць усіх палітычных зняволеных і затрыманых падчас акцый пратэсту, а таксама не здымуць з іх абвінавачванні. Прапануецца замарозіць любую фінансавую дапамогу, якая прадстаўляецца праз Міжнародны валютны фонд, Еўрапейскі інвестыцыйны банк і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцці. Адначасова ЕС мусіць спрасціць працэдуру атрымання віз для беларускіх грамадзян, павялічыць падтрымку незалежных СМІ і грамадзянскай супольнасці.

Таксама Рада Еўрасаюза, магчыма, разгледзіць варыянт прыпынення ўдзелу Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства» на саміце ў Будапешце, калі да гэтага «не будзе прымальнага тлумачэння і значнага паляпшэння сітуацыі ў Беларусі. Пры гэтым прыпыненне не распаўсюджваецца на няўрадавыя арганізацыі і грамадзянскую супольнасць».

Самае ідэалістычнае патрабаванне Еўрапарламенту — правесці новыя выбары прэзідэнта Беларусі ў адпаведнасці са свабоднымі і дэмакратычнымі нормамі і стандартамі АБСЕ.

Аляксандр Лукашэнка на нарадзе 20 студзеня даручыў ураду падрыхтаваць «наш адказ Чэмберлену». «Ні пад каго прагінацца мы не маем намеру, і нахіляць нас нікому не дазволена. І тычыцца гэта павінна абсалютна ўсіх, хто паспрабуе ціснуць і блакаваць краіну, хай гэьа будзе асобная група краін або нават Еўрасаюз у цэлым» заявіў нязменны кіраўнік Беларусі..

## Расія санкцыі адыграла

Кіраўнік аналітычнага цэнтра «Стратэгія», эканаміст Леанід Заіка наконт наступстваў магчымых эканамічных санкцыяў Еўрасаюза супраць Беларусі выказваецца крытычна. «Усе жорсткія санкцыі адыграныя расіянамі. Напрыклад, не будзе садзейнічання ў атрыманні крэдытаў. Але крэдытаў мы набралі, і новыя нам не трэба. Дарэчы, кожная беларуская сям'я — двое дарослых, двое дзяцей — вінная замежным крэдыторам каля дзесяці тысяч долараў. Зайдзіце ў кватэру, і не заўжды там будзе маёмасці на такую суму. Крэдыты браў Сідорскі. Сідорскага цяпер няма, а пазыкі засталіся. Таму дзякуй еўрапарламенту, калі яны будуць супраць новых крэдытаў», — гаворыць эксперт.

Напрыканцы мінулага года Дзяржаўны дэпартамент і міністэрства фінансаў ЗША ў чарговы раз працягнулі дзеянне мараторыя на прымяненне санкцый у дачыненні да двух прадпрыемстваў беларускага канцэрну «Белнафтахім» — ААТ «Полацк-Шкловалакно» і ААТ «Лакафарба». Усе астатнія санкцыі ЗША, уведзеныя ў чэрвені 2006 года ў дачыненні да канцэрна «Белнафтахім», застаюцца ў сіле. Упершыню паўгадовы мараторый на прымяненне санкцый у дачыненні да беларускага нафтахімічнага канцэрну ўлады ЗША ўвялі ў верасні 2008 года, і цяпер працягваюць яго дзеянне ўжо ў пяты раз. Застаюцца ў сіле і санкцыі ў дачыненні да 16 беларускіх чыноўнікаў, якім улады ЗША забараняюць уязджаць у краіну.

ЗША выглядаюць найбольш паслядоўнымі ў сваёй палітыцы «ігнору» Беларусі. Спрыяе гэтаму і тое, што наша краіна не з'яўляецца стратэгічным партнёрам Штатаў.

Цяпер аб спыненні супрацоўніцтва ў нафтавай сферы загаварылі і ў Еўропе. «Еўропа ніколі не спыняла набываць нафтапрадукты ў Беларусі. Яны гэта тлумачаць тым, што такія крокі будуць ударам па беларускаму народу, і з задавальненнем набываюць тут нафтапрадукты. У лепшыя гады мы сапраўды прадавалі ў ЕС каля 40 працэнтаў ад нашага экспарту, што складае звыш 12 мільярдаў долараў. Можна было зарабляць на продажы нафтапрадуктаў праз Галандыю, Брытанію. У 2009-м мы Германіі прадалі чыстай нафты на паўмільярда долараў. Ад такіх здзелак здольныя адмовіцца толькі ЗША, што і рабілі. Тыя, хто займаецца нафтай і бензінам, не кіруюцца рашэннямі еўрапарламента. Гэта міжнародная алігархія, якая не адмовіцца ад такога спосабу зарабляць грошы. Што тычыцца іншых пазіцый па экспарту — хімічнай прадукцыі, калійных угнаенняў, сыравіны — гэта не надта істотна. Расія цяпер пастаўляе нам нафту ў вялікіх аб'ёмах, Еўропа набывае нафтапрадукты па прывабных коштах. Гэта і ёсць палітыка двайных стандартаў», — прагназуе Леанід Заіка.

«Усе размовы аб санкцыях цяпер — гэта плач Яраслаўны. Не варта было Вестэрвеле і Сікорскаму сюды ездзіць, піць каву з Лукашэнкам. Еўрапейскія палітыкі прайгралі. Беларусь адышла ад Еўропы. Я б параіў санкцыі ў выглядзе ўвядзення абсалютна бязвізавага рэжыму для ўсіх жыхароў Беларусі апроч чыноўнікаў, дзяржаўных служачых. Я агучваў гэтую думку ў розных краінах ЕС, гаварыў, што нашы людзі знаходзяцца ў гаротным стане, не ведаюць, што ёсць іншы свет. Калі будуць магчымасці пабачыць іншы свет, павучыцца, папрацаваць, то Лукашэнка стане папросту не цікавы», — дзеліцца рэцэптамі дэмакратызацыі Беларусі эканаміст.

Палітолаг Андрэй Ляховіч таксама згодны, што прагрconsidered санкцый ЕС не стане прычынай абвалу дзейснай палітычнай сістэмы Беларусі, бо «ўсё ж ніхто не ставіць такой мэты». «Трэба прымусіць выпусціць палітычных зняволеных і зрабіць крокі на шляху палітычнай лібералізацыі. Прагрaма санкцый — гэта не радыкальны спосаб ціску, а хутчэй папярэджанне Лукашэнку. І важна, каб была паслядоўная праграма з замарожваннем экспарту нафтапрадуктаў з Беларусі, выдачай крэдытаў, прыпыненнем палітычных кантактаў, удзелу ў праграме «Усходняе партнёрства», бо ненармальна супрацоўнічаць з краінай, у якой больш за тры дзясяткі палітычных зняволены, — зазначае палітолаг. — Пакуль у Беларусі Лукашэнка, нічога не будзе з таго, што мусіць быць у нармальнай, цывілізаванай краіне. У цяперашнім выглядзе санкцыі не разлічаныя на змену ўлады ў Беларусі, гэта прымус дзейснага рэжыму».

Разам з тым не трэба забываць пра фактар Расіі, якая аказвае падтрымку Лукашэнку, хаця ўжо і не ў ранейшым выглядзе — без умоў, абавязку, ціску. І трэба прызнаць, што пасля беларускіх выбараў расклад на карысць Расіі — Беларусь адрэзаная ад ЕС і вымушаная ў той ці іншай форме прымаць прапановы, умовы суседкі-спонсара. Гэта дазволіць дзейснаму рэжыму Лукашэнкі праіснаваць пэўны час, праўда, на небязвыплатнай аснове.

## Байкот знутры

Пасля выбараў з'явіліся заклікі да санкцыяў унутры самой краіны. Маўляў, не набывайце айчынную прадукцыю, забірайце грошы з дэпазітаў — і рэжым ляснецца. Сацыёлаг, былы міністр працы Аляксандр Сасноў гаворыць, што грунту для такой кампаніі проста няма. «Калі галасаваць супраць дзеючай улады, а гэта больш проста, чым увесці для сябе такія санкцыі, ідзе прыкладна 30–35 працэнтаў грамадзян, то на радыкальныя крокі гатовыя яшчэ менш», — падкрэслівае эксперт. Ён пагаджаецца, што ў беларускім грамадстве ёсць раскол паводле грамадска-палітычных перакананняў, з часам ён проста павялічваецца, і «нават Лукашэнка гэта прызнаў», але пакуль працэс не крытычны.

**Важна, каб была паслядоўная прграма з замарожваннем экспарту нафтапрадуктаў з Беларусі, выдачай крэдытаў, прыпыненнем палітычных кантактаў**



Цікава, што ў студзені кіраўнік Нацыянальнага банка Пётр Пракопавіч падчас справаздачы кіраўніку Беларусі прызнаў, што за 2010 год міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя па методыцы МВФ, скараціліся на 11% да 5 030,7 мільёна долараў ЗША. Прычыну Пракаповіч бачыць у ажыятажным попыце насельніцтва на валюту. «Летась мы прадалі на чыстай аснове насельніцтву 1,5 мільярда долараў. Гэтыя грошы сышлі з золатавалютных рэзерваў, і яны фактычна ляжаць у насельніцтва дома, замест таго, каб працаваць на рэспубліку, на эканоміку, — сказаў Пракопавіч. — Я хацеў бы параіць грамадзянам, якія захоўваюць грошы дома — усё роўна ў беларускіх рублях або ў іншай валюце, — прынесці іх у банк».

Эканаміст Леанід Заіка прапанаваны метад назваў «самаспальваннем». «Калі пачнуць аўральна здымаць грошы з рахункаў беларускіх банкаў, гэта прывядзе да банкаўскага, фінансавага крызісу ў краіне. І прайграюць ад гэтага простыя беларусы. Можна не хадзіць у рэстараны, што знаходзяцца ва ўласнасці беларускіх чыноўнікаў, напрыклад, сталічны рэстаран «Лідо», які ў падпарадкаванні Упраўлення справамі прэзідэнта. А заклікаць да дзеяння на фінансавым полі — дэструктыўная з'ява», — упэўнены Заіка. Ён прапаноўвае альтэрнатыву — галоснасць аб прыбытках, накапленнях чыноўнікаў, што прымусіць задумацца людзей.

«Невыяздных чыноўнікаў можна прыраўняць да невыяздных габрэяў у часы Андропава. Можа, сапраўды адчуюць, што гэта такое. Але гэтыя санкцыі закрануць не так многа людзей. Значна больш цікавы варыянт з замарожваннем рахункаў беларускіх чыноўнікаў. Калі б былі яшчэ агучаныя дадзеныя, чые гэта рахункі і якія там сумы, гэта было б цікава для грамадскасці. Што за чыноўнікі ў нас, і куды глядзіць Аляксандр Рыгоравіч, і як яны паспелі столькі зарабіць? Для беларускай апазіцыі атрымаць такія звесткі, апублікаваць іх, напрыклад, у газеце «Новы час», было б карысна ў межах праграмы «Беларусь — гэта мы», вось і паглядзелі б хто такія «мы», — заклікае Леанід Заіка еўракамісараў паспрыяць асвеце беларусаў на тэму прыбытковасці дзяржаўнага апарату.

ЛЁС



Люцына Бельзацкая, бабуля Даніка Саннікава, і Данік

# ТРОХГАДОВЫ ЗАКЛАДНІК

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Маленькі Данік Саннікаў стаў вядомы ўсяму свету. Еўрапарламент у рэзалюцыі па Беларусі выказаў заклапочанасць лёсам трохгадовага хлопчыка, бацькі якога знаходзяцца за кратамі па палітычных прычынах.**

«Я гэта ўспрыняла як рэакцыю нармальных людзей на ненармальную сітуацыю», — сказала яго бабуля Люцына Бельзацкая.

Акурат у дзень прыняцця рэзалюцыі раённая адміністрацыя выдала ёй дакумент на апякунства ўнука. Як адзначыла Люцына Бельзацкая, гэта было зроблена «імгненна». «Я званіла ў аддзел народнай адукацыі. Яны мне сказалі, што рашэнне будзе прымацца да канца месяца. А назаўтра мне тэлефануюць, што ўжо ўсё, рашэнне прынятае», — паведаміла яна.

Органы апекі «зацікавіліся» Данікам пасля арышту 19 снежня яго бацькоў, журналісткі Ірыны Халіп і кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава. Разам з трыма дзясяткамі іншых палітыкаў і актывістаў іх абвінавацілі ў «масавых беспарадках» — за акцыю пратэсту пасля выбараў. Еўрапейскія палітыкі выказалі «заклапочанасць спробамі ўладаў Беларусі ўзяць пад апеку» трохгадовага сына палітзняволеных.

Як адзначыла Люцына Бельзацкая, выпрабаванне з унукам для яе было самым цяжкім у гэтай сітуацыі: «Хацелі націснуць, напужаць, я не ведаю, што хацелі. Потым вырашылі даць апякунства, каб менш гаварылі на гэту тэму. Менавіта лёс гэтага маленькага дзіцяці ўсхвалявалі людзей вакол. Бо трохгадовае дзіця становіцца закладнікам».

Публікацыі «на гэтую тэму», як кажа бабуля, пастаянна з'яўляюцца ў замежных СМІ. У «Нью-Йорк Таймс» быў вялікі артыкул. Але даведваецца пра іх яна ад іншых. «Я наогул нічога не чытаю, у нас адабралі ўсе камп'ютары, мы ў блакадзе, у вакууме існуем. Беларускае тэлебачанне я, натуральна, не ўключаю».

Люцына Бельзацкая і яе муж перажылі два ператрусы. І першым, і другім разам абшуквалі і іх кватэру, і кватэру дачкі. А іх унук быў сведкам гэтых падзей. Жонка палітзняволенага Зміцера Бандарэнкі, Вольга, згадвае, як паводзіў сябе Данік падчас першага ператрусу: «Сядзеў нерухома, як саляны слупок. Хаця гэта было чатыры з паловай гадзіны, але нават не зварухнуўся». А яшчэ ў кватэру Халіп і Саннікава спрабавалі пранікнуць міліцыянты. «У іх жа ключы былі, напэўна, Ірыны і Андрэя. Яны думалі, што там нікога няма, і маглі ўсё, што заўгодна там зрабіць. Муж адчыніў дзверы. Яны абеглі ўсе пакоі, паадчынялі шафы. Быццам кагосьці шукалі», — распавяла Люцына Бельзацкая.

Яе муж, кінасцэнарыст Уладзімір Халіп, зараз пасля бальніцы. Ён трапіў туды пасля арышту дачкі. Уладзімір Халіп страціў зрок на правае вока, і яго тройчы праапералі. «Вельмі складаная і цяжкая аперацыя, нельга было ў адзін прысест зрабіць. Усё гэта звязана з нервовым стрэсам», — адзначыла жонка.

Да іх часта наведваюцца журналісты. «Калі даеш інтэрв'ю, то стараешся, каб Данік быў хаця б у іншым пакоі», — кажа бабуля. Хлопчыку сказалі, што яго бацькі паехалі далёка. І ў іх сапсаваліся тэлефоны. «Мы ўвесь час яму кажам, што цябе ўсе любяць, і мы, і бацькі. І яны табе прысылаюць падарункі. Мы ад іх імя купляем яму падарункі», — распавяла жанчына.

Калі Ірына і Андрэй сыходзілі на некалькі гадзін ці з'язджалі на два-тры дні, яны заўсёды казалі сыну, калі вернуцца. «А тут раптам наогул сышлі і няма, — гаворыць Люцына Бельзацкая. — Вось нядаўна ён сказаў: «Мне так сумна». А дзядуля пытаецца ў яго: «Чаму табе, Данечка, сумна?» — «Таму што я вельмі сумую без мамы і таты».

Дзіця ўсё роўна адчувае небяспеку. «А калі за мной прыйдзе чужы дзядзя і скажа: «Аддайце мне вашага хлопчыка Даню». Што вы скажыце?» — запытвае ён. «Я кажу: «Данечка, ну хто за табой прыйдзе? Ніхто. Мы ўсіх выганім», — супакойвае яго бабуля.

«Ну добра, мне далі апякунства, — кажа яна. — Што, я магу замяніць бацькоў? Я маму магу замяніць? Ніколі ў жыцці. Дзіця ў такім узросце звязана з маці ніткамі, которыя немагчыма нават ірацыянальна зразумець. Ён адчувае яе на нейкім генным узроўні. Затое ён цяпер увесь час мне кажа: «Бабуля, я цябе так люблю». І тое ж самае дзядулі. «Як я цябе люблю». Ён гэта ж казаў Іры. Вось яму дасылалі запрашэнні на навагоднія прадстаўленні. «З кім ты пойдзеш?» — запытвае яго другая бабуля. Ён кажа: «Я хацеў бы з мамай, але цяпер жа бабуля замест мамы».

Ірыну Халіп адвакат бачыў у апошні раз 30 снежня, калі ёй вынеслі абвінавачанне. З таго часу пра яе нічога не вядома. Як і пра яе мужа Андрэя Саннікава, з якім адвакат бачыўся 29 снежня. «Іх трымаюць у вакууме. Я думаю, спецыяльна гэта ўсё робіцца. І спрабуюць штосьці накапаць», — мяркуе Люцына Бельзацкая.

А 17 студзеня ад Ірыны дайшоў ліст. Большая частка яго — пра Даньку. Чым ён займаецца, якія мульцікі глядзіць, як ён ясі, што яму сказалі пра яе. «Яна задавала такія пытанні, которыя, калі б яна атрымала мае лісты перад гэтым, яна б не запытвала. Вось канкрэтна пра Даньку я ёй пісала, што вы з'ехалі, што вернецеся, каб не хваляваўся. Што мама і тата пра яго памятаюць. Не сумняваюся, што яна не атрымоўвала гэтых лістоў». Не сумняваецца маці Ірыны і ў тым, што і лісты ад дачкі не даходзяць па адрасе.

«Не турбуйцеся, я не ў палоне. Я проста набываю новы досвед», — гэтыя словы з ліста журналісткі сталі ўжо шырокавядомымі.

Люцыну Бельзацкую журналісты запытваюць, як яна ставіцца да сітуацыі, у якой зараз апынулася з-за арышту дачкі. «Я ганаруся сваёй дачкой, — адказвае я. — Хаця я хацела б можа, каб усё было ціха, спакойна, каб яна, як напачатку, займалася тэатрам і кіно, але... Іншы характар. Я дакладна ведаю, што яна сумленная, прыстойная, смелая. Што яна ніколі не пакрывіць душой. Я не ведаю, як на яе ціснуць. Але ў гэтых яе якасцях я перакананая».

## КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# У КАГО? НАВОШТА? КОЛЬКІ?



**Старшыня верхняй палаты Нацыянальнага сходу назваў Беларусь буфернай дзяржавай. Не было б нічога дзіўнага, каб такі вырак зрабілі сучасныя рускія нацыяналісты або бальшавікі ленінска-сталінскіх часоў. У вуснах галоўнага беларускага сенатара ён сведчыць пра яго поўную службовую неадпаведнасць.**

Тэрмін «буферная дзяржава» ўжываецца ў падручніках як паняцце для абазначэння выніку кампрамісу двух-трох ці больш моцных дзяржаў, прэтэнзіі якіх на абсалютнае панаванне на прасторы сутыкнення сваіх дзяржаўных і нацыянальных інтарэсаў смяротна пагражаюць існаванню кожнай з іх. Таму яны па ўзаемнай дамоўленасці ствараюць у аспрэчваемым цэнтры інтарэсаў нейкую псеўдадзяржаву, з правам для кожнага з бакоў заходзіць у яе адміністратыўную прастору настолькі, наколькі гэта дазваляюць інтарэсы палітычных апанентаў.

Пагрозы Беларусі зыходзяць, зразумела, у большасці, ад яе самой. Перш-наперш, ад людзей, якім выпаў шанец ачоліць беларускую дзяржаву. Відавочна, што гэты цяжар ім не па плячах. Пра гэта яскрава сведчыць памкненне захаваць для сябе, можна сказаць, асалоду, якую дае палітычнае панаванне над шматмільённым народам. А сам народ трымаць у лейцах бясконцых абяцанак. Да гэтага часу кіраўніцтва не выказалася дастаткова выразна наконт свайго стаўлення да дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі. Мусіць, яно мяркуе, што такім чынам атрымае неразменны (вечны) рубель у сваю кішэню. У выніку народ, грамадства, беларуская супольнасць марнуюць час і сілы на барацьбу з ветракамі.



Беларусь жа, не толькі грамадзянская супольнасць (увогуле, якая там супольнасць, калі да беларусаў звяртаюцца не інакш, як з удакладненнем — «Гражданин, пройдемте!» Куды? Не інакш, як будаваць грамадзянскую супольнасць), патрабуе карпатлівага лекавання. Які курс будзе — лагодны тэрапеўтычны, або шокавы з ампутацыяй — ужо не прынцыпова.

Тым, што сёння ва ўладзе, магчыма, не хапае разумення сітуацыі. Той жа Лукашэнка, калі рабіць высновы з яго паводзінаў, відаць, лічыць, як схапіў аднаго разу Бога за бараду, так яе і не адпусціць. На самай справе, усе больш сур'ёзна. Як і абсалютная большыня сучасных дзяржаў (не толькі еўрапейскіх), Беларусь узнікла ў выніку крушэння магутных імперый. Але ў такі час, калі ўжо здавалася, што беларускаму народу ніколі не ўдасца набыць сваю дзяржаўнасць. Гэта здарылася не ў выніку відавочнай ваеннай паразы СССР, а ў той час, калі ён, як здавалася, падняўся на вяршыню сваёй моцы. Калі валавыя паказчыкі вытворчасці дасягнулі свайго гістарычнага максімуму. Ад гэтага ўзнікла ілюзія, што ў Беларусі нічога не трэба прынцыпова змяняць. Дастаткова захаваць наяўны патэнцыял, і можна смела крочыць на заваёву агромністай прасторы, на якой усталяваўся першабытны хаос. Пра тое, што гэта разбурэнне можа быць перадумовай будучага будаўніцтва, нават думкі не ўзнікала.

У выніку задача стварэння адпаведных выклікам часу новых рэальнасцяў, з якіх пачыналася незалежнае існаванне амаль усіх нашых суседзяў, у Беларусі нават не разглядалася. Прынамсі, трэба было мэтай паставіць стварэнне эканомікі, якая б адпавядала рэсурсным магчымасцям краіны, а (галоўнае) мела б здольнасць да самаразвіцця. У такім разе яна б атрымала магчымасць доступу да рэсурснай базы іншых краін на ўмовах узаемнай выгады.

Тады б і спадар Рубінаў не змог бы сцвярджаць, што Беларусь — буферная дзяржава па прычыне свайго геапалітычнага становішча. З Усходу штурхаюць, з Захаду піхаюць, а на Поўдні і Поўначыназіраюць, калі надыдзе час дзяліць беларускага кабанчыка. Ці тое, што ад яго застанецца. Тыя, хто зараз кіруе, людзі канкрэтныя ў большай ступені, чым гэта трэба. Галоўная бяда ў іх страшэннай блізасці да народа. Таму ў нас народная гаспадарка ёсць, а эканомікі няма. Бо мы згубілі сваё месца ў былым (агульнасаюзным) падзеле працы, а ў сусветным яго так і не знайшлі. Усё гаспадарчае жыццё круціцца вакол двух НПЗ, з якімі звязваліся ўсе (сёння відавочна) марныя надзеі. А астатняя прамысловасць, якая павінна прыносіць здабыткі коштам рэалізацыі прадукцыі з вялікай дабаўленай вартасцю, не здольная ўтрымоўваць нават саму сябе.

Гэта б можна было паказаць нават на (на самой справе жудасных!) лічбах афіцыйнай статыстыкі. Але ж яна складаецца ў асноўным не для нас, а для тых, хто прымае рашэнні.

А тыя не зважаюць. Раскрыўшы рот, слухаюць галоўнага гаспадарніка, які зноў цвердзіць, што грошы былі, ёсць і будуць.

Цікава, у каго, навошта і колькі?

ПАМЯЦІ КАЛЕГІ

# Віталь Тарас: Я ЖУРНАЛІСТ, БО МНЕ ГЭТА ЦІКАВА

17 студзеня не стала вядомага журналіста і шчырага чалавека Віталя Тараса. У 2009 годзе выйшла мая кніга «Інтэрв'ю, якіх не было», дзе вядомыя журналісты адказвалі на сем аднолькавых для ўсіх пытанняў. Быў сярод іх і Віталь Тарас. Сёння я вырашыў надрукаваць яго адказы яшчэ раз. Каб было больш відавочна, якую АСОБУ мы страцілі…

**Аляксандр ТАМКОВІЧ**



Віталь Тарас

**У 1973 годзе Віталь пачаў друкавацца ў газеце «Знамя юности». Працаваў рэдактарам на Беларускім тэлебачанні, у газетах «Літаратура і Мастацтва» (пад рэдакцыяй А. Вярцінскага), «Культура», расійскай «Общей газете», на Радыё «Свабода», у штотыднёвіку «Наша Ніва». Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў і Саюза беларускіх пісьменнікаў. Лаўрэат прэміі імя Алеся Адамовіча Беларускага ПЭН-цэнтра (у раздзеле «радыёпубліцыстыка») за 1996 год.**

***— Выбар у прафесіі: «чэсны» — «нячэсны». Ці пралічвалі Вы, чым гэты выбар павернецца для Вас?***

— Свой «выбар» я зрабіў задоўга да таго, як прагучалі вядомыя словы пра «чэсных» і «нячэсных» журналістаў. Слова «выбар» я стаўлю таксама ў двукоссе, бо, пачынаючы пісаць, не думаў, што выбіраю нейкі асаблівы шлях для сябе на ўсё жыццё. Я тады яшчэ вучыўся ў школе і пра гэта нават не задумваўся. Тым больш, нічога не пралічваў наперад. І пазней маральны выбар перада мной ніколі не паўставаў, папросту вакол мяне, сярод маіх калег заўсёды пераважалі людзі, якія сумленна рабілі сваю справу. І ў мяне не было выбару — здраджваць прафесіі ці не здраджваць. Мабыць, таму, што не прапаноўвалі.

Калісьці Генры Форд вельмі дасціпна сказаў: «Сумленны журналіст прадаецца толькі адзін раз». Ну дык вось, я «прадаўся» сваёй прафесіі аднойчы і назаўсёды.

***— Ці былі моманты слабасці, шкадавання? Ці з'яўляліся думкі вярнуцца ці далучыцца да шэрагаў «чэсных»?***

— У жыцці кожнага чалавека, я думаю, бываюць моманты слабасці і шкадавання. Але я не сказаў бы, што ў маім асабістым жыцці гэтыя моманты былі звязаныя з журналісцкай дзейнасцю. Як я ўжо зазначыў, адказваючы на папярэдняе пытанне, пачынаў я друкавацца, не асабліва задумваючыся наконт наступстваў. Даволі доўгі час у маладосці плыў, так бы мовіць, паводле плыні. Напрыканцы 70-х гадоў «прыплыў» на Беларускае тэлебачанне — працаваў спачатку ў рэдакцыі навукова-папулярных праграм, потым у рэдакцыі інфармацыі. У сэнсе прапаганды цяперашняе БТ дасць тагачаснаму сто пунктаў наперад. Аднак тады ў Беларусі, як і ва ўсім СССР, не было іншага (недзяржаўнага) тэлебачання. Ніхто пра гэта нават марыць не мог. На дзяржтэлерадыё працавалі і сапраўдныя прафесіяналы — майстры сваёй справы. Але ж ёсць адзін закон, які дзейнічае ўсюды — і ў дзяржаўных СМІ, і ў недзяржаўных, і ўвогуле не толькі ў СМІ. Паводле гэтага закона, у любой установе 30 працэнтаў людзей выконваюць 70 працэнтаў працы, астатнія 70 працэнтаў персаналу займаюцца хто чым — кар'ерай, падхалімствам, інтрыгамі супраць калег, пляткарствам, службовымі раманамі...



Віталь Тарас сярод лаўрэатаў прэміі БАЖ



Віталь Тарас і Зміцер Бартосік

У мяне рэдактарская служба выпрацавала цвярозы погляд на працу на тэлебачанні, якое тады многія ў грамадстве ўспрымалі як нешта надзвычай прэстыжнае, прыцягальнае і таемнае. На маёй памяці Галоўная рэдакцыя інфармацыі ў пачатку 80-х ператварылася ў свайго роду пахавальную каманду — тады адным за адным паміралі генсекі ЦК КПСС (а ў прамежку памёр яшчэ і першы сакратар ЦК КПБ Кісялёў). Шаравым рэдактарам трэба было збіраць пра нябожчыкаў водгукі «плакальшчыкаў» — рабочых, навуковых работнікаў, пісьменнікаў, музыкантаў, ахопленых «пачуццём вялікай страты, якую панёс увесь савецкі народ». Пры гэтым і журналісты, і большасць «плакальшчыкаў» успрымалі сітуацыю досыць цынічна, з іроніяй і самаіроніяй.

А ўвогуле, у сілу індывідуальных рыс характару, я не люблю працаваць у калектыве. Праца ў любой канторы, нават калі гэта офіс самай прэстыжнай рэдакцыі з добрай зарплатай, мне заўсёды давалася цяжка. Хоць і разумею, што журналісцкая праца ў камандзе больш эфектыўная.

***— Стаўленне блізкіх людзей да Вашага выбару?***

— Паколькі я вырас у сям'і журналістаў (маці працавала на тэлебачанні, бацька — у газеце «Звязда», потым у часопісе «Нёман»), дык у мяне яшчэ са школы практычна не ўзнікала пытання, кім быць. Але бацькі былі катэгарычна супраць таго, каб я паступаў на журфак, паколькі добра ведалі цану журналісцкай прафесіі за савецкім часам. Яны мяне адгаворвалі як маглі. І ў выніку я паступіў... на біяфак БДУ. Але ж вельмі хутка высветлілася, што прафесія не мая. Дарэчы, высветлілася таксама, што і на біяфаку, як і на любым іншым факультэце, трэба было вывучаць і здаваць гісторыю КПСС, навуковы камунізм і розную іншую ідэалагічную лухту.

Так што з другога курса біяфака я быў адлічаны, і паступіў ва ўніверсітэт на вячэрняе аддзяленне журфака толькі праз восем гадоў, у 1983-м. Кажучы словамі аднаго савецкага сатырыка, не ведаю, ці шмат атрымала журналістыка, але што біялагічная навука ад гэтага нічога не страціла — гэта дакладна. Ну, а мае бацькі і сябры больш ніколі не ставілі пад сумненне мой выбар, у якой бы рэдакцыі я ні працаваў. Не кажу тут пра жонку і сына, якія заўсёды, нават у самай складанай сітуацыі, мяне маральна падтрымлівалі і падтрымліваюць.

***— Месца і дата народзінаў? Першыя ўспаміны? Кім Вы хацелі стаць у дзяцінстве?***

— Нарадзіўся я 6 мая 1956 года ў Мінску. Але, як ні дзіўна, першыя ўспаміны звязаныя з вёскай. Памятаю, як схапіў на падворку кураня і сутаргава паспрабаваў яго лашчыць (мабыць, таму бацькі вырашылі, што я буду біёлагам). Кураня вырывалася, дарослыя ўсчалі крык, лаяліся на мяне. З дзіцячых «гарадскіх» успамінаў — доўгая чарга за батонамі ў краму і «наш дарагі» Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў у дзвярах урадавага вагона на Мінскім чыгуначным вакзале. Я за ім назіраў, седзячы на плячах майго дзеда Зміцера. (Некаторыя ўспаміны ўвайшлі ў кнігу маіх эсэ «Звыклае зло».)

У дзяцінстве хацеў стаць вандроўнікам. Бачыў сябе з падзорнай трубой у руках — такой, як у Паганэля, на капітанскім мосціку судна, дзе-небудзь у басейне ракі Арынока альбо Лімпапо. Дзякуючы журналісцкай прафесіі, мара шмат у чым спраўдзілася. Давялося паездзіць па роднай Беларусі, а пасля распаду СССР — пабываць у некаторых еўрапейскіх краінах і нават у Афрыцы.

Недзе ў класе пятым спрабаваў напісаць навукова-фантастычную аповесць. Яна пачыналася словамі: "Гелена смажыла касмічныя катлеты». Рогат маіх бацькоў, якім я пачаў быў чытаць свой опус, назаўсёды адбіў ахвоту пісаць фантастыку...

***— Чаму менавіта журналістыка?***

— Заўсёды лічыў і лічу, што самае вялікае шчасце — гэта калі твая прафесія і любімы занятак (хобі) супадаюць. А калі табе за гэта яшчэ часам і плацяць!..

Гэта не значыць, што збіраць інфармацыю ці пісаць заўсёды лёгка і прыемна. Часам гэта суцэльная пакута. Але не пісаць ужо не можаш. І гэта насамрэч ператвараецца ў праблему. З гадамі назапашваецца стомленасць ад прафесіі. Пачынаеш баяцца паўтарыцца, напісаць нешта банальнае, збіцца на трафарэт. Але ніколі не ўзнікала жаданне змяніць прафесію. Калісьці Маякоўскі напісаў у сваёй аўтабіяграфіі: "Я паэт, гэтым і цікавы». Я журналіст, бо мне гэта цікава.

***— Ваш шлях у прафесію?***

На гэтае пытанне я ўжо часткова адказаў вышэй. Магу толькі дадаць, што пасля няўдалай спробы вучыцца на біяфаку пайшоў адразу не ў журналістыку, а грузчыкам у ПМК. Нейкі час быў падсобным рабочым у друкарні, лабарантам у бібліятэцы. Мае знаёмыя жартавалі: робіш сабе аўтабіяграфію на будучыню! Насамрэч, гэтая праца найперш пазбавіла ад некаторых ілюзій і радасных уяўленняў — пра рабочы клас, напрыклад, ці пра спалучэнне фізічнага і духоўнага пачаткаў у чалавеку. Гэтае пазбаўленне ад ілюзій, веданне «што па чым», дапамагло потым і ў прафесіі, і проста ў жыцці. Больш за ўсё на свеце не люблю пафас.

Ну а на вячэрнім журфаку я пазнаёміўся, сярод іншых аднакурснікаў, з Ігарам Герменчуком (светлая яму памяць) і Сяргеем Дубаўцом. І хоць яны потым пераваліся на дзённае аддзяленне, знаёмства з гэтымі асобамі, безумоўна, таксама паўплывала на выбар прафесіі. Пытання, з кім быць і як сябе паводзіць у гэтым жыцці, пасля ніколі не ўзнікала.

***— Кім і дзе працуеце зараз?***

— Апошнія пяць гадоў жыву ў Мінску. Працую дома для розных выданняў, пераважна для «Нашай Нівы». Нядаўна пачаў весці блог на сайце baj.by.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 31 студзеня, панядзелак

**1**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.50** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 00.35** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.05** Здароўе.
**10.35** Культурныя людзі.
**11.05** Меладрама «Зацьменне».
**12.10** Прыгодніцкі фільм «Уяўлянарыум доктара Парнаса» (Вялікабрытанія-Францыя-Канада).
**14.15** Дак. цыкл «Невядомая версія».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.20** Меладрама «Зацьменне».
**18.25** Праграма «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ход у адказ.
**21.00** «Панарама».
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне».
**23.00** Баявік «Захавальнік» (ЗША).
**00.45** Дзень спорту.

**Н**

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адкрыты фармат».
**22.05** «Галасы».
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Барыс Красноў».
**00.25** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу».
**01.15** Начныя навіны.

**СТВ**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрская гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Дачушка мая». Украіна, 2008 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Жыццё гэтага хлопца». ЗША, 1993 г.

**ЛАД**

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**08.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.00** Прыгодніцкі фільм-фэнтэзі «Русічы» (Расія).
**11.40** Пра мастацтва.
**12.10** Школа рамонту.
**13.10** Прэм'ера. Прыгодніцкая меладрама «Зямля святла» (Францыя-Бельгія). 1-я серыя.
**14.10** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.05** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Тэлебарометр.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Кінааповесць «Справа была ў Пянькове» (СССР).
**20.55** Калыханка.
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.15** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.50** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.25** Авертайм.
**23.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.00** Прэм'ера. «Поле цудаў вяртаецца». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Бывай, «Макараў»!».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.25** Серыял «Ускосныя доказы».

**EUROSPORT**

**09.30, 13.15, 23.45** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Чэхіі (Нова Места). Жаночыя спаборніцтвы. Гонка пераследу.
**10.15, 14.45, 00.30** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Чэхіі (Нова Места). Мужчынскія спаборніцтвы. Гонка пераследу.
**11.00** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Фінал.
**12.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. Фінал.
**15.45** Шары. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ланэлі, Вялікабрытанія). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**19.15, 23.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.30** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Фінал.
**20.45** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Кіеў, Украіна).
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вилінген). HS 145.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30, 12.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.45, 12.20** Эксперт.
**08.05, 12.40** ПраСвет.
**08.30, 13.05** Басанож па свеце: «Штодзённае жыццё індзейцаў».
**08.55** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Кірыла Тураўскі».
**09.20, 14.05** Дакументальная гадзіна: «Франка: на варце Захаду», дак. фільм, 2006 г., Іспанія.
**10.20, 15.05, 21.55** Фільматэка майстроў: «Мядзведзік», маст. фільм, 2007 г., Чэхія.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**13.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**13.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Люблінская унія».
**16.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Час гонару», серыял: 14 серыя.
**18.20** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2009 г., Польшча-Беларусь.
**18.50** Госць «Белсату».
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.25** «Беларускі лес», дак. фільм, 2008 г., Беларусь .
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя.
**23.35** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

## 1 лютага, аўторак

**1**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 22.50** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.35** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**12.10** Меладрама « Рабіны гронкі пунсовыя» (Украіна). 1-я серыя.
**14.05** Ход у адказ.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Жураў» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладрама «Зацьменне».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне».
**23.00** Прыгодніцкі трылер «Узлом» (ЗША).
**00.40** Дзень спорту.

**Н**

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Доктар Тырса». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Капітан Гардзееў». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Барыс Ельцын. Першы».
**00.30** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Заключная серыя.
**01.20** Начныя навіны.

**СТВ**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Дачушка мая». Украіна, 2008 г.
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Абанент часова недаступны». Серыял.
**23.55** «Інструктар». Серыял.

**ЛАД**

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.30** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.30** Кінааповесць «Справа была ў Пянькове» (СССР).
**12.20** Авертайм.
**12.45** «Запал па культуры».
**13.30** Прыгодніцкая меладрама «Зямля святла» (Францыя- Бельгія). 2-я серыя.
**14.25** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.25** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Дэтэктыў «Залатая міна» (СССР). 1-я серыя.
**20.25** «Калыханка».
**20.40** Тэлебарометр.
**20.45** Беларуская часіна.
**21.45** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Арсенал - Эвертан.
**00.15** «Спорт-кадр».
**00.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Вожык супраць свастыкі». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». І
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.45** «Агністы рэйс. Як гэта было». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Бывай, «Макараў»!».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.15** Сёння.
**23.40** Серыял «Ускосныя доказы».

**EUROSPORT**

**09.30, 13.00, 20.00, 02.15** Вось дык так!!!
**09.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вилінген). HS 145.
**11.30** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Чэхіі (Нова Места). Жаночыя спаборніцтвы. Гонка пераследу.
**12.15** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Чэхіі (Нова Места). Мужчынскія спаборніцтвы. Гонка пераследу.
**14.00** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Фінал.
**15.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**15.30** Шары. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ланэлі, Вялікабрытанія). Дзень 3-і.
**16.30** Шары. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ланэлі, Вялікабрытанія). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). Кваліфікацыя. HS 140. Прамая трансляцыя.
**22.00** Бокс. WBC Official Eliminator. ЗША.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**00.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). Кваліфікацыя. HS 140.
**01.15** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. Фінал.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** Еўропа сёння.
**08.00, 12.30** Прыватная калекцыя.
**08.30, 13.00** Госць «Белсату».
**08.50, 13.20** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Беларусь.
**09.20, 13.50** «Беларускі лес», дак. фільм, Беларусь.
**09.45** «Мой родны горад», серыял.
**10.10** «Час гонару», серыял: 14 серыя.
**11.05** «Гняздо», серыял: 2 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**14.15** «Мой родны горад», серыял.
**14.40** «Час гонару», серыял: 14 серыя.
**15.35** «Гняздо», серыял: 2 серыя.
**16.25** Невядомая Беларусь: «Кіпіць Нямiга», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 22 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** ПраСвет.
**19.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Люблінская унія».
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.20** Невядомая Беларусь: «Катынь. Праз 70 гадоў», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Асабісты капітал.
**21.40** Рэпартэр.
**22.05** «Доктар Марцін», серыял.
**22.50** Аб'ектыў.
**23.10** Гарачы каментар.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №1 (53) (студзень)

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: грамадска-літаратурнае жыццё студзеня ... с. 2.
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: развагі Галіны КАРЖАНЕЎСКАЙ ... с. 3.
«ДЗЁННІКІ»: «занатоўкі для сябе» Ніла ГІЛЕВІЧА ... с. 4–5.
«ПРОЗА»: урывак з аповесці «Покліч з нябёсаў» Паўла САВОСЬКІ ... с. 6.
«ПАЭЗІЯ»: вершы Эвы і Сяргея ПАНІЗЬНІКАЎ ... с. 7.
«ВЯНОК»: развітанне з Тацянай САПАЧ ... с. 8–9.
«ПРОЗА»: мініяцюры Анастасіі ЛАЗЕБНАЙ ... с. 10.
«ПЕРАКЛАД»: паэтычны ўкраінскі майдан у перастварэнні Эдуарда АКУЛІНА ... с. 11.
«ДЭБЮТ»: вершы Дашы КАБАКОВАЙ ... с. 12.
«УСПАМІНЫ»: згадкі Ірыны ПАЛЬЧЫНСКАЙ пра Клаўдзія ДУЖ-ДУШЭЎСКАГА ... с. 13.
«ФОРУМ»: Ася ПАПЛАЎСКАЯ пра прэміі і кнігі ... с. 16.
«КРЫТЫКА»: агляд чарговага «Дзеяслова» ад ЛеГала ... с. 15.
«ДЗЕЯПІС»: кніжная паліца ды літаратурныя конкурсы ... с. 16.


СЛОВА

# ПРА СУЧАСНЫХ КАІНАЎ І АВЕЛЯЎ

Алаіза ПАШКУТАВА

**Дзіўныя справы твае… чалавеча! Кажы ні кажы, паўтарай ні паўтарай, тыцкай носам — ні тыцкай, а — як гарохам аб сценку. Што ў абываценляў, што ў вас, творцаў, інжынераў, так сказаць, чалавечых душаў. Пішаце-пішаце, а самі — ці чытаеце? Аповеды Бібліі, напрыклад. Не?! А гісторыя Авеля і Каіна са Старога Запавету — ой як паказальная і ў нашым сучасным жыцці, сімвалічная і… актуальная! Як, зрэшты, і гісторыя Сотніка з Рыбаком — з біблii чалавечага духу, напісанай неперараўзыдзеным Васілём Быкавым.**



Многія класікі-творцы ў турме сядзелі: і Якуб Колас, і Максім Танк, і ледзь не сотні рэпрэсаваных пры Сталіне. Дарэчы, у тых жа сценах сядзелі, дзе цяпер і Някляеў

Патлумачу пра ўсё па парадку. Не лятаю я ў творчых ампірыях, не лічуся апазіцыянеркай і яшчэ з 2006 года ўсялякія сталічныя нашыя «Плошчы» бокам абыходжу. Тым больш, што некаторыя — як цэнтральная Кастрычніцкая — лёдам у гэтыя выбарчыя часы залітая. На каньках стаяць не ўмею: не той узрост. Спіна, не пры вас сказана будзе, баліць, і бразнуцца касцьмі сваімі старымі баюся. Не так бразнуцца, як — не падняцца…

Словам, дома сяджу, на пенсіі, адпрацавала ў «эпохі» розных развітых сацыялізмаў, і нават ледзь абяцанага камунізма не дачакалася. А што дома? Кухня, зрэдку «кірха» ды ўнукі. Навагодня-калядыя святы прайшлі. Зноў адна. Правільней — з радыё. На той жа кухні. На стары Новы год ці не першым паведамленнем — інфармацыя пра прэс-канферэнцыю вядомага мне генерала міліцыі і пісьменніка, колішняга сенатара Мікалая Чаргінца. Хвіліны з дзве ягонага выступу: пра тое, чым займаецца Саюз пісьменнікаў.

Малайцы! Я ж, варона загуменная, пенсійная, думала, што загінаецца ў нас тая ніва творчасці. А аказваецца — не! Колькі секцый панаадкрывалі! І дзіцячай літаратуры, і «стваральнай» крытыкі, і нават сатыры з гумарам. Але нешта шкрабнула мяне пры тых словах, на маёй спакойнай кухні — не раўнуючы, як нажом па патэльні… Ну новай такой, дарагушчай… А, успомніла: з ціфлонавым пакрыццём. Тым, што праз месяц адстае, як фарба з плоту, калі ў дождж пэцкаюць. Суседка сцвярджала, што з замежнай патэльні не адстае. Што лушпініцца цiфлон толькі з патэльні беларускай вытворчасці. Штосьці яна яшчэ плявала на нашую якасць, штось супраць «Купляй беларускае»… Ды хай ёй! Я — не аб тым.

А — пра інжынерыю чалавечых душаў. Радыё беларускае, сетку праваднуую, нагадаю, слухала. І гаворку названага вышэй пісьменніка. І пашкадавала, што не чула пра аншлажныя вечарыны ў «абноўленым» Доме літаратара, а то б схадзіла. На расхвалены па тым жа радыё вечар сатыры і гумару, а то расійская тэлегумарная папса абрыдзела. А дзе іншую ўзяць? (Толькі чаму высокапастаўлены прамоўца сказаў невядомае мне раней слова «сатырысты»? Гэта так правільна? Раней, калі ў школе працавала, відаць, слоўнікі старыя былі…)

Але тады і прасцей было. І — зразумела ўсё. Сказалі, запэўнілі, агучылі афіцыйна патрэбнае дзяржаве па тэле ці тым жа радыё — і наперад! А цяпер? Цяпер жа — спасу на нашыя слабыя галовы няма! Унук інцярнэт правёў. Пасміхнуўся, што радыём заслухалася (не разумее, што я шчыра літаратурай захапляюся, нават вершы сама пішу), пабачыў, што ледзь катлеты на кухні не спаліла, запозненна паабедаў — і да кампутара. Неўзабаве і мяне паклікаў. Чытай, кажа, бабця, пра сваіх пісьменнікаў. А па маіх слабых вачах — як сярпом гэтыя радкі «Свабоды». З сайта. Як унук называе… «Сёньня на прэсавай канфэрэнцыі старшыня праўладнага Саюзу пісьменьнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец зьняважліва выказаўся на адрас Уладзімера Някляева і паведаміў, што ня будзе хадайнічаць перад уладай за яго вызваленьне з турмы КДБ»…

Ну вось, а я і расслабілася была над катлетамі. І закарцела мне, як той казаў, мяса і мух паасобку раскласці. Усё прачытала з некалі варожай свабодаўскай «хвалі» пра канферэнцыю. Аказваецца, Мікалай Чаргінец адказаў і на пытанне пра арыштаванага і вядомага мне паэта Уладзіміра Някляева (пагадзіцеся, песні ды вершы ў яго выдатныя!). Чытаю — і вачам не веру, як таму купленаму цiфлону. Паслухайце: «Што тычыцца Валодзі Някляева, ён мне проста нагадваў кацяня, якое нарадзілася ў стайні, але патрабуе пашпарт каня. Ён стварыў праблему сам сабе і стварыў праблему для грамадства. Але мы за яго ня будзем змагацца, ня будзем патрабаваць: «дайце яму свабоду». Ён парушыў закон Рэспублікі Беларусь, і ня трэба тут дэманстраваць ілжывую карпаратыўнасьць… ». Было ў адказе М. Чаргінца і прызнанне ў тым, што калі б ён, Някляеў, перабраў з «зялёным змеем», а не з палітычным, ды патрапіў праз тое ў міліцэйскі пастарунак — то тады б генерал міліцыі і кіраўнік аднаго з пісьменніцкіх саюзаў за яго заступіўся. А так — «ён парушыў закон Рэспублікі Беларусь». Наколькі абазнаная, і неадэкватна выпіваць ды патрапляць у пастарунак — не законная акцыя. Інакш жа чаго цябе міліцыя хапае?

Ну ды ім лепш відно… А вось пра кацяня ў конскай стайні, якое замахнулася на пашпарт каня… У арыгінале — лошади… Гэта, я вам хачу сказаць, аксюмаран! У тым мне, дурной, абраза на прэзідэнцкае пасведчанне расчыталася! Ну а якога ж іншага дакумента кандыдат у прэзідэнты Някляеў дамагаўся? А тут — пашпарт лошади…

Ды не мне судзіць. А закранула мацней іншае: не будзем мы, маўляў, за тое «кацянё» заступацца ды карпаратыўна яго падтрымліваць. Што ж вы за людцы такія, пісьменнікі?! Ад сумы і турмы, як вядома, аніхто ж не застрахаваны. У тым ліку і пісьменнікі, і генералы. Я сама школьны гісторык па адукацыі, але з паўгода «белліт» выкладала (замяняла дэкрэтніцу), дык памятаю: многія класікі-творцы ў турме сядзелі: і Якуб Колас, і Максім Танк, і ледзь не сотні рэпрэсаваных пры Сталіне. Дарэчы, у тых жа сценах сядзелі, дзе цяпер і Някляеў знаходзіцца. Дык чаму ж яму не паспачуваць, не гаворачы — заступіцца? Нават чыста па-чалавечы, нават па Божай навуцы — чаму не дараваць? Чаму вы, даражэнькія, не чытаеце пісанні — і чалавечыя, і Гасподнія? Вышэй працытаваныя выказванні — гэта ж, дурной маёй галавой думаецца, гэта ж… рыбакізм. Гэта ж як у тым Быкаўскім «Сотнікаве»: пятлю на горла сабрату накінуць і заслончык з-пад ног выбіць! Каб — самому спакайней жыць. Гэта — як у Старым Запавеце: Каін з «вышэйшай» рэўнасці брата свайго Авеля забіць вырашыў.

Прачытала і тое, што пракаментаваў інцярнетнай «Свабодзе» і другі старшыня — старэйшага Саюза пісьменнікаў Коласа і Быкава Алесь Пашкевіч: «Усясьветная, эўрапейская пісьменьніцкая супольнасьць, пісьменьніцкія саюзы Польшчы, Літвы, Украіны, іншых краінаў, як і Саюз беларускіх пісьменьнікаў, занепакоеныя абставінамі зьняволеньня Ўладзімера Някляева і Аляксандра Фядуты».

Не ўсе адным лыкам шытыя, аказваецца. Вось толькі мая настаўніцка-ўедлівая душа сумніўна ўспрыняла ягоныя словы аб Максіме Горкім. Падумала, што памыліўся Алесь Пашкевіч, гаворачы: «Дакумэнтальна засьведчана, і гэта факт: Максім Горкі стварыў пісьменніцкую асацыяцыю, саюз, таварыства, калі сам адседзеў, калі пачалі садзіць пісьменьнікаў у 1901 годзе, ён грашыма дапамагаў жонкам вязьняў і самім вязьням. І асноўная, нават статутная задача — аказваць маральную, матэрыяльную дапамогу сваім сябрам». Статут — статутам, а Горкі ж пісьменнікаў аб'яднаў, як нас вучылі, у 1933–1934 гадах…

Забылася я на сваю кухню з катлетамі — і пачала ўжо ў гістарычных «мухах» разбірацца. Унук дапамог, з гуглам нейкім. І ўпэўнілася я, што апошняя цытата — і насамрэч на фактах узрасла. Што і да сталінскага СП ў Расійскай яшчэ імперыі існаваў «Союз взаимопомощи русских писателей и учёных». Што і Горкі актыўнічаў у тым Саюзе, бо на сваёй скуры паліцэйскія засценкі адчуў — яшчэ ў Ніжнім. І дзейнасць тога СП была актыўнай. Напрыклад, як я вычытала: калі 1 сакавіка 1901 года паліцыя і войскі напалі на бяззбройных грамадзянаў у Пецярбурзе, былі арышты. Хапалі і моладзь, студэнтаў. Дык вось, 39 членаў Саюза ўзаемадапамогі рускіх пісьменнікаў звярнуліся да міністра ўнутраных спраў з рэзкім пратэстам супраць гвалту. Сярод іх — і Максім Горкі. Праўда, ужо 12 сакавіка таго ж года па распараджэнні пецярбургскага граданачальніка Саюз «няправільны» быў забаронены…

Ды тое — ужо ці не іншая гісторыя. Хаця… Усё — пра адно і тое ж. Пра мухі і катлеты, пра кацянятаў і коней. Пра Авеля і Каіна, нарэшце.

Хто мае галаву — той думае. Хто мае вушы — пачуе.

Ды ўсё ж — дзіўныя справы твае, чалавеча! Кажы ні кажы, а — як гарохам аб сценку. Што ў абываценляў, што ў вас, творцаў, інжынераў, так сказаць, чалавечых душаў. Пішаце-пішаце, а самі — ці чытаеце? Хоць бы Кнігу Кніг. Ці задумваецеся? Прынамсі, некаторыя з тых, хто цяпер вяшчаюць з высокіх трыбунаў ды па радыё, якое я паслухала на кухні.

ЛІТІНФАРМ

# НЕ КОЖНЫ ПІСЬМЕННІК, ХТО ТАК СЯБЕ НАЗЫВАЕ

**13 студзеня на прэсавай канферэнцыі старшыня праўладнага Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец зняважліва выказаўся на адрас Уладзіміра Някляева і паведаміў, што не будзе хадайнічаць перад уладай за яго вызваленне з турмы КДБ. У той жа час міжнародная пісьменніцкая супольнасць выказвае словы падтрымкі зняволеным у Беларусі літаратарам і журналістам і патрабуе іх вызвалення. Ці існуе карпаратыўная салідарнасць, ці патрэбная яна?**

Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч узгадаў, што творчыя саюзы, асацыяцыі яшчэ ў XIX стагоддзі ствараліся дзеля агульнай братэрскай падтрымкі сваіх калегаў: «Дакументальна засведчана, і гэта факт — Максім Горкі стварыў асацыяцыю, саюз, таварыства, калі сам адседзеў, калі пачалі садзіць пісьменьнікаў у 1901 годзе, ён грашыма дапамагаў жонкам вязняў і самім вязням. І асноўная, нават статутная задача — аказваць маральную, матэрыяльную дапамогу сваім сябрам. Усясветная, еўрапейская пісьменніцкая супольнасць, пісьменніцкія саюзы Польшчы, Літвы, Украіны, іншых краінаў, як і Саюз беларускіх пісьменнікаў, занепакоеныя абставінамі зняволення Уладзімера Някляева і Аляксандра Фядуты».

А вось былы сябра Уладзіміра Някляева, старшыня праўладнага Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец наконт карпаратыўнай салідарнасці выказаўся так: «Што тычыцца Валодзі Някляева, ён мне проста нагадвае кацяня, якое нарадзілася ў стайні, але патрабуе пашпарт каня. Ён стварыў праблему сам сабе і стварыў праблему для грамадства. Але мы за яго не будзем змагацца, не будзем патрабаваць: «дайце яму свабоду». Ён парушыў закон Рэспублікі Беларусь, і не трэба тут дэманстраваць ілжывую карпаратыўнасць... Гэта трэба дакладна разумець, інакш, калі мы будзем яго маральна падтрымліваць, гэта азначае — падштурхоўваем: маўляў, давай і далей здзяйсняй злачынствы».

Што да карпаратыўнай салідарнасці, старшыня Саюза пісьменьнікаў Літвы Ёнас Ліняўскас кажа: «Я думаю, яна проста неабходная. Я ведаю пра заяву нашага ПЭН-цэнтру, што і Фядуту, і Някляева прынялі ў Літоўскі ПЭН-цэнтар і патрабуюць іх вызвалення як сябраў Літоўскага ПЭН-цэнтру. Я напісаў адкрыты ліст зняволеным. У нашай газеце «Літаратура», якая выйдзе ў пятніцу, будуць апублікаваныя мае пераклады твораў Уладзімера Някляева з іх фатаграфіяй».

Чэслаў Сэнюх, вядомы польскі літаратар, перакладчык беларускіх класікаў, а таксама і Уладзімера Някляева, распавёў:«Я якраз учора запісаў сваю чарговую перадачу беларуска-польскую — пра трох непакорных паэтаў, з перакладамі вершаў, у тым ліку Ларысы Геніюш. Ну, страшна ўсё гэта. Бяда ў тым, што мы, нармальныя людзі, цалкам бяссільныя супраць такога феномена, якім з'яўляецца беларускі прэзідэнт, гэты дыктатар Беларусі. І ўсё ж я спадзяюся, што выпусцяць Валодзю на свабоду. Самае галоўнае — не маўчаць, маўчаць нельга. Таму што гэта тое самае, што сказаць — так, так трэба».

У абарону беларускіх літаратараў, якія знаходзяцца за кратамі, выступілі многія ўсясветна вядомыя асобы, міжнародны ПЭН-клуб. Камітэт «Пісьменнікі ў зняволенні» заклікаў асудзіць арышты і жорсткае абыходжанне з Уладзімірам Някляевым, Аляксандрам Фядутам, Ірынай Халіп ды іншымі палітвязнямі...

**Іна Студзінская, Радыё СВАБОДА**

РОЗГАЛАС

# ВЕРШЫ НЯКЛЯЕВА ГУЧАЛІ Ў ЛОНДАНЕ

**Акцыя салідарнасці з беларускімі палітычнымі вязнямі і дэмакратычнай апазіцыяй прайшла 16 студзеня перад амбасадай Беларусі ў Лондане. Арганізатарамі выступілі прадстаўнікі беларускай дыяспары: члены Згуртавання беларусаў у Вялікай Брытаніі і Англа-Беларускага таварыства. Акцыя сабрала больш за 50 чалавек.**




Удзельнікі пікета звярнуліся да ўладаў Беларусі з патрабаваннем неадкладна вызваліць усіх палітычных вязняў, спыніць кампанію запалохвання і тэрору супраць незалежных СМІ і грамадзянаў, якія ўдзельнічалі ў мірных пратэстах супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў.

На пікеце выступіў а. Аляксандар Надсан, вядомы грамадскі і рэлігійны дзеяч, духоўны лідар беларускай эміграцыі. Прамовіла сястра палітвязня Андрэя Саннікава.

Удзельнікі пікета раскрытыкавалі нядаўні прэс-рэліз пасольства Беларусі ў Вялікабрытаніі, у якім распавядаецца пра нібыта камфортныя ўмовы ўтрымання вязняў у СІЗО КДБ і пра нібыта магчымасць доступа сваякоў і адвакатаў да вязняў. Быў зачытаны спіс абвінавачаных па крымінальнай справе аб нібыта арганізацыі масавых беспарадкаў.

Акрамя гэтага, удзельнікі пікета ўшанавалі памяць людзей, якія зніклі або памерлі пры нявысветленых абставінах у 90-я гады: Віктара Ганчара, Юрыя Захаранкі, Анатоля Красоўскага, Дзмітрыя Завадскага, Генадзя Карпенкі, Анатоля Майсені. Акцыя «Салідарнасць-16» з патрабаваннем празрыстага расследвання тых трагічных падзеяў была распачатая журналістам Ірынай Халіп, якая цяпер знаходзіцца за кратамі.

Напрыканцы акцыі ўдзельнікі зачыталі некалькі вершаў Уладзіміра Някляева, паэта і былога кандыдата ў прэзідэнты, які таксама быў збіты і кінуты ў турму 19-га снежня.

«Беларуская ўлада павінна ведаць, што нішто не забыта і нішто не даравана. Рана ці позна ўсе адказныя за палітычныя рэпрэсіі і за забойства людзей будуць адказваць перад законам», — заявілі ўдзельнікі акцыі.

**Алесь Чайчыц, «Беларус на чужыне»**

MEMORIA

# СПАЧЫЎ ВІТАЛЬ ТАРАС

**Уначы 18 студзеня 2011 года на 55-м годзе жыцця памёр літаратар, публіцыст, сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускай асацыяцыі журналістаў Віталь Тарас.**



Ён працаглы час мужна змагаўся з анкалагічным захворваннем, актыўна пісаў, друкаваўся і ўдзельнічаў у грамадскім жыцці.

Развітанне прайшло 19 студзеня. Пасля адпявання труна з целам пісьменніка рушыла ў апошні шлях на Паўночныя могілкі Мінска.

Жалобныя дні яшчэ больш азмрочыліся паліцэйскім кашчунствам: міліцыянты, якія прыйшлі засведчыць факт смерці, узялі ў нябожчыка... адбіткі пальцаў.

СЛАВА

# ДОМ МАРЫЁ ВАРГАСА ЛІЁСЫ — МУЗЕЙ

**Неўзабаве хатні прытулак ганараванага сёлета Нобелеўскай прэміяй пісьменніка Марыё Варгаса Ліёсы будзе пераўтвораны ў музей, прысвечаны яго жыццю і творчасці.**



Дом знаходзіцца ў горадзе Арэкіпа, размешчаным на поўдні Аргентыны — ва ўрадлівай даліне ля падножжа спячага вулкана Эль-Місці. Сёння горад — буйны фінансавы і гандлёвы цэнтр, другі пасля Лімы прамысловы рэгіён Аргентыны, а таксама — гастранамічная сталіца Пяру дзякуючы шматстайнай кухні.

Аўтар «Цётачкі Хуліі і пісакаў» ды больш пяцідзесяці іншых кніг нарадзіўся ў згаданым доме ў 1936 годзе. Як паведаміў міністр культуры Пяру Хуан Ассіё, стваральнем музея займецца кінарэжысёр і прадзюсар Луіс Ліёса, стрыечны брат пісьменніка.

Побач з домам-музеем на Алеі Parra будзе ўсталяваны помнік пісьменніку — аб чым паведаміў мэр Арэкіпы Сімон Бальбуэна.

**Паводле Podroze.onet.pl**

## НАВІНКА

**Выйшла ў свет новая кніга паэзіі Сяргея Законнікава, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі і вядомага грамадскага дзеяча Беларусі. Яе назва — як сімвал нашага сучаснага жыцця: «Шалёная Куля». «Паэзія пяці гадоў» — такую падназву азначыў аўтар.**




Усё, што закранае сэрца паэта — і дома, і ў вандроўках — прыходзіць і ў яго вершы. Сярод іх — і кранальная лірыка, і тварысцкія прысвячэнні, і грамадзянскія прызнанні, і філасофскія пранікненні. Як сказаў пра творчасць Сяргея Законнікава народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль, «гэта тое, што патрабуецца ад паэзіі: жывое, разумнае, мудрае. У нас занадта многа траскатні. А тут не толькі чалавечыя пачуцці — радасць, смутак, надзея, вера, але і філасофскае абагульненне нашага жыцця».

Шукайце новую кнігу Сяргея Законнікава «Шалёная Куля» ў менскіх кнігарнях!

ПОГЛЯД

# УЗЯЦЬ ДЫ ВЫКІНУЦЬ ТЭЛЕВІЗАР...

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ



## 1. Да Плошчы

Адна знаёмая жанчына-псіхолаг на поўным сур'ёзе даводзіла мне, што значная частка нашага насельніцтва — дарослыя дзеці. Нават не дзеці, а немаўляты: ім галоўнае, каб цёпла, бяспечна і былі накормленыя. У мяне было сумненне на гэты конт, покуль я не пачала ўдзельнічаць у выбарчых баталіях ды размаўляць з людзьмі іншых сацыяльных пластоў. Калі я раздавала ўлёткі ў раёне трактарнага завода, да мяне падышла бабуля і пачала арыгінальна агітаваць за дзеючага. З вамі ж, кажа, за 16 гадоў нічога благога не здарылася; вы ж жывая! Я нават не знайшла, што адказаць, а потым даўмелася: перада мной класічны прыклад старога немаўляці, якому ў жыцці патрэбен мінімум.

Ёсць яшчэ дарослыя-«дзеці», дарослыя-«падлеткі» — усе са сваімі асаблівасцямі. Несумненна, у нашым грамадстве ёсць і сапраўдныя дарослыя — што бачаць сутнасць з'яў і рэчаў ды ўмеюць браць на сябе адказнасць. Але на якой бы ступені развіцця чалавек ні знаходзіўся, важна рухацца, не стаяць не месцы, не зарастаць раскай. Вось чаму для няўрымслівых і неспакойных усялякія выбары — найлепшы час. На жаль, завоблачная пасада прэзідэнта і прэтэнзіі на яе проста палохаюць нашых выбаршчыкаў. Ды ў прэтэндэнтаў проста нездаровыя амбіцыі! Куды гэтым цялятам дужацца з нашым дубам?! А яны і вылучыліся, і подпісы сабралі, і агітацыю правялі, і на ўсё гэта знайшлі сродкі і людскія рэсурсы. Хто «за ідэю» дапамагаў, хто проста любіць грамадскую работу, а хто і капейчыну зарабіць не супраць. (Пры нашай «поўнай занятасці» і гэта актуальна.) Хочаш — не хочаш, а разгул дэмакратыі трэба неяк асвятляць у СМІ. Не дзеля літары закона і электарата — дзеля бачнасці, дзеля міжнароднага іміджу. Для назіральнікаў з Еўропы і журналюгаў з усяго свету, якім зусім нядоўга «хацелі падабацца».

Вось і асвятляюць: дураць народ за народныя грошы. Згадаем, як паказалі пратэстнае шэсце па праспекце Незалежнасці, што адбылося 24 лістапада. Адна толькі група апазіцыі ўмясцілася ў кадр. Затое ракурс цікавы: зверху, наўскасяк, на краму «Чараўніца» — з балкончыка аднаго прадстаўнічага дома, які прыезджыя прымаюць за тэатр. Відаць, супрацоўнікі БТ і АНТ пабаяліся за свае камеры, а для навін папрасілі здымкі ў «калег».

У праграмах навін кандыдатаў высмеялі пасля першых жа эфіраў: маўляў, ніводзін не спытаў, куды глядзець. А вы для чаго ў студыі, спадары-тэлевізійнікі?!. Гэта ваш прамы абавязак — паказаць, куды глядзець і куды гаварыць запрошанаму кандыдату. Ды і студыю маглі прадаставіць з бягучым радком, і фон зрабіць прыстойны, а не такі, як на дэбатах.

Асобна варта разгледзець, як паказвалі моманты сустрэч з выбаршчыкамі. Камера старанна ездзіла па пустых крэслах, калі зала была няпоўнай, і захоплівала толькі краёчак, калі народ збіраўся дружна. Цікава, ці паказалі, як на Серабранцы ладзілі сустрэчу міністр адукацыі Радзькоў з мэрам Ладуцькам (даверанныя асобы ясна каго)? Настаўніцам з бліжэйшай гімназіі загадалі быць усім, раздалі загадзя падтрыхтаваныя пытанні, а галоўнае — папярэдзілі горш апрануцца, каб іх прымалі за работніц з інтэрната.

У даўжэзных нудных сюжэтах прэтэндэнтаў дзе не столькі кусалі, колькі слінілі, і што характэрна — прозвішчаў стараліся не ўпамінаць. У ідэале, кандыдатаў (акрамя аднаго) лепей было б зусім не паказваць і не згадваць, быццам нічога не адбываецца, быццам выбары — звычайная фармальнасць. Зноў жа — не зразумеюць. Звязаць пачнуць у далёкім ці блізкім замежжы... Таму выхад адзін: дыскрэдытацыя гэтых нахабных выскачак, гэтых адшчапенцаў, што не хочуць жыць па сцэнарыі, прапісаным за столькі гадоў.

А яны, карыстаючыся тэле- і радыёэфірам, шмат нагаварылі старшыні. Пафас большасці выступаў можна перадаць такімі словамі: «Злезь з даху і не псуй гонту». А адзін нават фантастычную карціну намаляваў (такое толькі паэт мог прыдумаць): быццам Новы год, шампанскае ў бакалах, А.Р. з сынам перад экранам, і яго віншуе з Новым Годам н о в ы прэзідэнт! У страшным сне такое не прысніцца — каб не ты віншаваў, а цябе!

Для плоймы ідэолагаў і падпявалаў гэта былі сапраўды «сапсаваныя вечары перад несапсаваным тэлевізарам». А для нас, хто па другі бок бар'еру, — момант ісціны і эмацыйнага ўзрушэння. Усіх паслухалі і абмеркавалі, убачылі вартасці і недахопы. Пахвалілі першы выступ Някляева і другі — Рымашэўскага, адзначылі важкія моманты ў Саннікава, трапныя — у Статкевіча (тыпу «залез наверх і прыбраў за сабой лесвіцу»), угледзелі згоднікаў. Не, усё-такі дзевяць кандыдатаў лепей, чым гіпатэтычны адзіны... Усё ж нейкая драматургія, нейкая інтрыга — хай сабе і з прадказальным канцом.

Так і падмывае спытаць у рэжысёраў-пастаноўшчыкаў: вы хацелі балагана, цырка на дроце? Распішыцеся і атрымайце.

Савок сапраўды вечны, як вечныя ў прыродзе цвіль і плесня. Яму не патрэбны ні празрыстыя скрыні, ні сумленны падлік. Буфет і фікусы — вось яго ўзровень.

Лепшыя «вумы» Беларусі ламалі галовы, як падлавіць шулераў з выбарчых камісій. Шкада, што не дазволілі браць спальнікі і начаваць на ўчастках. З'явіцца ўначы крадком кот Базілія з лісой Алісай укідваць ці мяняць бюлетэні, а прадстаўнік якогась штаба тут як тут! Ды пад белыя рукі, ды ў справядлівы беларускі суд! Ах, мары, мары!.. Калі ўся сістэма гуляе краплёнымі картамі — ад настаўніц да сілавікоў, то што тут зробіш?

Кажуць, што сумленне выглядае як поле, як абалонка вакол чалавека. Гэтая абалонка знікае ў людзей з цяжкімі залежнасцямі, у старых, якія здзяцінелі, а ў дзяцей яшчэ не сфарміравана. Куды яна падзелася ў мясцовай тэбэшнай брацыі, якая не п'е, не колецца і зусім не старая — вялікае пытанне. На першай «Кухні» Георгій Калдун яшчэ саромеўся... Як без сумлення абыходзяцца салідныя дзядзькі з партфелямі і нават пры пагонах, таксама невядома. Памятаеце эпізод з фільма «Кін-дза-дза», дзе героі прыляцелі на амаль знішчаную планету? Улада без сумлення — як планета без кіслароду; адны мікробы добра сябе адчуваюць...

## 2. Пасля Плошчы

Спланаваны выбарчы фарс за адну ноч ператварыўся ў такі ж спланаваны трылер, мэта якога — запалохаць і магчымых кандыдатаў, і выбаршчыкаў. Каб ужо ніхто ніколі не пасягаў на беларуска-азіяцкі варыянт дзяржаўнага ўтварэння.

Хто быў на Плошчы, ведае, што там было. Для тых, хто не быў, назаўтра ўстроілі шоу па ТБ. Гэтая істэрыя на ўсіх трох каналах па сутнасці абапіралася на адну і тую ж, спецыяльна знятую карцінку: біццё шкляных дзвярэй Дома ўрада. Прычым адзін і той жа сюжэт паўтараўся бясконца, каб людзі думалі, што гэта быў штурм, асада. Праз тыдзень, у праграме «Контуры», разбітага шкла стала нашмат болей — і ўсё зялёнае, ад бутэлек. І хто ж гэта на марозе назнасіў піўных бутэлек на ганак ДУ і біў іх там кучай?! Каб так дробна набіць, патрэбен час. Відавочна, што гэта маглі рабіць такія ж нанятыя людзі, як і тыя, што дзелавіта неслі рыдлёўкі.






З расійскіх каналаў звесткі пра наступствы выбараў у Беларусі рэгулярна вырэзваюцца. Тэлевізар ужо можна не глядзець

Раз за разам паўтаралі і сюжэт з адрачэннем Раманчука. Яно выглядала б больш пераканаўчым, калі б экс-кандыдата «дадушылі» не ў тую ж ноч. А то нейкае яно рэзкае, падазронае, злавеснае... Затое не спяшаліся абнародаваць лічбу зняволеных. Давялося с а м о м у, на прэс-канферэнцыі агучыць яе. Тон і змест яго слоў, калі гаворка ішла пра збітых кандыдатаў, палягае за межамі дабра і зла, таму і каменціраваць цяжка. У зале адны ўсміхаліся, як паўдуркі, тыпу — падтрымлівалі, іншыя выглядалі прыгнечанымі. Група журналістаў, падобных на японцаў, прыкметна сцялася і знаходзілася, відавочна, у шоку.

Усе мы былі ў шоку. У пакладзістай бабулі аказаліся вялікія вушы і яшчэ большая зяпа. Яна ўжо нікому не хацела падабацца, бо беспрынцыпны сусед ёй нешта паабяцаў. Галасы, як заўсёды, лічылі кепска. (Кажуць, што іх пасля ўсяго лічаць аналітыкі.) Перастараліся. Крышталёвая мара разбіта. Нават сытая Еўропа не змагла вытрываць такога здзеку з закона і здаровага сэнсу.

А далей пачалося самае цікавае: інфармацыі пра зняволеных, пра арышты і канфіскацыі ў офісах увогуле перасталі даваць. А цікавенькі б атрымаўся сюжэт на незалежным тэлебачанні — як з офіса БХД зносяць табурэты і кубкі ды як дзеці радуюцца пачкам паперы... Кандыдаты са зняволеных перайшлі ў статус арыштаваных, кожнага там «даціскаюць» паасобку, змушаючы да пакаяння. А тут — ёлкі, феерверкі, падарункі — быццам зноў нічога не адбылося...

Каб мы зусім не скіслі ў чаканні афіцыйных звестак, паказалі «дакументальны» фільмец, які стаў эпагеем ілжы і подласці. Гэтыя арсеналы знойдзенай зброі проста пацяшаюць інфармаваных гледачоў. Што ж атрымліваецца: знайшлі напярэдадні 19-га снежня, а паказалі 9 студзеня? Рыхтавалі, мабыць, доўга... Кінуліся ў вочы дзве недарэчнасці, цалкам невыпадковыя: прыпісалі БХД У.Хамічэнку (таго, што ў рукаў гаварыў), а таксама ўманціравалі ў відэарад спакойны, годны твар Уладзіміра Някляева. Як быццам ён у гэты час не знаходзіўся пасля збіцця ў бальніцы, а прымаў удзел у несанкцыянаваным мітынгу. Недалёкія і неабазнаныя могуць і паверыць, як вераць малыя ў Дзеда Мароза, — што яшчэ раз даказвае «дзяцінную» прыроду беларускага электарата.

Хто кіраваў разгонам, мы ўжо ведаем. Але хто кіруе такой бяздарнай, грубай «дэзай»?! З расійскіх каналаў звесткі пра наступствы выбараў у Беларусі рэгулярна вырэзваюцца. Тэлевізар ужо можна не глядзець. Увогуле — узяць ды выкінуць.

ЗАПІСЫ

# ДЗЕВЯНОСТА ТРЭЦІ

## «ЗАНАТОЎКІ ДЛЯ СЯБЕ», ЗРОБЛЕНЫЯ Ў ЧАС ПАСЯДЖЭННЯЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Ніл ГІЛЕВІЧ

**19 траўня.**

Пачалося, як звычайна, з «Рознага».

Дэп. Дзейка звярнуўся з запытам да генеральнага пракурора, чаму быў звольнены з Арміі афіцэр Мікалай Статкевіч.

Дэп. Кучынскі прабіў трывогу аб пашырэнні ў Беларусі рэлігійных сектаў «Белыя браты», «Крышнаіты» і іншых — аб страшным уздзеянні іх на псіхіку нашай моладзі, аб неабходнасці ратаваць яе. Маладыя хлопцы, трапіўшы ў іх сеці, сохнуць, усыхаюць. Многія наогул знікаюць!

Дэп. Баршчэўскі. Запыт намесніку прэм'ера М. Дземчуку: чаму ў кнігарнях няма беларускіх кніг? Апратэставаў («у народа выклікаў смех») выпад дэп. Качана і кампаніі супроць БНФ. (У зале прамаўчалі).

Першае пытанне Парадку дня: Аб зменах у Канстытуцыі.

Дакладчык дэп. Леўчык. Доўга затрымаліся на першай жа папраўцы. На кожную заўвагу — у зале рэплікі, як у школьнікаў ці студэнтаў — лёгкія, зубаскальскія, з прэтэнзіяй на дасціпнасць. Ах, гэтыя практыкаванні ў дасціпах! Як яны выдаюць узровень культуры, выхаванасці!

У зале — вялікая суматоха. Спрэчкі — якіясьці анархічныя, мітынговыя, амбіцыйныя, і нават бізкаватыя. Леўчык, пасля правалу першага пытання, што называецца «плюнуў» і сеў на месца. Дэп. Арціменя прысарамаціў усіх — асабліва Лукашэнку: за яго выступленне. Шушкевіч злосна абрэзаў Лукашэнку: «Хопіць дэмагогіі! Вы толькі крычыце, як на мітынгах. А ніводнай за ўвесь час канкрэтнай прапановы! Ніхто так не дэстабілізуе залу, як вы!».

Праект новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Дакладчык Шушкевіч. Гаварыў хвілін 15 — максімум, а можа і 10. Для такога даклада — малавата. Я чакаў: што зойме каля гадзіны. Пайшлі пытанні. Першае: Дык што за лад у нас будзе, у Беларусі — сацыялістычны ці капіталістычны? — Адказ: Пачытайце ўважліва тэкст, там сфармулявана.

Дэп. Камай: А дзе Закон аб сімвалах у Канстытуцыі?

Адказ: Ёсць закон, і добры, добра прыняты грамадскасцю, і няма патрэбы яго мяняць. (Сапраўды, сімвалы ў нас выдатныя. Адно што Гімна няма.)

Пытанне: Чаму — платнае навучанне? А было бясплатнае. — Адказ: Было не для ўсіх, было сацыяльнае рэгуляванне. Пытанне: Што ў эканамічнай аснове ладу — якая ўласнасць? — Адказ: Не трэба вызначаць! Будзем будаваць справядлівае грамадства, на прававых асновах. — Пытанне: Ці парламент будзе прафесійны, ці такі, як цяпер? — Адказ: Прафесійны, але… з пэўнымі агаворкамі (рэгламентацыямі).

Дэп. Заблоцкі: Нідзе ў свеце няма спалучэння выканаўчых і заканадаўчых улад. Усюды яны размежаваны.

Дэп. Качан: Дзе гарантыя на працу, на адукацыю і г.д.?

Шушкевіч: Не трэба слоў «гарантыя». Гэта — нерэальна!

Дэп. Камай: Дык якая ж эканамічная аснова РБ? Трэба вызначыць у Канстытуцыі эканамічны базіс РБ!

Адказ: Няма патрэбы ў такім вызначэнні, у іншых краінах няма.

Дэп. Трафіменка: На здароўе — гарантуецца права, а на ўсё іншае — не, слова «гарантуецца» няма.

Дэп. Сінчылін: Чаму адна беларуска мова — дзяржаўная?

Шушкевіч адказаў вельмі эмацыйна, але добра, лагічна і доказна. Праўда, спасылка на шведскую мову ў Фінляндыі — няўдалая.

Дэп. Лакцюшын. Таксама аб мовах. Паршывую сацыялогію прыцягнулі з «Советской Белоруссии», фальшывыя лічбы… Ах, сацыёлагі!

Шушкевіч рэзка абрэзаў.

Дэп. Баршчэўскі пачаў дасведчана гаварыць аб мовах у Фінляндыі. У зале заулюкалі. Асабліва — дэпутат-генерал Гетц.

Дэп. Лавіцкі прапанаваў зняць у прэамбуле ўпамінанне аб Статуце Вялікага Княства Літоўскага. Прагаласавалі прапанову. «За» ўпамінанне — толькі 106 галасоў. Знялі! З энтузіязмам! Вось адносіны да гісторыі Бацькаўшчыны. Не было яе і няма — у душах і сэрцах бальшыні.

**20 траўня.**

Арганізацыя працы і дысцыпліна — ніякая. Калі галасавалі пункт аб грамадзянстве — спачатку было ў зале 203 дэпутаты, паўторна — ужо 250, амаль 50 набеглі з калідораў, з кафэ. Не склікаўшы людзей у залу, паставілі на галасаванне.

Станкевіч нахіліўся да мяне і прашаптаў: «Шушка (Шушкевіч) перад выбарамі спікера запрасіў на кватэру Лукашэнку, Ганчара, рэзаў і чысціў селядца і прасіў: «Галасуйце за мяне! Я вас не пакрыўджу, буду падтрымліваць…». А цяпер — такія ворагі Лукашэнка і Шушкевіч!». (Па-мойму, плётка, у якой зацікаўлены непрыяцелі Станіслава, а іх процьма.)

Аб дзяржаўнай мове ў Рэспубліцы Беларусь. Зноў вылезлі: Лакцюшын (учора — Сінчылін) і член нашай Камісіі, дзядок П. З. Мінчанка (пасланец ад КПБ) і іншыя. Канешне ж, узяў і я слова. Пры маім выступленні рэпліку «Не пугай!» кінуў дэпутат з Барысава Трусаў (не ўпершыню і менавіта «Не пугай!» — на «ты», як у сябе на заводзе). Кінуў — пасля маіх слоў: «Для Беларусі стане горш, калі мы адступім назад ад Закона аб мовах». Выступіў я нялепшым чынам, трэба будзе пры абмеркаванні п. 50 папрaвіць. І аднак жа за дзве дзяржаўныя мовы прагаласавалі 83 дэпутаты, а за адну беларускую — 204. Ура! Хоць гэта яшчэ толькі абмеркаванне праекта Канстытуцыі.

**21 траўня.**

Пачалі з пытанняў непрадбачаных: выступленне дэп. Сапронава аб злоўжываннях у замежным гандлі агаломшыла. Калі ўсё гэта праўда, то — жахліва! Слухалі з выключнай увагай і пры поўнай цішыні ў зале. Урад распрадае краіну, багацці народа, заганяючы людзей у жабрацтва.

Выступіў Міністр хлебапрадуктаў — амбіцыйна — з водпаведдзю Герасюку. А Герасюк тут жа прыпёр яго да сцяны фактамі.

Затым паўгадзіны аддалі тэме: як прымусіць дэпутатаў пастаянна быць на сесіях і ўдзельнічаць у пасяджэннях. Ой, што тут пачалося! Як узяліся бэсціць адзін аднаго! Шушкевіч неасцярожна назваў імёны адсутных дэпутатаў. А Станкевіч, бэсцячы яго за нібыта «пошла-кухонны ўзровень», сам пакарыстаўся менавіта такім стылем: «Вы можаце з маладой сваёй жонкай такое на кухні гаварыць…». Гэта — пра спікера Вярхоўнага Савета. Крэпенька! Выйшла: усе вы, шаноўныя, адною культурай валодаеце. Шушкевіч узарваўся: «Я не ў міліцыі ў вас, дэпутат Станкевіч, не падследчы на допыце ў вас!..»

Затым дэп. Ганчар з гасподніх вышак спляжыў усіх. Асабліва Шушкевіча і Прэзідыум.

**25 траўня.**

Выбары намесніка Старшыні Прэзідыума. Прапанавалі дэпутата Міцько, разумнага, інтэлігентнага чалавека, медыка па адукацыі. Правалілі: толькі 125 «за». Чаму? Праясніў сваім пытаннем да Міцько ваяўнічы дэпутат-генерал Сарокін: «Вашы адносіны да ўваходу Беларусі ў Калектыўную Бяспеку?». Добра адказаў Міцько, вельмі добра, але ўжо было ясна, што «зарэжуць». Якая зацятасць ворагаў нашай дзяржаўнай незалежнасці!

Абмеркаванне главы Канстытуцыі «Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь». За прэзідэнцкую форму кіравання выказаліся толькі 132 дэпутаты. Зарэзалі саму ідэю «прэзідэнцтва». Ніякага прэзідэнта не трэба: ні «моцнага», ні «слабага» (як у Германіі). Не трэба!

Слова ўзяў Ганчар: патрэбен галава ўлады, дзяржавы без галавы не бывае, такога няма ў свеце!

Прагаласавалі паўторна. Набралі 147. Рост! Не разумеюць шаноўныя, не разумеюць, якая нас можа чакаць бяда — пры нашай масавай палітычнай культуры.

**26 траўня.**

У «Розным»: дэп. Бойка зачытаў ліст свайго выбаршчыка супроць «тарашкевіцы» (палічыў вартым увагі). Ліст рэзкі. Дарэмна зачапіў Данчыка. Пытанне ж увогуле правамернае і ў прынцыпе — рэзкасць справядлівая. «А можа, гэта правакацыя?» — сказаў Бойка, як бы звяртаючыся да прысутных дэпутатаў-філолагаў. Не, вядома, не правакацыя, але падумаць так можна — настолькі самаўпэўнена і напорыста ў друку «плянуюць» і «клясуюць». Дарэмна А. Трусаў, узяўшы слова, «рашуча заявіў пратэст» супроць выступлення Бойкі. Праблема ж ёсць!

Абмеркаванне главы «Суд». Пункт аб увядзенні суда прысяжных не прайшоў… пасля выступлення А. Трусава, які напомніў зале, што суд прысяжных быў ліквідаваны бальшавікамі пасля 1917-га. Знайшоў каму напомніць! Тым, для каго суд прысяжных вельмі непажаданы. Пытанне зусім не звязана з палітыкай, але раз выступіў у падтрымку апазіцыйнік і крытыкнуў бальшавікоў — усё, кранты! Адразу ж многія ўсумніліся і — 20 галасоў не хапіла. Трусаў забыўся, хто ў зале.

Пытанне аб Кантрольнай Палаце.

Сама назва не прайшла. Дэп. Грынёў: Трэба сістэма кантролю, а Палата пакуль не адпавядае. «Вы протаскиваете то, в чём заинтересованы». (Гэта — Шушкевічу. Не зусім карэктна.)

Дэп. Сапронаў: Не разумею логікі паводзін дэпутатаў, што галасавалі супроць. Патрэбен жа кантроль!

Дэп. Макейчанка (у адказ на «шпільку» А. Трусава): І ў ЦК працавалі людзі, якія нешта ведалі ў галінах гаспадаркі. Між іншым, гэта праўда: былі такія людзі — і дасведчаныя, і кампетэнтныя, і культурныя. На жаль, часта ім не хапала мужнасці, стойкасці, упартасці, іх волю ламалі недасведчаныя і некультурныя, амбіцыйныя і фанабэрыстыя «сталаначальнікі».

**27 траўня.**

У «Розным» дэп. Герасюк гаварыў пра росквіт карупцыі ў Беларусі (набывае ўсё большыя маштабы). Папрасіў даваць яму слова па гэтым пытанні кожны дзень і да канца сесіі. (Брава, Герасюк! Малайчына! Нехта ж павінен пароць у вочы зладзюгам — што яны зладзюгі.)

Дэп. Крыжаноўскі спачатку расказаў пра састарэласць тэхнікі ў Беларусі і пра надбайнасць Урада ў гэтай справе. Затым папракнуў дэпутатаў за нападкі на Шушкевіча — што не падпісаў Дагавор аб Калектыўнай бяспецы, асудзіў і за непрыманне імі Кантрольнай Палаты — бо яна пачала ўскрываць злачынствы мужоў дзяржаўных.

Пытанне аб дадатковых паўнамоцтвах Савета Міністраў у Канстытуцыі. Дакладчык дэп. Леўчык. Спрэчкі разгарэліся страшныя. Кебіч (пасля выступлення дэп. Какоўкі і іншых) — ох і ўскіпеў ад злосці! «Ніводнай стрэльбы не прадалі ў Таджыкістан! І не прададзім без рашэння Вярхоўнага Савета! І вы, таварыш-гаспадзін Трусаў, перастаньце!.. У газетах поўна хлусні!..». А пачаў сваю прамову так: «Спыніце балбатню! Інача не магу сказаць!..» (Ох і разышоўся! Відаць, такі — дапяклі!).

Лакцюшын, Лукашэнка, асабліва генерал Гетц — крычаць так, што аж глушаць залу, патрабуюць амаль усенароднага ганьбавання дэмакратаў-апазіцыянераў. (Лакцюшын: «Все эти Каковки, Сасновы, Барщевские…»). Дэп. Заблоцкі абрэзаў крыкуноў, а галоўнае — гакнуў па эканамічнай палітыцы Урада за адсутнасць стратэгіі, за нягоднасць такога эканамічнага курса.

Дэпутаты Жукоўскі, Мачуленка зноў паднялі крык супроць дэмакратаў, — крык наогул, без канкрэтных прапаноў. Дэп. Сасноў вельмі пераканаўча даў ім водпаведзь.

**28 траўня.**

У «Розным» дэп. Чэпік патрабаваў або — або: або — Урад у адстаўку, калі праўда тое, што казаў Герасюк, або — дэпутата Герасюка пазбавіць на паўгода мандата за яго ўчарашняе выступленне пра міністра хлебапрадуктаў Якушава М. С. Вось такое або-або. Такая інтрыга ў сюжэце.

Пытанне Аб дзяржаўнай службе.

Дакладчык — дэп. Заблоцкі. Не ўцямлю, чаму Заблоцкі? Ён — намеснік старшыні Камісіі па навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе. Размова ж — пра служачых дзяржаўнага апарату!

Дэп. Голубеў зрабіў вельмі слушную прапанову: аб абавязковым веданні беларускай мовы як мовы дзяржаўнай тымі, хто паступае на працу ў дзяржаўную ўстанову. Узнікла спрэчка. Дэп. Цярэшка: «Камісія не прапанавала такога». Голубеў: «Непрыемна казаць, Іван Іванавіч, але Камісія тройчы разглядала і рэкамендавала гэтую прапанову». (Галасавалі як за прапанову аднаго Голубева. «За» — 42 галасы. Рэпліка з залы дэпутата-генерала Піскарова: «Великое множество!». Здзеклівым тонам, вядома. Чаму ж з дзяржаўнай мовы і не паздзекавацца! У нас, у незалежнай Беларусі гэта можна. Нават пахвальна. Пад воплескі…)

**1 чэрвеня.**

У «Розным». Дэп. Волкаў: «Нам у Камісію прыйшло звыш 100 пісем пра дзяцей з ракам шчытавіднай залозы. Колькасць расце. Ужо цэлыя сем'і хварэюць. Усіх чакае смерць! Дзяцей запісваюць інвалідамі ад нараджэння! Гэта дзікунства!»

Дэп. Качан. Тэма — Другі з'езд камуністаў Беларусі, назва-

# ДЗЁННІКІ

ны аб'яднаўчым. Чытае Зварот З'езда да Вярхоўнага Савета РБ. Аб недапусцімасці свабодных цэн на прадукцыю першай неабходнасці. Затым кінуў лозунг: «Адрадзіць саюзную дзяржаву! Іначай — пагібель!».

Дэп. Судас: пра ільготы пенсіянерам на транспарт у сельскай мясцовасці. Патрабуе вырашыць гэта пытанне ў карысць пакрыўджаных.

Шушкевіч дае водпаведзь М. Грыбу за яго выступленне ў «Народнай газеце» наконт падпісання Дагавора аб Калектыўнай бяспецы.

Слова ўзяў намеснік прэм'ера С. Лінг. Ад закона будзе залежыць, хто будзе працаваць на дзяржаўных службах. Тыя, што будуць, як жабракі, зазіраць у вочы кожнаму наведніку? (Гэта — у адказ тым, хто лічыць, што ў чыноўнікаў вельмі высокія зарплаты).

**2 чэрвеня.**

У «Розным». Дэп. Холад крытыкуе Кебіча, што не скарачае раздзьмутыя чыноўніцкія штаты.

Дэп. Лябедзька робіць запыт да сп. Жыльскага (старшыня камітэта па справах Рэлігіі) — у абарону каталіцкай парафіі ў Ашмянскім раёне, у абарону прыезджага святара (здаецца, са Славакіі). Няма ксяндзоў, а патрэба ў іх вялікая і ўсё нарастае. «У Гародні вучацца на ксяндзоў толькі 74 семінарысты. Гэтага зусім мала!» — бядуе Лябедзька.

Дэп. Пракаповіч: Спад вытворчасці працягваецца. Заключэнне эканамічнага саюза — працэс доўгі. Патрэбен палітычны Саюз у рамках СНД. Чаму з'ігнаравалі прапанову VII з'езду народных дэпутатаў Расійскай Федэрацыі аб утварэнні Канфедэрацыі? (Вось яно — куды хіліць! Да Канфедэрацыі! Нашто нам гэтая незалежнасць!)

Пытанне аб барацьбе з эканамічным злачынствам і карупцыяй.

Дакладчык — дэп. Папоў. Схапіліся спрачацца, што такое карупцыя. Дэп. Булахаў: Суб'ектам карупцыі з'яўляецца ўвесь беларускі народ! Бо эвентуальна кожны так ці інакш у ёй удзельнічае… Дэп. Какоўка: Зняць першы артыкул! Дэп. Аксаміт: Зняць увесь законапраект, дапрацаваць і ў канцы сесіі прыняць! Як добра ў ходзе абмеркавання пытання аб карупцыі бачна, хто не мае ніякага дачынення да злачынстваў, у каго сумленне чыстае!.. Гэта адчуваецца вельмі выразна. Сумленны чалавек (напрыклад, Аксаміт) гаворыць такім асаблівым тонам — і без крыку, і пераканаўча. Або як дэп. Герасюк, які сказаў: «Пры паступленні на дзяржаўную службу кожны павінен прад'явіць дэкларацыю». Так усюды ў свеце. Але калі вам падабаецца без дэкларацый — хай будзе так! (Прагаласавалі прапанову Герасюка: «за» — 171. Не прайшла. Дзіва што!..)

Ну і схватка! Па колькі разоў бяруць слова адны і тыя ж. Большасць схіляецца, што гэта не закон, а пастанова аб узмацненні барацьбы з карупцыяй і злачынствамі ў сферы эканомікі.

**3 чэрвеня.**

У «Розным» першы ўзяў слова дэп. Прывалаў. О, які, аказваецца, гэта ваяўнічы палкоўнік! Ястрабок! Але ж і заслужыў: крыкамі сагналі з трыбуны. Не любяць нашыя людзі празмернай ваяўнічасці.

Дэп. Федарчук: Побач з вамі, Станіслаў Станіслававіч, група па згатаванню віцебскіх «блюд», асабліва з Кантрольнай палаты. Знаю людзей, якія не мяняюць масак. (Нейкія цяжкія закіды, а пра што?)

Дэп. Маркевіч у прамове ўжыў слова «Шпалеры». У зале — бачна — не разумеюць, што гэта. Трэба рускім языком гаварыць, шаноўны!

Дэп. І. Трусаў. Пытанні Шушкевічу: Ці падпісаў Станіслаў Станіслававіч Дагавор аб Калектыўнай бяспецы? Якую пазіцыю ў гэтым займае Прэзідыум. І нарэшце: калі вы былі шчырым? (Во дзе сапраўдная «вандэя»! Божа, як мы яшчэ далёка да беларускай Беларусі!).

Дэп. Казлоў. Выйшаў, каб пахваліць «Фемиду» — як найвыдатную ў Беларусі газету (Не важна, што на мове другой краіны). Пафас выступлення: «Далоў Шушкевіча!». Абкладаюць Стася. Але ці толькі яго?

Думаю пра выступленні на сесіі дэпутата І. Т. Увесь час адчуваю, што гэты беларус няйначай як вывучанік вядомага «северозападника» І. Саланевіча. Умоўна, бо гэтага прозвішча ён, напэўна, і не чуў, тым больш яго шавіністычных опусаў не чытаў. З першых момантаў знаёмства мая інтуіцыя па адносінах да яго — у напружанні, у насцярожанасці. Цяпер ясна, чаму на плошчы крычаць «Шушкевича в отставку!». У крыкуноў ёсць натхняльнікі і абаронцы. Вось і рашылі ўзяцца. Ужо ўзяліся.

Пытанне аб Камітэце Дзяржаўнай Бяспекі.

Дакладчык — дэп. М. Грыб. Па дакладу разгарнуліся цікавыя спрэчкі.

Дэп. Станкевіч: Камітэт не павінен быць у веданні Прэзідыума ВС! Яго трэба неадкладна перадаць у веданне Савета Міністраў. І кропка. І ніякіх размоў! (З тым жа апломбам, як і заўсёды).

Дэп. Малашка: Усім ясна, дзеля чаго хочуць перападпарадкаваць Камітэт Саўміну. Для таго, каб запалучыць аператыўную сілу ў СМ і пазбавіць Вярхоўны Савет неабходнай інфармацыі…

І ўсё ж рашылі прагаласаваць. Раптам выходзіць Лінг. І катэгарычна патрабуе: Перападпарадкаваць Камітэт Саўміну! Абавязкова! Не драбязіце функцый КДБ. Сачыць за дзейнасцю Савета Міністраў — гэта дробязь!.

Генерал Піскароў. Рашуча за перападкарадкаванне Саўміну.

Нарэшце пачалі галасаваць. За тое, каб пакінуць, як ёсць — г.зн. за рэдакцыю Камісіі — 98 галасоў. Не прайшло. За перападпарадкаванне Саўміну — 147. Таксама не прайшло. Але больш, і на многа, чым за рэдакцыю Камісіі Вярхоўнага Савета.

Пытанне аб Грамадскіх аб'яднаннях.

Дакладчык — дэп. Вярцінскі. Даклад разумны, пераканаўчы. У Беларусі на сёння 420 грамадскіх аб'яднанняў, зарэгістраваных. (Ніколі не падумаў бы, што іх аж столькі! Во — актыўнасць грамадзян на свабодзе!) Так рэалізуюцца правы грамадзян на аб'яднанні. А ў зале — ніводнага пытання дакладчыку, ніводнай рэплікі, ніводнага выступлення! Значыць, ніякіх праблем няма. Прагаласавалі моўчкі. «За» — 178. Усяго! І ніякіх пярэчанняў не было — і не блаславілі. Дзіўны народ сабраўся ў зале ВС!

**4 чэрвеня.**

У «Розным». Дэп. Слямнёў — аб дыскусіі па Калектыўнай бяспецы. Тлумачыць талкова — у апраўданне Шушкевіча.

Дэп. Жураўлёў: падтрымлівае рашэнне ген. Казлоўскага аб звальненні з арміі афіцэра М. Статкевіча, б'е Шушкевіча за пазіцыю ў гэтым пытанні («Вас втянули!»).

Дэп. Гермянчук. Аб дамове наконт стратэгічных сіл. Калі пачаў гаварыць пра неадпаведнасць тэкстаў дамовы на беларускай і рускай мовах — у зале іранічна заа-яй-калі. Не зусім тактоўна зрабіў запыт Кебічу: «Калі не маеце — я вам дам свайго карэктара». Не зусім тактоўна па форме, а па сутнасці — зусім справядліва: павінны ж быць у Саўміне людзі, якія дасканала валодаюць беларускай мовай — каб змястоўных, сэнсавых разыходжанняў у тэкстах не было.

Дэп. Лябедзька: Чым праславіў Беларусь Карл Маркс, што яго імем названа вуліца, на якой знаходзіцца наш Вярхоўны Савет? Мінгарсавет павінен тэрмінова разгледзець гэта пытанне!

Пытанне аб справаздачы Нацыянальнага Банка.

Дакладчык С. Багданкевіч: Калі мы не спынім інфляцыю — не выйдзем з крызісу. Нашы крэдыты павінны быць дарагімі — іначай тупік, і ніякіх ілюзій. Крэдытная палітыка павінна быць больш жорсткай. У камерцыйных банках рэсурсаў — 40 млрд. рублёў. Нацыянальны Банк — не Сабес (Аддзел сацыяльнага забеспячэння). Да якога часу ён будзе іменна такім Сабесам? Не пераменім закон — наперадзе тупік і поўны крах эканомікі! Рост аплаты працы на 60 працэнтаў перавышае прадукцыйнасць працы! А ільготы? На ўсё — ільготы! Гэта ненармальна!

Утварылі камісію па кантролю за дзейнасцю камерцыйных структур. Старшынёй Камісіі абралі дэп. Лукашэнку.

**8-га чэрвеня**

У «Розным»дэп. Жук падняў пытанне аб будаўніцтве вакол Мінска і іншых гарадоў на захопленай зямлі катэджаў (дамоў, палацаў). Трэба перагледзець Зямельны кодэкс. Старшыні сельсаветаў робяць, што хочуць.

Дэп. Заблоцкі: Рэформа не ідзе. Ёсць ілюзіі, што мы рэфармуемся. Законы не выконваюцца. Развал паглыбляецца.

Спрэчкі па ўчарашнім дакладзе Багданкевіча.

Дэп. Беленькі: Нацыянальны Банк самастойнай крэдытна-грашовай палітыкі не праводзіць, — як і ў 1991 годзе, аб чым тады адкрыта гаварыў Багданкевіч.

Дэп. Лукашэнка крайне рэзка выказаўся пра падрыў эканомікі, пра нейкую незразумелую прыватызацыю. Затым — пра вайну між кіраўніцтвам Вярхоўнага Савета і Урадам. «Ад Савета Міністраў пахне мерцвячынай», — кажуць у Вярхоўным Савеце». (Шум у зале, крыкі: «Хто кажа? Назаві!») Рэпліка Шушкевіча: «Чую першы раз! Першы раз! Як можна так безадказна гаварыць?»

Дэп. Цялежнікаў: Мы думалі, нам удасца перасядзець і выйграць. Не ўдалося. Пераступілі рысу. Віна не Нацбанка. Вінавата наша эканамічная палітыка — крайне няўдалая. Трэба кардынальна змяніць падыходы — іначай к восені дамы не будуць ацяпляцца, заводы і фабрыкі масава стануць спыняцца. Трэба стымуляваць экспарт у Расію і гандаль з Расіяй. Трэба называць рэчы сваімі імёнамі. Сельскай гападарцы крэдыты выдаваць не бяздумна і не ўсім.

Дэп. Какоўка: У Латвіі рубліс, выпаўшы з рублёвай зоны, пайшоў угору. А ў нас? Чаму мы не зрабілі гэтак? Хацелі жыць за чужы кошт? Трэба сесці за стол перамоў з Расіяй і ўсё чыста выкласці. Мы не бяром ні капейкі за чыгунку, за газапровад і многае іншае. Трэба даць больш прастору прыватызацыі! — каб кожны паклапаціўся пра сябе, што ён будзе есці.

Дэп. Новік: Наш урад напорна імкнецца да дэстабілізацыі! Разам з Нацбанкам. Яны пагоршылі эканамічную сітуацыю ў краіне. Банк не кіруе сітуацыяй. Цэны выраслі на 5000 працэнтаў! Хіба гэта — не гіперінфляцыя? А хто атрымаў ільготны крэдыты? Нямногія. І несправядліва. Расія, маючы друкарскі станок для рублёў, нас душыць. Яна экспартуе інфляцыю ў нашу краіну. Наша багацце — высокакваліфікаваныя кадры. Нас рабуюць — праз фінансавую сістэму. Колькі ўвозіцца грошай з Расіі? Як кантраляваць грашовую масу? Ніяк. І яе ніхто не кантралюе. І апошняе: патрабую ўвесці беларускую грашовую адзінку! (Ну малайчына, Новік! Во каго міністрам паставіць!)…

**9-га чэрвеня**

Закон аб праве ўласнасці на зямлю.

Дэп. Гаркун (старшыня Камісіі па аграрных пытаннях): Камісія рэкамендуе замацаваць у Законе дзве формы ўласнасці: дзяржаўная і прыватная. Упершыню, калі мы абмяркоўвалі Праект на Камісіі, не было аднадушнага пагаднення.

Пачалося галасаванне (паіменнае, бо надта важнае пытанне). За прапанову Камісіі — 194 галасы. За папраўку дэп. Лакцючына (толькі дзяржаўная ўласнасць!) — усяго 41 голас. «Дзяды» атрымалі паразу.

Дэп. Жук: Вясковыя людзі ўсе супроць прыватнай уласнасці на зямлю! Надта ж лёгка мы тут ставімся да выключна важнай праблемы!

Дэпутат-ветэран Коваль: Ні ў якім разе! Ні пядзі прыватнай! Толькі дзяржаўная!

Дэп. Какоўка: Усе мае выбаршчыкі — і за прыватную. «Аддалі б нам нашы прысядзібныя кавалачкі!..»

Дэп. А. Трусаў: А ўспомніце, як бальшавікі адбіралі ў сялян зямлю! …

Дэп. Баршчэўскі: На сёння законапраект ужо састарэлы, але хоць гэткі трэба прыняць. (Састарэлы? Ужо? А які быў бы самы раз на сёння? Бальшавіцкі — з процілеглым знакам? Сацыяльны пераварот?)

Дэп. Бамбіза: Давайце ўдасканалім Зямельны Кодэкс, які ёсць! З якой мэтай мы ўводзім прыватнае права на зямлю?

Дэп. Дубоўскі: Два гады працавалі над законапраектам у Камісіі. Праз дзесяць гадоў будзе трэба яго карэктыраваць. Нічога страшнага для калгасаў у Законе няма. Тры-чатыры соткі зямлі — дайце людзям! Дайце! І ў сацыльным плане — вялікая карысць!

Дэп. Зданевіч: «Вы!.. Вы! Вы!..» — з такім абурэннем і так рэзка крычаў на дэпутатаў — праціўнікаў прыватызацыі зямлі, што ў яго адабралі мікрафон. Як вадой сцюдзёнай абдалі!..

Дэп. Гаркун: Продаж зямлі ўсё адно ідзе! Але — падпольны. Незаконны. Без дазволу дзяржавы, у абыход Закона.

Дэп. Лукашэнка: Хто пралічыў, што будзе з эканомікай, калі пачнецца купля і продаж зямлі?

Дэп. Марыніч: Увесь свет чакае, калі ён зможа ўкладаць інвестыцыі ў эканоміку Беларусі.

Дэп. Малашка: Трэба выдзяляць зоны, дзе могуць у нас купляць зямлю замежнікі, каб — не ўсюды, дзе ім захочацца, не любы ласы кавалак!..

**10-га чэрвеня**

У «Розным». Дэп. Зарэцкі: Пакуль не вызначылі, якое грамадства мы хочам пабудаваць, — няма сэнсу прымаць закон аб праве ўласнасці на зямлю. І не трэба ставіць сёння пытанне аб прыватнай уласнасці на зямлю. Гэтаксама і наконт прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці. (Правільна! Сур'езная перасцярога!)

Дэп. Сечка праінфармаваў аб стварэнні дэпутацкай групы «Згода». У групу ўвайшлі: Сапронаў, Карпенка, Марыніч, Булахаў, Даўгалёў, Драбышэўская, Сукач, Сярдзюк, Кічкайла і інш. — усяго 20 чалавек. Цікава, хто ініцыятар стварэння «Згоды»? і на якой платформе згода? Што агульнага, напрыклад, у Карпенкі з Булахавым?

Дэп. Волкаў: Калі Беларусь пакінулі стратэгічныя сілы СССР, засталіся пуставаць 150 ваенных гарадкоў. Гэта — багацце беларускага народа. Размешчаны яны ў экзатычна прыгожых мясцінах: зялёных, чыстых, упарадкаваных. Іх трэба аддаць для чарнобыльскіх дзяцей — для аздараўленчых комплексаў. Іначай гэтыя гарадкі захопяць камерцыйныя структуры. (Правільна, сп. Волкаў! Абавязкова захопяць! І не агледземся, як захопяць. Вельмі слушна сказалі!)

Працяг абмеркавання закона Аб праве ўласнасці на зямлю.

Дэп. Грынёў: артыкул аб чарнобыльцах і чарнобыльскіх землях не ўзважаны, з істотнымі заганамі.

Дэп. Скарабагацька падтрымлівае Грынёва і патрабуе артыкул зняць і дапрацаваць.

Дэп. Смоляр абвяргае Грынёва, яго заўвагі трэба абмеркаваць асобна.

Дэп. Лукашэнка: па Смоляру — дык там жывуць не людзі. Гэтага артыкула мала, трэба даць яшчэ адзін артыкул аб абароне чарнобыльцаў!

Дэпутат-генерал Гетц: трагедыя ў тым, што ўсё гэта транслюецца па тэлэ. «Товарищ Лукашенко! Или оставьте этот Верховный Совет, или перестанете заниматься словоблудством!»

Дэп. Станкевіч: Хопіць спекуляваць на чарнобыльскай тэме! Не бяры, не прыватызуй, калі забруджаная — і ўсё!

Дэп. Сасноў: Ідзе свядомая блакіроўка Закона — і толькі! Блакіроўка «чарнобылем» — каб не зрабіць хоць маленькі крок наперад да прыватнай уласнасці на зямлю.

**Працяг будзе.**

ФРАГМЕНТЫ

# АДЗІНОТА

## УРЫВАК З АПОВЕСЦІ «ПОКЛІЧ З НЯБЁСАЎ»

Павел САВОСЬКА



**Павел Піліпавіч САВОСЬКА ў студзені святкуе свой сямідзесяцігадовы юбілей. Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў і «Літаратурная Беларусь» віншуюць паважанага літаратара, жадаюць яму бадзёрасці і радасці, а чытачам прапануюць старонкі з яго новай аповесці.**

Упершыню ў сваім жыцці Андрэй атрымаў водпуск у канцы красавіка, але сапраўднай радасці на душы не было. Ды і адкуль ёй было ўзяцца? Пяцьдзясят пяць гадоў пражыў у адзіноце. Чамусьці пра гэта яму ўспомнілася толькі цяпер, калі ён прыляцеў з Чукоткі ў Менск, у сваю аднапакаёвую кватэру.

Андрэй працаваў апошнія гады ў старацельскай арцелі «Мінерал». Наперадзе яго чакаў шасцімесячны адпачынак з наступным звальненнем. Ён ляжаў у ложку і абдумваў сваё дальнейшае жыццё. Пенсіянер — нікому не патрэбны чалавек, вось хто ён цяпер.

У папярэднія гады водпуск у яго заўсёды пачынаўся ў кастрычніку, пасля прамывачнага сезону. І ён адразу ж адпраўляўся ў Санкт-Пецярбург, у свой любімы горад, дзе прайшлі яго самыя шчаслівыя студэнцкія гады.

А што ж цяпер? Паціху пачынаць збірацца ў апошнюю дарогу… Але з чаго пачынаць? З помніка, вось… Так-так, з яго самога. Бо хто пасля які зробіць і ўстановіць на яго магілку? Родзічаў нават далёкіх не было. А пакуль ёсць грошы, трэба заказаць і прывезці, пажадана ўначы, у сваю хаціну, што месцілася каля самай царквы, на ўскрайку іхняй вёскі. Дый ягоная маці-нябожчыца, царства ёй нябеснае, яшчэ калі жыла, дала два наказы: купіць аднапакаёўку, а пасля, пад старасць, прыдбаць добры помнік. Яна быццам прадчувала, што Андрэй правядзе ўсё жыццё ў адзіноце.

Кватэру ён купіў. Маці вельмі ўзрадвалася той падзеі, не раз прыязджала ў Менск, але больш тыдня ў горадзе не вытрымлівала і вярталася ў сваю хаціну.

Ён пачаў адчуваць, што жыццё імкліва заканчваецца… І аднаму Усявышняму вядома, колькі яшчэ давядзецца пражыць. Ён жа і летась, і пазалетась прылятаў у водпуск, а гадоў і тады было за пяцьдзясят, але такіх гаротных думак не было ў ягонай галаве.

Наадварот — усё яшчэ спадзяваўся на штосьці, заглядваўся на прыгожых жанчын, нават на дзяўчат. А што тут такога? Паглядзець можна, хаця б вока пацешыць…

Усявышні, калі ўжо на тое пайшло, не пакрыўдзіў Андрэя: быў ён рослы — дзесьці пад сто дзевяноста сантыметраў, нябрыдкі з твару, нядрэнна гуляў у валейбол, а яшчэ ў інстытуце выканаў нарматыў майстра спорту па самба.

Пачыналася жыццё вельмі цудоўна. Нарадзіўся ён у нядзелю трынаццатага снежня. І старэнькі святар Калінскі патрабавальна параіў назваць яго Андрэем, у гонар апостала Андрэя Першазваннага, свята якога якраз і адзначаецца ў той дзень.

Самыя доўгія гады былі ў школе. А як яе скончыў, то пачалі мільгаць адзін за адным: тэхнічнае вучылішча, армія, істытут і… размеркаванне на Чукотку.

І вось цяпер, раптоўна, пачаў адчуваць сваю нікчэмнасць і непатрэбнасць. Усё не мог адказаць на адзінае пытанне: хто павінен у ягонай адзіноце? Няўжо грахі ягоныя…

Вядома, каб ён ажаніўся ў пару, то ў яго былі б ужо дарослыя дзеці, дый унукам было б па пяцьшэсць гадоў. Зусім іншае было б жыццё, не трывожылі б такія гаротныя думкі. Усё гэта так. А тады ён разумеў: усё павінна скласціся само сабой.

Ды гады не драмалі, куды там?! Непрыкметна мільгалі, як вагоны таварняка. З Чукоткі ён пачынаў, а пасля брэндаў па свеце з рукзаком па ўсім вялікім Саюзе.

Праца ў старацельскай арцелі, дзе ён займаўся падрыўнымі работамі і геалогіяй, не давала нават на хвіліну падумаць пра асабістае жыццё. Праца па дванаццаць, а то і дваццаць гадзін у суткі знясільвала да таго, што засынаў раней, чым галава дакраналася да падушкі.

Але і ў яго былі шчаслівыя дзянёчкі, асабліва ў студэнцкія гады. А вось з дзяўчатамі не атрымлівалася. Якраз перад паездкай у будатрад выйграў першынство Ленінграда сярод студэнтаў у сярэдняй вазе, але пашкодзіў локаць. Паехалі ў Гур'еўскую вобласць, дзе ім патрэбна было пабудаваць кампрэсарную станцыю для газаправода «Бухара-Цэнтр».

Як толькі ўладкаваліся, завітаў у медпункт, дзе яго сустрэла Вераніка, студэнтка пятага курса медінстытута. Прыгожая была, як тая лялька: з кароткай стрыжкай, чарнявая, у белым халаціку. Яна ветліва і з усмешкай павіталася і загадала чамусьці распрануцца да пояса. І не магла адарваць ад яго свой пагляд.

Вераніка праслухала ягонае сэрца, выдала мазь, ён хуценька апрануўся і ледзь не подбегам кінуўся з вагончыка. Бо завядзі шуры-муры, то пасля і з атрада могуць турнуць.

А локаць так і не праходзіў. І калі ў чарговы раз зайшоў да Веранікі, каб змяніць павязку, яна сказала: «У гэтую нядзелю камандзір атрада аб'явіў выхадны, то пойдзем з табою на прагулку. Тут у саланчаках павіны быць невялікія ямкі з лячэбнаю граззю. Як толькі знойдзем, то адразу ж прыложым да локця, вось… Праз некалькі дзён як рукой здыме».

Адмовіць ёй было немагчыма. Вось там усё і здарылася… Вераніка толькі вельмі здзівілася, што ў яго дагэтуль нікога не было. Усё смяялася, што зрабіла яго мужчынам.

Пасля давялося яму і ў ейным вагончыку правесці не адну ночку… З будатрада Андрэй прыехаў да таго схуднелы, што трэнер ледзь яго пазнаў. А дзе ж ты вытрымаеш: ноч, хоць і не кожную, у Веранікі, а пасля дванаццаць гадзін на экскаватары.

Трэнер, убачыўшы такое, забараніў Андрэю падыходзіць да дзяўчат і пасадзіў на ўзмоцнены стол за свой кошт, бо рыхтаваліся да першынства Саюза. А Вераніка яму не дакучала, толькі аднойчы патэлефанавала і ў хуткім часе выйшла замуж за прафесара з іхняга інстытута.

Найбольш дакучала яму з жаніцьбай ягоная маці. Бывалі гады, што нават у водпуск яму не хацелася ехаць, вось так… Ды каб жа толькі яна дакучала, а то і ўсе суседзі…

Пасля Чукоткі не адзін раз вяртаўся «на мацярык», блукаў па Саюзе. Праца знаходзілася, а далейшае жыццё не складвалася. Інтэрнацкія пакоі надакучвалі, вечарамі, асабліва ноччу, навальвалася самота. І тады зноўку звальняўся. Так, непрыкметна, павялічваліся запісы ў працоўнай кніжцы.

І вось цяпер, лічы, дабраўся да фіналу жыцця — пенсіянер. Далей чакаць няма чаго — толькі рыхтавацца на нябёсы…

Пра свой апошні дзень жыцця на зямлі людзі стараюцца не думаць. Але ж ён настае ў кожнага з нас. А як правільна да яго падрыхтавацца?

Андрэй дзесьці чытаў, што душа нябожчыка праходзіць ажно праз дванаццаць пакутных мытняў, дзе нячысцікі спрабуюць зацягнуць яе ў пекла за грахоўнае жыццё.

Тое, што існуе іншы, нябачны нам, паралельны свет, Андрэй ведаў, бо чытаў пра многія здарэнні. А некалькі гадоў таму ехаў у электрычцы і пачуў аповед маладой жанчыны. Ёй пры родах далі завялікі наркоз, і яна амаль суткі не падавала прыкметаў жыцця — была ў клінічным стане, на тым свеце… Потым расказвала, што аніякіх нячысцікаў і нават анёлаў не бачыла. Але нечакана яе душа пачала паднімацца ўсё вышэй і вышэй і адлятала ў нябёсы. Урэшце апынулася ў вялізным пакоі. За сталом, адзін насупраць другога, сядзелі два мужчыны.

Адзін пачаў пералічваць яе грахі з сямігадовага ўзросту. Нагадаў ёй, што ў першым класе яна ўдарыла гачкай сваю сяброўку па спіне. І што дзіўна — яна добра памятала той выпадак.

А вось другі мужчына за яе заступаўся: казаў, што яна часта хадзіла ў царкву, спавядалася, дапамагала людзям у бядзе.

І так яны пералапацілі яе жыццё да апошняга дня, як трапіла ў радзільны дом. А пасля яна азірнулася і ўбачыла за сваёй спіной усіх памерлых родзічаў. Тут яе чакала самае непрыемнае: усе яны пачалі яе папракаць, што мала моліцца за іх. За апошні год толькі адну запіску падала ў царкву, каб бацюшка памаліўся за іх душы, бо тады ім даецца, хаця і невялікая, але палёгка…

А калі яе душа вярнулася ў цела і яна апрытомнела, то вельмі ўзрадвалася, і хлопчык нарадзіўся здаровенькі. А ў канцы дадала, што цяпер памерці не баіцца, але крыху палохае сустрэча на нябёсах з родзічамі.

Канечне, паміраць нікому і ніколі не хочацца. І хаця паміраюць усе: і багатыя, і бедныя — гэтая акалічнасць мала суцяшала Андрэя.

І яму чамусьці цяпер згадаліся апошнія месяцы жыцця бабулі Наташы. Ішоў ёй тады дзевяноста сёмы год. І за ёй прыглядвала ягоная маці, а Андрэй працаваў непадалёку на кар'еры.

Бабуля ніколі не хварэла, але з гадамі стала паступова слабець. Ледзь рухалася па хаце, а потым і зусім злегла. Андрэй кожны дзень да яе наведваўся, бо бабуля жыла ў сваёй хаціне, да іх пераехаць не захацела, хаця адлегласць між вёскамі была не больш двух кіламетраў.

Калі Андрэй прыходзіў, яна старалася штосьці расказаць са свайго гаротнага жыцця. А гора хапала. І пры кожнай сустрэчы казала, што паміраць не баіцца, бо ўжо нажылася. Потым перастала прымаць ежу, нават ад малака адмовілася. Аднойчы маці сказала: «Памрэ твая бабуля. Нічога ў рот не бярэ». І вось познім зімнім вечарам яна нечакана ўзяла ягоныя рукі ў свае, пачала іх гладзіць, а пасля ледзь чутна прамовіла: «А мой жа ты Андрэйка! Уратуй мяне, грэшніцу! Я вельмі не хачу паміраць!»

Яму да таго стала шкада бабулю, што ў адно імгненне вочы набрынялі слязьмі. Ён як змог пачаў яе суцяшаць, а сам, зірнуўшы на вобраз Божай Маці, што вісеў у куце, пра сябе прамовіў: «Уратуй маю бабульку. Вазьмі з майго жыцця колькі хочаш гадоў і перадай ёй!».

І адразу ж у яго ўзняўся настрой. А потым бабуля папрасіла цёплага малака з булкай. А калі раніцай прыйшла ягоная маці, то вельмі здзівілася, калі ўбачыла бабулю на сваім любімым месцы ля вакна.

«Раздумала я паміраць, мая ты дачушка», — прамовіла яна і ўсміхнулася.

Цяпер Андрэй ужо і не памятае, колькі гадоў пасля таго пражыла бабуля. А пакінула гэты свет, як і хацела — у самую глухую восень. Да сваёй бабулі Андрэю было далёка, бо тая малілася ўсё жыццё, а ён толькі цяпер пачаў заглядваць у малітоўнік і хоць зрэдку хадзіць у царкву.

Спачатку ездзіў у Сабор, а мінулым летам пабудавалі ў Малінаўцы драўляную царкву. Тут ён ужо бываў часцей, бо вельмі прыгожая была царква: цёплая, светлая, утульная. Ён любіў заходзіць сюды вечарамі ў буднія дні, калі людзей было значна менш, чым у святы. Купляў тры свечкі і займаў месца непадалёку ад уваходных дзвярэй. Слухаў, як спяваў дзесьці хор на верхатуры, як маліўся малады святар, ды думаў пра сваё недарэчнае жыццё.

Прыходзіў у сваю кватэру, укладваўся ў ложак, а ад думак зноўку не мог абараніцца. Канечне, трэба было штосьці рабіць, каб гэтыя гаротныя думкі ўрэшце пакінулі яго.

І тут зноўку, быццам з нябёсаў, прагучалі словы маці: «Закажы і ўстанаві помнік, бо пасля ніхто гэтага не зробіць. А суседзі пахаваюць!».

Заказаць помнік цяперашнім часам, ды яшчэ пры ягоных грашах, было без праблемы. Але тут яшчэ адна думка закралася ў ягоную галаву і не давала спакою: калі ён установіць помнік, а сам такі яшчэ моцны і дужы, то ці не дасць ён гэтым повад Усявышняму, каб забраць ягоную душу датэрмінова на нябёсы?..

Колькі кожнаму наканавана пражыць, ніхто не ведае, а вось заняцца падрыхтоўкай у апошнюю дарогу трэба абавязкова. Бо што нас чакае на нябёсах? Магчыма, што і сапраўды патрэбна будзе трымаць адказ за дрэнныя ўчынкі ў сваім жыцці. А калі так, то трэба зрабіць як мага больш добрых спраў. Але якім чынам?

Вось паспрабуй цяпер і засні пасля такіх думак… Чамусьці нават летась яны не прыходзілі ў галаву. Тут яшчэ адна бяда: ён нічога не дасягнуў у сваім жыцці. Хто пра яго пасля ўспомніць ды памяне добрым словам? І не ў пасадзе тут справа. Шкадаваў толькі, што не займаўся любімай справай.

А кім бы ён мог быць? З дзяцінства марыў стаць вайсковым лётчыкам. Пасля дзесяцігодкі і адправіўся ў Качынскае вучылішча, але не пашанцавала: медыцынскую камісію прайшоў на выдатна, а экзамены не здаў.

Здаецца, што было гэта зусім нядаўна, а мінула ўжо амаль сорак гадоў. Праўду казалі святыя айцы — зямное жыццё праходзіць імгненна: не паспее чалавек азірнуца, а ўжо трэба рыхтавацца ў апошнюю дарогу…

І што цікава: колькі б чалавек ні пражыў — нават больш ста, а ўсё адно яму мала.

І што цікава: колькі б чалавек ні пражыў — нават больш ста, а ўсё адно яму мала

ВЕРШЫ

# І БУДЗЕ РАНАК

## РАДАСЛОЎНАЯ РАДАСЦЬ

*«Мы, смелыя Панізнікі,*
*яднаем кантыненты!»*

Такімі радкамі заканчваецца мой верш «Радаслоўная радасць»:

*Разбегліся Панізнікі*
*па свеце як па садзе.*
*Адны — на волі лісіцкі,*
*другія пры пасадзе, —*

*як Паўлавіч у Нерынгры,*
*Альгерд у польскім сейме…*
*…Траплялі мы і ў нераты,*
*але не знікла семя!*

*Аўстралію да Юрмалы,*
*Гурон да Селігера*
*прышвартаваў не юр малы, —*
*багіня шлюбаў Гера.*

*І Полацак, Бігосава,*
*Лявонпаль, Мёры, Дрыса*
*нясуць да бога босага*
*Панізнікаў абрысы.*

*Мне з Мётлаў акушэрачка,*
*Юрыст — мінчук фарсісты, —*
*галінкаю ці жэрдачкай*
*на Дрэве прамяністым.*

*З антычным Панам ветласці,*
*заможжа, непакоры*
*нам быць раднёй у еднасці,*
*апораю — у зморы.*

*Хай схопяць і капрызнікі*
*край радаводнай ленты:*
*– Мы, смелыя Панізнікі,*
*яднаем кантыненты!*

Верш прысвечаны маім аднафамільцам. А Панізнікі жывуць у ЗША, Канадзе, Латвіі, Расіі. Былі і аўстралійскія. Многа іх у Польшчы. Там жывуць, як перадала спадарыня Эва, Панізнікі, Панізнікі, Паніжнікі. Яе прозвішча значыцца так: Poniznik. Бацькі Эвы выехалі ў Польшчу з майго роднага Мёрскага раёна Віцебскай вобласці ў 1957 годзе. Жылі пад Ідолтай.

У малітоўных кнігах на сербскай і харвацкай мовах значэнне «poniznik» можна перакласці так: паслушнік.

Эва Панізнік нарадзілася 5 студзеня 1988 года. Жыве паблізу Гданьска. Працуе журналістам. Пасля сканчэння факультэта польскай філалогіі Гданьскага ўніверсітэта займела навуковую ступень бакалаўра. А цяпер вучыцца на другім курсе рускай філалогіі.

Мне было прыемна і павучальна перакладаць вершы Эвы з польскай мовы. Эва родпасная мне і па прызванні, і па суайчыннасці. А хто заахвоціцца глыбей пазнаць творчасць таленавітай Эвы, можа зайсці на сайт www.zabawyslowem.blog.interia.pl

**Сяргей Панізьнік**



**Эва ПАНІЗНІК**

### Непранікальныя

*нялюдска*
*людскі*
*вагон*
*перапоўнены*
*спустошанымі*
*людзьмі*

*іх душы*
*затрымаліся*
*на папярэдніх*
*прыпынках*

*постаці іх*
*зняволіліся*
*ў нямых*
*абдоймах*
*эгаізму*

*і толькі*
*сляза*
*на тварыку*
*маленькай*
*дзяўчынкі*
*указвае*
*накірунак*
*збавення*
*і будзе*
*ранак*

**18.11–1.12.2009**

### Анёл

*анёлы надземныя*
*маюць*
*звычайны выгляд*

*павекі*
*у іх прыпухлыя*
*ад працы*
*начнога дзяжурства*
*далоні*
*ускладзеныя*
*на цела*
*асобы*
*каторую аберагаюць*
*іх вясны*
*прызначаныя*
*для прамаўлення*
*замілаванасці*

*калі не знаеш*
*дарогі*
*ідзі*
*наперадзе сябе*
*адважна*
*і зрэдчас*
*спыніся*
*затрымайся*
*каб ненарокам*
*не перашкодзіць*
*цуду*

**23.12.2009**

### Падарожжа

*чатыры месяцы*
*і багаж*
*дасведчанняў*
*не кволіць*
*валізка боўтаецца*
*ад дзесяці цырконіяў*
*яны ўсміхаюцца*
*і ўзбуджаюцца*
*на сардэчным пальцы*

*калі мы моцныя*
*без ашуканстваў*
*далікатнасцяў*
*не знішчаць нас*
*заснежаныя атакі*
*фальшывых прарокаў*
*антыпаэтаў*

*вунь падманы ад'ехалі*
*брудным вагонам*
*другога класа*

*атмасфера чыстая*
*увахodзім*
*у вясну*
*жыцця*

**26–29.03.2010**

### Антыканцэпцыя

*дзе ёсць мяжа*
*вытрыманасці людской*
*ці яшчэ можна яе*
*выграбсці*
*з-пад смецця*
*параскіданых усюды*
*паклёпаў*

*а неспадобныя думкі*
*не змякчаюцца*
*ў абдоймах*
*запоўненых перонаў*
*абязлічанай свядомасці*

*калі скончыцца ўражлівасць*
*сляза грэшнага анёла*
*затопіць і прычэплены*
*вагон з рэстаранам*

*з той пары бяздушныя*
*машыністы не будуць*
*жывіцца*
*збэшчанымі тулавамі*
*крыўдаў людскіх*
*удушыць іх*
*ванітоўная рэшта*
*папрокаў сумлення*

**30.03.2010**

### За шклом

*у памарачэнні*
*застыглых сходняў*
*ценямі*
*шаруем шыбы*

*неабазнанага*
*неўсвядомленага*
*жыцця*
*па-за касніком*
*фіранкі*

**17.07.2010**

### Зламаны прамень

***Ніводны прамень сонца не гасне,***
***але зелень, якую ён абуджае, патрабуе***
***часу, каб узрасці.***
***А. Швейцэр***

*зноў мне пашчасціла*
*выявіць свой*
*узыход сонца*
*адхінуўшы залеву*
*якая аблажыла выспу*
*тымчасовай надзеі*

*зноў пачуваюся*
*маладзей*
*на некалькі*
*няспраўджаных планаў*
*змененых высноў*
*патрэбных падзенняў*
*пералётных*
*абвестак*
*без*
*сораму*
*і штораз радзей*
*прыпамінаю сябе*
*бо так баюся*
*цемрадзі*

*без цябе*
*з-за цябе*

*згасну*

**29.10–25.11.2010**

### Зладзейка

***Калі Табе пры выпадку***
***будзе патрэбным***
***маё жыццё, прыйдзі і вазьмі яго.***
***А. Чэхаў***

*прыпомнілася*
*як нетутэйшы джын*
*з амаль што пустой бутэлькі*
*наталяў смагу*

*глыт злачынны*
*амнезіі з наўмыснасцю*
*несумненна*
*прыблізіць мяне да*
*спакушэння*
*на ейным баку ложка*

*мой водар крадзецца*
*як той прыблуда*
*да акрайчыкаў*
*тваіх веснаў*

*прыкрытая яе коўдрай*
*шэпча табе чулае слоўка*
*аб вечным каханні*
*ў краіне ўтопіі*
*так ёсць заўжды*
*неспадзяванне*
*па праўдзе*
*фільм абарваны*
*скраду яе ноч*
*пазбаўлены жарсці*
*не хочацца каб сурочыла*
*юнацкіх*
*мрояў*
*катэгарычная*
*рэчаіснасць*

**3.12.2010**

**Пераклаў з польскай Сяргей Панізьнік**

РАЗВІТАННЕ

# НЕ ПАКІНЕ НАС…

**28 снежня загінула Тацяна Сапач, паэтка, журналістка, перакладчыца. Спачыла ў жыцці вечным…**

З мужам Сяргеем Дубаўцом яны трапілі ў аўтакатастрофу — на тэрыторыі Літвы, пад Алітусам. Вярталіся ад дачкі, якая нядаўна падарыла ім унучку...

Тацяна Сапач нарадзілася 26 жніўня 1962 года ў вёсцы Маркава на Маладэчаншчыне.

Ад часу паступлення ва ўніверсітэт далучылася да руху за незалежнасць. Была ўдзельніцай першых падпольных незалежніцкіх студэнцкіх гурткоў. Там і пазнаёмілася з Сяргеем. Гэта была гісторыя вялікага кахання на фоне вялікай гісторыі.

Разам яны пераехалі ў Вільню, каб аднавіць віленскі беларускі асяродак. Сапач была адной з аўтарак эпахальнай «Нашай Нівы» пачатку 90-х. Яна была рэдактаркай і аўтаркай праграмы «Віленскі сшытак» на Літоўскай нацыянальнай тэлевізіі (з 1991).

У 1992 годзе выйшаў яе зборнік паэзіі «Восень», які зрабіў Тацяну ўлюбёнкай аматараў паэзіі. Яе вершы ператварыліся ў песні гурту «Новае неба».

У 2008-м паэтка ўбачыла свой другі вершаваны зборнік «Няхай не пакіне нас восень» (беларускамоўныя арыгіналы і пераклады па-ангельску). Другі — і апошні. І сёння яго радкі прыходзяць да нас — як з вечнасці. Ахінаюць пяшчотай, мілатой, шчырасцю, пранікнёнасцю — і горкай прароцкасцю. Як, напрыклад, гэта: «Надыдзе снежань, і аднойчы… // я раптам анічога не пазнаю: // адменіцца і дзень, і свет, і дом». Нібыта ў сваім паэтычным адкрыцці прадчувала паэтэса той трагічны снежань…

Ніжэй, разам з вянком згадак-развітанняў з Тацянай яе бліжэйшых сяброў, «Літаратурная Беларусь» вырашыла яшчэ раз паслухаць-перачытаць са сваімі чытачамі ейныя вершы.

Няхай не пакіне нас Таніна Слова…



## Алег АБЛАЖЭЙ

### ПЛАЧ ПА ТАЦЯНЕ

Калісь вясковыя кабеты галасілі, абняўшы халодны жвір.

А мы — іншыя. Унутры толькі нямая бясслёзная пустэча.

Цяжка гаварыць, бо няма словаў.

Цяжка маўчаць — бо невыносна.

Бо хочацца задаваць пытанні невядома каму, ведаючы, што адказу не атрымаеш ані ты, ані хто іншы.

Нейкае безаблічнае, нябачнае і нячутнае зло забірае, выкошвае, — найлепшых.

Найсвятлейшых.

І згушчаецца цемра — і наўкола, і ў табе.

Якой жа светлай асобай была Таня — пачынаючы ад усмешкі і канчаючы паэзіяй.

Якая застанецца назаўсёды — бо там не было ані лішніх, ані няшчырых словаў.

Апошнія гады ёй не пісаліся вершы.

Так бывае ў сапраўдных паэтаў.

Паэт — сакратар Бога.

І піша толькі пад ягоную дыктоўку.

Але неяк у адной з апошніх гутарак яна прызналася, што ў яе — ці ў ёй — штосьці зноў пачало зараджацца.

Можа, таму, што ў гэты час яе дачушка чакала нараджэння свайго першага дзіцяці.

Ды мы ўжо ніколі не прачытаем новых вершаў Тацяны Сапач.

Зрэшты, сваім найлепшым вершам была яна сама.

На жаль, мы зможам карыстацца толькі паловай з таго, што яна напісала.

Бо назаўжды змоўк той голас, які найлепей гэтыя вершы чытаў. Так, як не прачытае ніхто іншы.

Сам яе голас быў як лекі. Як яго акрэсліць, з чым параўнаць — невядома.

Але яна ўмела не толькі гаварыць, але і слухаць. Колькі сяброў выгаварыла ёй свае беды і клопаты.

І — рабілася лягчэй.

Як жа многа яна ўмела! Умела цешыцца жыццём — і не таму, што яно было такое шчодрае для яе.

Проста яна ўмела тварыць радасць з таго, што было пад рукой.

Як жа смачна і весела з ёю — і ў яе — елася-пілося! Бо і стравы, згатаваныя ёю, былі паэзіяй.

А яшчэ яна ўмела — бачыць. Толькі той можа стварыць добры фільм ці тэлеперадачу, хто не проста мае добры зрок, але і ўмее глядзець.

І мы мелі магчымасць бачыць свет вачыма Тані. І дзівіліся ягонай красе.

Бо яна ўмела знаходзіць прыгажосць. Недарма Таня так любіла кветкі.

Як вядома, ёй найбольш была даспадобы восень. Але чаму яе вобраз лучыцца з вясной, з раннім летам?

Блізкім ёй людзям не перастане балець ніколі.

Безумоўна, яна застанецца жыць у памяці. Але чаму, чаму ёй было дадзена так коратка жыць проста сярод каханых асобаў, сярод сяброў і кветак?

## Сяргей НАВУМЧЫК

Наш курс быў, напэўна, адным з самых моцных курсаў журфаку — назаву Ігара Германчука, Сяргея Дубаўца, Барыса Сачанку (Пятровіча), Радзіслава Лапушына. Я ўспрымаў Тацяну як самую таленавітую дзяўчыну на курсе, але таленавітымі здаваліся ўсе, а вось Таня вылучалася з усіх нейкай надзвычайнай дабрынёй і пры гэтым — сумленнасцю і прынцыповасцю (яна была адзінай, у якой, напрыклад, не паварочваўся язык папрасіць нешта спісаць на іспыце). І за трыццаць гадоў не здарылася нічога, што магло б змяніць гэтае ўражанне і гэтае вельмі цёплае да яе стаўленне. І мы, раскіданыя па свеце аднакурснікі, у гэтыя дні разам з Сяргеем, з Адэляй і з роднымі Тацяны.

## Жана ЛІТВІНА

Наша з ёй знаёмства адбылося больш за дваццаць гадоў таму. Тады маладая таленавітая журналістка прыйшла на радыёстанцыю «Беларуская маладзёжная». Яна прынесла ідэю сваёй аўтарскай праграмы, якая звалася «Альбаросіка». Гэтае знаёмства і супраца з Тацянай якраз супалі з вельмі гістарычнымі падзеямі ў нашым грамадстве. І вось Тацяніна ўменне адчуць нерв, адчуць тую хвалю пераменаў, якая ішла, і прапанаваць у сваёй праграме інтэлектуальны падыход да асэнсавання ўсяго таго, што адбываецца, — гэта было неверагодна важна для слухача, неверагодна важна для тых людзей, якія былі побач з Тацянай.

## Сяргей ХАРЭЎСКІ

Так выйшла, што першае маё драматычнае спатканне з Таняй і баявое хрышчэнне атрымалася на гарышчы Палаца спорта ў Вільні, калі невядома было, чым скончыцца змаганне Летувы за сваю незалежнасць, і адтуль вяшчала недзяржаўнае нелегальнае радыё. Таня прымала ў ім чынны ўдзел, заклікаючы беларусаў Літвы падтрымаць незалежнасць, Летуву ў яе шляху да свабоды. А потым, як усё стала на свае рэйкі, летувіскае тэлебачанне запрасіла Таню рабіць перадачу для беларусаў Летувы. Гэтай перадачы «Віленскі сшытак» нядаўна споўнілася дваццаць гадоў.



Фота Д. Раманюка

## Сяржук ВІТУШКА

Яна ўжо так выштукоўвала кожную перадачу, так сумленна ўсё пераглядала, кожную секунду, не дазваляла сабе абы-як зляпіць. Так прыемна было працаваць з ёю. Гэта проста свята было кожны дзень. У канцы лета мы святкавалі дваццаць гадоў гэтай беларускай тэлеперадачы. Там Таня была каралевай. Яна запрасіла на гэтую перадачу многа людзей, і многа людзей працавалі з ёю. Ёй цікава было сабраць розных людзей. Яна была паэткай у сваіх перадачах. Якія яна прыгожыя рабіла перадачы! Гэта трэба ўсё захаваць і выдаць кнігу ейнай тэлевізійнай паэзіі.

## Алена РАДКЕВІЧ

Адна з лепшых беларускіх тэле- і радыёжурналістак. Надзвычайная мелодыка голасу, процьма густу, уласны ракурс і не прыблізныя словы. Вязьмо беларускай мовы было ў яе паэтычным у любым, нават самым сухім журналісцкім жанры. Зрэшты, яна і рабіла мастацкую журналістыку.

Інтэлігентнасць. Ніколі — зласлоўе, калі трэба было кагосьці паставіць на месца — густоўная іронія. Мудрасць.

А як спявала! Як яны спявалі ўдвох з Сяргеем...

Яе тонкую ўзнёслую паэзію нярэдка параўноўвалі з вершамі Ахмадулінай. Сёлета не стала абедзьвюх Паэтак.

## Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

Глыбока смуткую. Выказваю спачуванні найперш Сяргею Дубаўцу ад імя ўсіх колішніх «Тутэйшых».

Перагортваю выдадзены ў тагачасным маім выдавецтве БАДППР першы Тацянін паэтычны зборнік «Восень»...

Жалоба, скруха, боль...

## Алесь СУША

Сустрэліся з Таняй гэтым летам зноў пасля больш 15-ці гадоў, як не бачыліся і нават не гаварылі. А сябравалі яшчэ з пачатку 1980-х, лічы, яшчэ столькі ж. Ад самага пачатку.

Размаўлялі, доўга хадзілі па парку і не маглі развітацца.

Яна сваёй ціхай ветласцю ўмела палагодзіць і паяднаць нават тое, што і паяднаць ужо, здаецца, немагчыма.

Планавалі сустракацца часцей, на наступныя Купаллі, Каляды. Вялікі смутак...

## Ірэна ПАПУРЭНКА

Зіма. Калядны вечар. Мы вяртаемся з рэпетыцыі «Майстроўні», Тацяна чытае свой новы верш. Верш пра каханне-спатканне… Ідучы па марозных менскіх вуліцах да інтэрната БДУ, мы марым з Ёй, што ў Новым 1981-м Годзе будзем улюбёныя і шчаслівыя, а яшчэ мы ў гэты сцюдзёны вечар размаўляем аб тым, што нашыя хлопцы, якія пакахаюць нас, абавязкова будуць казаць і спяваць нам пра свае пачуцці на роднай мове. Праз некалькі гадоў магія калядных дзявоцкіх летуцценняў здзейснілася — Тацяна стала жонкай Сяргея Дубаўца. Неба склала Саюз з двух магутнейшых Талентаў нашага Адраджэння.

Трымайся, Сяргей! Ты патрэбны ўсім сваім родным і сябрам, ты патрэбны ўсім нам, ты патрэбны Бацькаўшчыне і Ёй, Тацяне, якая пакінула цябе тут на гэным свеце, каб Ты апякаваў Вашых дачку і ўнучачку. А Яна ўзнеслася на Нябёсы, каб застацца ў нашых душах недасягальнай Зорачкай, бліскучай і нязгаснай!

Веру і не веру, што больш тут не пабачымся ніколі… Дзякуй Табе, мая дарагая, за ўсё, што ты зрабіла для мяне. Да сустрэчы, аднак цяперака ўжо не ў гэтым вымярэнні…

## Алесь ШПАКОЎСКІ

*Ты так рана зыходзіш, Таня…*
*Дадаецца сляза ў рэчку жыцця.*
*Прыгажуня, ты несла паўстанне кахання*
*Сярод халоднай абстрактнасці пачуцця.*

*Мы не шмат сустракаліся, размаўлялі,*
*Але твой горды агеньчык*
*Ускалыхваў абыякавыя радыёхвалі*
*На той грані, дзе вечнасць.*

*Акрыляе Радзіма-любоў твая, Таня,*
*Праз узнёсласць, што ты пранесла.*
*Паэтка, асоба не мае растання*
*З хорам нацыянальнай песні.*

ВЕРШЫ

# «НАДЫДЗЕ СНЕЖАНЬ, І Я РАПТАМ АНІЧОГА НЕ ПАЗНАЮ»

Тацяна САПАЧ



***

*О, час пераможных шэсцяў —*
*крышацца брукі ад маршаў!*
*Як не вітаць гэту музыку*
*сусветнае мітусні!..*
*Пара апантанага плёну —*
*збірайцеся і збірайце!*
*Як не вітаць гэту музыку!..*
*— Мне больш даспадобы дождж…*
*Складзены стрэлы Феба,*
*і звініць, цяпер беспатрэбная,*
*павуціны цяціва між дрэў…*
*Няхай не пакіне нас Восень!*

## Зімовы верш пра любоў

*Калі залямантуе завіруха*
*і спатыкнецца ў чыстым полі вецер,*
*і стане чорна ў белым-белым свеце,*
*і я пачую ў дзверы ціхі стук…*
*Чакайце! Будзе ўсё інакш —*
*спачатку*
*я шчыльна аканіцы зачыню,*
*на сем замкоў замкну цяжкія дзверы,*
*згашу святло і радыё прыцішу,*
*прыціснуся да цела цёплай грубкі —*
*а ўжо тады пачнецца завіруха,*
*і я пачую гэты ціхі стук…*
*Там будзе добры сябра мой стары,*
*здарожаны, скалелы і галодны, —*
*як мятлік, да майго прыб'ецца дому,*
*і ля дзвярэй, на сем замкоў замкнутых,*
*пачне марудна, як свяча, канаць.*
*І Божа мой, які чароўны будзе вечар! —*
*то стук, то стогн парушыць цішыню,*
*завершыць зык мелодыі пра вечнасць,*
*штурхне істоту у хаос любові*
*і жудаснай пакуты чалавечай!..*

## Савелію

*Вядома, мілы дружа, я жыву*
*у доме, дзе ўсё здаецца дзіўным:*
*сюды не залятаюць матылі*
*і ластаўкі пад вокнамі не лепяць*
*сваіх, нібы шкарлупкі, крохкіх гнёздаў.*
*Калі засохла бедная герань,*
*я выкінула з клеткай канарэйку,*
*затое згатавала тлусты крупнік,*
*яго прасіў прад сконам грозны муж.*
*Вядома, мілы дружа, тут няма*
*партрэтаў у цяжкіх драўляных рамах,*
*замест сцягоў лунае на гаўбцы*
*блакітная самлелая бялізна,*
*а слуцкі габелен праела моль.*
*Сюды ўначы завітвае хвароба*
*і носіць па кутах тэмпературу,*
*і пакідае па сабе салодкі пах*
*цім'яну, валяр'яны і нуды.*
*Вядома, дружа, вам утульна тут —*
*вы мне зямляк*
*ці колішні знаёмец, і мой адповед вам*
*ня будзе дзіўны:*
*я не люблю вас.*
*Я люблю Шапэна.*

## Сястра

*Даўно за поўнач. Самая пара.*
*І я свайму здарожанаму брату,*
*не верачы ні слугам, ні сябрам,*
*сама гатую горкую гарбату.*
*Ён мне чужынец, і яго сцяжыны*
*далёка ад дарог, дзе я іду.*
*Ён сёння госць. І сёння ён спачыне,*
*я не наклічу на яго бяду,*
*і буду ноч стаяць прад абразамі,*
*абы спакойны быў ягоны сон —*
*любоў і ціша стануць паміж намі,*
*і не ачнецца аніразу ён.*
*І раніцай, пасля чароўнай кавы*
*і недарэчных развітальных слоў,*
*амыю твар сляпой слязой гаркавай*
*і блаславлю юначае чало.*
*Калі ж пам'рэ ягоных крокаў рэха —*
*збяру сяброў і самых верных слуг:*
*хай поўняцца лясы і пушчы брэхам,*
*і апануе свет гарачы рух.*
*Тады — ляці услед, мая пагоня!*
*І утапчы ў забраную зямлю*
*таго, хто кінуў гэты лес і гоні,*
*таго, каго любіла і люблю.*

***

*Надыдзе снежань, і аднойчы ранкам*
*я раптам анічога не пазнаю:*
*адменіца і дзень, і свет, і дом —*
*і я сябе, напэўна, не пазнаю…*
*Я азірнуся, і убачу люстра,*
*і занатую: там жыве павук;*
*ён дзень і ноч бязбожна выплятае*
*бязважкія карункі і узоры*
*на твары тонкім, чыстым*
*і ўрачыстым,*
*знаёмым мне — і, можа быць, маім…*
*І я яго пазбаўлю асалоды*
*змяняць такое дзіўнае абліччча,*
*і я прыцісну мастака да рамы —*
*брунатнай рамы, грубай і старой.*
*Што будзе потым? —*
*будзе ведаць снежань,*
*які пабеліць мой самотны дом*
*і намалюе ў люстры павука,*
*што дзень і ноч бязбожна выплятае*
*бязважкія карункі і узоры*
*на твары тонкім, чыстым*
*і ўрачыстым,*
*знаёмым, так… — і, можа быць, маім…*

## Адзінота

*О, гэта ноч!.. Стамляюцца змяняцца*
*сляпыя вочы вечных светафораў.*
*І аціхаюць шолахі шалёных,*
*з апаленымі крыламі, мятлух,*
*і ўладны над дарогай павадыр*
*няшчаснага вандроўніка-нябогі*
*са смехам і шкадобаю камечыць*
*ручнік, што звязваў рухі іхніх рук…*
*О, гэта ноч!.. І заміраюць шэпты*
*Шчаслівых і зняможаных каханкаў,*
*і прачынаецца і тут гасцюе сон.*
*І зараз мне няма куды спяшацца —*
*падлічаны ўчора страты ловаў,*
*і меч яшчэ не высах ад крыві,*
*і, значыць, можна жыць цяпер спакойна.*
*Да часу! Будзе дзень і будзе дзея,*
*і той, хто быў сляпы, відушчым стане,*
*і будзе наш нябога ўладаром…*
*А толькі мне няма куды ісці,*
*і ўжо даўно няма куды ісці —*
*там*
*нехта ёсць,*
*і я яго баюся.*

***

*Так, невыносна жыць на гэтай зямлі, калі без*
*цябе і крыху іранічных вершаў пра бэз,*
*ані да цябе непадобных і нават да*
*мяне ані не падобных, а толькі, бадай,*
*да нашых з табою магчымых дзяцей,*
*якім таксама — шкада… —*
*не будзе прасцей*
*на гэтай зямлі.*
*Яна — па звычцы — завецца нашай,*
*а звалася некалі белай… Ідзіце на!.. шай-*
*таны, паскуды, крывыя, рагатыя, гады,*
*свінні, якім даўно нічога «ня нада»,*
*абы вакол штурхаліся, жэрлі такія ж свінні…*
*О, невыносна яшчэ… без Вільні.*

***

*Заміж сцэнаў і столі тут —*
*вецер і снег,*
*заміж свечак калядных —*
*ваўчыныя вочы…*
*Божа мой, калі ёсць Ты на свеце —*
*то дзе?*
*І чаму гэтай роспачы бачыць не хочаш?*
*Хто зламыснік,*
*які падказаў накірунак*
*гэтым лёгкім маім,*
*але здрадлівым іртам?*
*Толькі вецер і снег…*
*І адзіны ратунак —*
*гэта вочы ваўчыныя*
*з бляскам нясытым.*

***

*Дзень добры, мой самотны новы дом!*
*Будзь госцяю, сястра, сяброўка — Восень,*
*заходзь, сагрэйся… там фатэль і плед,*
*і разам прычакаем белых часаў…*
*Пакуль ва ўладзе Снежня-рудафоба*
*не апынуўся заваконны свет,*
*згадаем словы самых сумных песень,*
*адновім яву самых мілых сноў.*
*Як соладка ўзірацца ў агонь*
*апошняй трапяткой пахучай свечкі —*
*і бачыць дзень мінулы і наступны,*
*і ведаць: наша права — зараз, тут,*
*і толькі так!.. І полымя не рушыць*
*вялікай таямніцы напаўзмроку.*
*Адзіным — ноччу — станусь дол і неба.*
*Адзіным — жалем — станем мы з табой.*

## Арлянятам

*Ляціце да сонца,*
*ляціце да мора —*
*няма іначшага выйсця,*
*ляціце, калі вам дадзена Богам,*
*а мне пакіньце маё:*
*неба ў брыджах заходу,*
*смяротна чыстае поле,*
*чорны крыж на дарозе*
*ды ўрослы зялёны валун…*
*О, я ніколі не ўбачу*
*асветленых далягляду —*
*я тут, дзе вякую ўпарта,*
*аднойчы ўрачыста пamру.*
*І здарыцца гэта пад вечар,*
*і неба ў брыджах заходу*
*нальецца дзікай крывёю,*
*апошнім промнем міргне —*
*як вока забітага воя,*
*салодкае свежае вока,*
*што стала маёй вячэрай,*
*як ён ля крыжа сканаў…*

***

*Калі ўдача цябе пакіне,*
*і жана дарагая, і дочка,*
*за гарой застанецца Вільня,*
*за гарою прачнешся аднойчы*
*у пакоі, між мяккіх цацак*
*і вясёлых, з карцінкамі, кніжак.*
*Нешта можа заўжды заставацца*
*Для жывых. І для іншых.*

АБРАЗКІ

# ПЯРСЦЁНАК



Анастасія ЛАЗЕБНАЯ

## Калі паветра пахне сырадоем

Ён навылёт ведае гэтую дарогу, якая кідаецца ўбакі, перарываецца, быццам стужка, і зноў з'яўляецца пад нагамі, выбітая вузкімі коламі. Вёска з шаснаццаці хатаў нібы губляецца сярод хмызнякоў, невялікага змешанага лесу, узгоркаў. Каб знайсці яе, трэба прайсці добрыя два дзесяткі кіламетраў ад бальшака.

Вайсковец ідзе не спяшаючыся. Радуецца кожнаму пройдзенаму метру. Пільна ўглядаецца ў твары людзей, якія сустракаюцца. Пазнае і не пазнае, як, дарэчы, і яго. Вітаецца з кожным.

Колькі ён не быў тут? Шмат. Як памерлі бацькі, прайшлі гады. З таго часу як адрэзаў дарогу. А цяпер пацягнула.

— Няўжо старасць ці настальгія паклікалі ў дадому? — ідучы думаў палкоўнік.

Не заўважыў, як перад вачыма вырасла вёска. Хаты схаваліся ў восеньскай лістоце. Толькі дахі ды коміны, з якіх вырываўся дым, падсоўвалі свае бакі пад сонца. Палічыў роўныя слупы дыму. Іх было восем. Восем жывых дамоў. А астатнія? Ён даведаецца і пра іх, калі пойдзе па вуліцы.

Вуліца. Яе практычна няма. Засталася толькі сцежка, як валасок, прабітая нетаропкімі і слабымі нагамі. Ні брэху сабак, ні звонкіх пеўневых галасоў. Пустэча. Нешта сціснула грудзі. Часцей застукала сэрца, калі дайшоў да свайго паселішча. Жытла не было. Ад яго застаўся падмурак, ды там-сям валялася трухлявае паленне, якое суседзі не паспелі расцягаць, далей — здзічэлы бацькаў сад. Яшчэ раз абвёў вачыма ўсё, і быццам токам прабіла. Прысеў на першы камень, што трапіўся на шляху...

— Сынок, Васілёк, уставай. Хутка гімн па радыё будзе іграць, і ты не паспееш сабрацца. Перакусіць не забудзь. Да дванаццаці гадзін часу багата – есці захочаш, — уже ідучы з даёнкай, прасіла матуля.

Ён адразу саскочыў з пасцелі. Паглядзеў у акно. Займаўся ранак. Выбег на вуліцу. Ад халоднага начнога паветра страсянуўся. Прыслухаўся. Тонкія струменьчыкі малака цыркалі па вядры. Маці даіла карову...

На выгане быў увесь статак. Чарнушка, ленавата жуючы жвачку, папляласа да кароў. Густы туман сырадоем павіс над сенажаццю. Буйныя кроплі расы схілілі мятліцу да долу. Над чорным грэбнем лесу паказаўся чырвоны круг. Недзе высока ў небе заліваўся жаўрук.

Каровы, падганяючы адна адну, несліся ўперад, саскубваючы росную траву. Амаль бег за імі і Васіль. Нарэшце статак угаманіўся. Некаторыя жывёліны пачалі класціся. Прысеў пад камень і Васіль, падставіўшы твар пад цёплыя промні сонца. Сон размарыў адразу...

Войкнуў ад тупога болю. Спярша падумаў, што сасніў. А калі адкрыў вочы — над сабою ўбачыў скрыўлены ад злосці і сіні ад гарэлкі твар Басяка — брыгадзіра.

—Ах ты паскуднік! Улёгся спаць, сапляк! Каровы дзе, паглядзі? — б'ючы пад бакі, роў брыгадзір...

З тыдзень Васіль хварэў. Прыходзілі суседзі, раілі:

—Ідзі, Мар'я, у суд падай. Гэта табе не жартачкі, на чорны яблык збіў хлопца.

Маўчала маці перад імі. А калі заставалася з сынам, казала:

—Раіць што — лёгка. Хіба я магу з начальнікам, з партыйцам судзіцца? Вунь колькі з раёна «шышак» прыязджае. Балююць амаль штодзень. Хіба ж у іх праўды шукаць... А звяжыся толькі — сабе нашкодзіш. Нервы пераядуць. А каня? Як без яго? На сабе ж не будзеш агарод узорваць. Ды што там казаць. Нядобра, канешне ж, атрымалася. Прапцы б яе ўзялі, тую канюшыну і тых пяток кароў, якія прабегліся па ёй. Не буду душой крывіць: хацела, каб ты ў калгасе застаўся. Апорай на старасці быў. А цяпер — ні за што! Паўдуркаватаму тырану служыць? Не дапушчу! Богу буду маліцца, каб ты паступіў вучыцца. Думаю, калі Божанька ёсць,ён дапаможа. А нелюдзя за твой боль і мае слёзы пакарае...

Было далёка за поўдзень. Нямала прабавіў часу, седзячы на камяні. А ў памяці выплыў чамусьці гэты эпізод. Хаця былі і весялейшыя хвіліны. Падняўся. Надзеў фуражку, абцягнуў крысы плашч-палаткі. Ледзь пераступаючы, пайшоў у сад. Дакрануўся да яблыні, якую пасадзіў сам, падышоў да дрэва, якое садзіла сястра. Правёў па грубай, патрэсканай кары. Сарваў яблык, які гойдаўся сярод адмерлых і жывых галінак, маленькі і хваравіты, палажыў у кішэню. Рэзка павярнуўся і шпарка пакрочыў назад, да вуліцы. Але гукі жалобнай музыкі спынілі.

З-за кронаў дрэў не мог разгледзець, адкуль вязуць нябожчыка. Прысеў. Уголас спытаў:

— Каго гэта хаваюць?

— Каго, пытаеш?

Азірнуўся. Да яго набліжаўся аднакласнік.

—Басяка, брат, хаваюць. Памятаеш такога? Конь з гары галопам панёс. А ён, як заўсёды, п'яны ездзіў. Транты збіраў у людзей. Дык вось зваліўся. Галаву размажджэрыў. Тыдзень мучыўся стары...

Аўтобус пазніўся. Ён стаяў на прыпынку і глядзеў убок свайго разбуранага гнязда. Дастаў яблык, а адчуў... пах сырадою.

## Пярсцёнак

Завіруха хавалася за вуглы шматпавярховак, каб знянацку наляцець на пешахоДаў, абсыпаць іх драбнюткім снегам, быццам маннымі крупінкамі, ці пад ногі падкінуць ледзь прыкметную снежную вяроўку-пятлю, шморгнуць яе і чакаць, калі ахвяра пахіснецца або паваліцца ў гурбу.

Гуляла сцюжа і з Нэляй на ўсім шляху-дарожцы, якая касніком плялася паміж дамоў. То абкручвала яе постаць снежным шалікам, у які ўпляла ледзяны бісер, то жменямі кідала снег на твар. І прыліпалі крыштальныя сняжынкі на шчокі, пашчыпвалі, а трошкі абагрэўшы свае кволыя крылы, расчульваліся і сцякалі ручайкамі.

Нэлю не раздражняла непагадзь. Яна ішла не спяшаючыся, раздзіраючы сабой калючыя хвалі, і думала пра жыццё, работу, пакручваючы маленькі пярсцёнак — падарунак ад чалавека, якога кахала. А вось ён... Нават і не спрабаваў яе знайсці. Але больш Нэлю займалі думкі пра дачку, якая вучыцца ў Маскве. Успомніла Алесю і ўсміхнулася...

— Вам не холадна? — пачула збоку голас. — Крочыце насустрач гэтаму ветру-забіяку так, быццам ён гарачы ды ласкавы, як у чэрвені. Нават усміхаецеся, нягледзячы на тое, што сцюжа закідвае шчокі і вусны снежнымі асцюкамі. Ідзяце са спаткання?

— А вам якая справа? — раздражнёна спытала Нэля. — Які клопат? Ідзяце сваёй дарогай — дык ідзіце. Вас жа ніхто не чапае.

— Быццам бы і так. Я хацеў вас абагнаць. Ды раптам з'явілася жаданне ісці нага ў нагу і паназіраць. Сваёй паходкай, але больш усмешкай, вы мне напомнілі адну мілую дзяўчыну з далёкага-далёкага юнацтва, якую я шчыра кахаў, але абставіны былі мацнейшыя за гэта пачуццё. І, ведаеце, так цяжка стала... Можна з вамі пазнаёміцца? Вы куды шлях трымаеце?

— Як усе ў гэты час — дадому, — без усякай ахвоты адказала Нэля.

— Давайце зазірнем у кавярню. Мне нясцерпна хочацца даведацца пра вас і як мага больш. Мо, падзеліцеся добрым настроем. У вас дзень быў удалы?

— Дзень як дзень. Як і іншыя на гэтым тыдні.

Я вельмі люблю жыццё і назіраць за людзьмі.

— А мне здаецца, што гэта не так. Вы ж мяне не заўважылі...

— Дарэмна так падумалі, залётны птах. Заўважыла адразу і магу нават назваць месца, ад якога ваша стомятроўка назіранняў пачалася. Ад бара. А не звяртала ўвагі па той простай прычыне, што з некаторага часу наогул мужчын не бачу.

— А чаму ж сталі размаўляць?

— Відаць, па той жа прычыне, што і вы. Ваша мова, манера забягаць наперад таксама тоесёе напомнілі.У камандзіроўку прыехалі?

— На мне гэта напісана?

— Яшчэ як. Ходзіце, блытаецеся пад нагамі, нешта вынюхваеце. Шукаеце якую-небудзь дурніцу, каб тая на ноч-другую прыгрэла.

— Вы псіхолаг?

— Не, я ведзьма. Бяззубая і з гарбатым носам.

А цяпер выкладвайце, што вам трэба.

— Што? Не ведаю. Мне здаецца, што я вас дзесьці сустракаў. Вы згодны зайсці вунь у тое кафэ? — сур'ёзным тонам спытаў мужчына. — Але калі я вам надакучыў, тады прабачце.

— Што ж, гэта цікава. Трэба ж высветліць, пры якіх умовах мы былі ўжо знаёмыя, у якім стагоддзі, — здзіўляючыся сваёй згодзе, прамовіла Нэля. — На ветры сапраўды неяк няёмка... І твар не разгледзець — цемра, хоць вочы выкалі. Я зайду толькі ненадоўга. Дачка ў палове дзясятай будзе тэлефанаваць.

Яны зайшлі ў паўцёмнае сучаснае кафэ. Распрануліся. Падняліся на другі паверх. Знайшлі свабодны столік, селі.

— Што будзем піць? — спытаў спадарожнік Нэлю. — Каньяк, віно?

— Віно з шакаладам.

Неўзабаве названае віно з шакаладам, як і цыгарэты, было на стале. Разліваючы па келіхах пітво, мужчына сказаў:

— А ты такая ж прыгожая...

— І вы нічога. Як кажуць, кавалер нарасхват, — не даўшы дагаварыць чалавеку, пажартавала Нэля.

— Кінь. Стары, хворы, нікому не патрэбны. Давай лепш вып'ем, Нэля.

— Што?! Што вы сказалі?

— Нэля, давай вып'ем за цябе. Няўжо ты мяне не пазнала? Зірні. Хаця пасля аварыі я і сам сябе не вельмі прызнаю.

Нэля адставіла ўбок келіх і ўчэпіста-халодным позіркам упілася ў мужчыну. Не глядзела, а свідравала яго вачыма. Божачка... Перад ёй быў Алег Зароўскі. Адзіны, любы...

Сядзіць Нэля, не варухнецца. А яе душа ўжо імчыцца па вострым камені мінулага. Вось яна за сцяной гадоў. Не, не гадоў, а руін яе кахання, адкуль даносіцца ледзь чутнае: «Мая любая, надзень гэты пярсцёнак. На доўгую памяць...

— Нам не патрэбна дзіця. Зрабі што-небудзь. Ты ж медык... Я адзін еду за мяжу. Так трэба».

— Які дурань твой Алег. Якая прыгожая дзяўчынка. А да яго падобная. Ты схаваеш яе ад бацькі? У такое захалусце сабралася. Не дурні...

Маўчыць Нэля. Не пярэчыць мінуламу. А што казаць? Хіба ж вернеш тое. Не. Толькі цягнецца рука да цыгарэт. Хутчэй яе запаліць, хутчэй. Адна зацяжка, другая... Кашаль. Нясцерпны, дзяручы да слёз.

...Халодны вецер абпальвае мокры твар. Мароз аб'іньвае павекі. Сэрца клякоча адчайна, б'ецца ў грудзях, быццам птушка ў клетцы, як тады, у дзень іх разлукі, шукаючы рады. А з сілай здзёрты з рукі пярсцёнак, той, які берагла Нэля ўсе дзевятнаццаць гадоў, ляціць у снег ды ставіць кропку на яе адзіным каханні.

АНТАЛОГІЯ

# УКРАІНСКІ МАЙДАН

## МІКОЛА ВІНГРАНОЎСКІ

* * *

*Хадземце ў сад. Я пакажу вам сад.*
*Дзе на каленях яблынь дрэмле вецер.*
*А згорблены чумацкі небаспад*
*Высвечвае вясёлкавую квецень.*

*Я пакажу вам слівы на сучках,*
*Настроміліся, падаючы моўчкі.*
*Сціскае груша ў жоўтых кулачках*
*Крутога сонца смачныя жаўточкі.*

*Салодка спіць у полі пад снапом*
*Жняя ружовашчокая — заранка.*
*І шэпча ціша сонным языком*
*Сівому саду песню-калыханку.*

*То кажаны. То кажановы лад*
*Звініць журліва ў сонных струнах ночы...*
*Хадземце ў сад. Я пакажу вам сад,*
*Яго душы нявыспаныя вочы.*

* * *

*У сініх нябёсах я высееў лёс,*
*У сініх нябёсах, любоў мая люба,*
*Я высееў лёс — гай з дубоў і бяроз*
*У сініх нябёсах з бярозы і дуба.*

*У сініх азёрах я высееў сны,*
*У сініх азёрах на дне сіняглейным.*
*Я высееў сны з тваёй светлай вясны,*
*У сініх азёрах з вясны і лілеяў.*

*Той лес зашуміць, тыя сны ажывуць,*
*І ты іх убачыш у небе й азёрах,*
*У сініх нябёсах і ў сініх азёрах*
*Табе яны з'явяцца і адплывуць.*

*Дубовы мой кій і нясходжаны край,*
*І ты ля мяне, і буслы, і бярозы,*
*Дарога і неба над намі, і слёзы, —*
*Азёры з цябе... І дарога у рай.*

* * *

*Уноч, апоўнач нехта ціха*
*Да майго Слова падышоў*
*І моўчкі стаў глядзець і дыхаць,*
*І я адчуў: так толькі ліха*
*Глядзіць і ходзіць — Час прыйшоў.*

*Прыйшоў і стаў. І ўжо нікуды*
*А не схавацца, не ўцякчы,*
*Не загубіцца паміж люду,*
*А ні ў Хрысты, а ні ў Іуды,*
*Нікога ў свеце — Час і ты.*

*Прыйшоў і стаў. І я пабачыў:*
*У поглядзе яго сухім*
*Ніхто не любіць і не плача,*
*І не бяжыць ніхто й не скача, —*
*У ім — аднолькава усім.*

*Усім аднолькава: нам існым*
*І тым, што будуць, ці былі,*
*Гнілым балотам, рэкам чыстым,*
*Аблудлым словам і прачыстым —*
*У ім аднолькава усім!..*

*І я спытаў: што хочаш, Часе, —*
*Усё аддам табе праз край —*
*Юнацтва, маладосці шчасце,*
*І гэты міг і дзень пагаслы,*
*А майго Слова не чапай!*

*Не загубі яго, малога,*
*Не бі яго і не кляні,*
*Бо перад ім яшчэ дарога,*
*Яму прайсці яшчэ так многа,*
*Мы з ім, лічы, што не жылі!*

*Чакаюць нас перадсвітанні*
*І слёзы першых грэшных сноў,*
*І першы снег з усіх снягоў,*
*І першы бераг з берагоў,*
*І першае з усіх каханне!*
*І звар'яцелы погляд злівы,*



*І грукат сэрца уначы,*
*І белы квет, і камень сівы,*
*Салодкі сон асы на сліве,*
*І ў змроку шэрым — пугачы.*

*Яшчэ чакае нас трывога*
*За ўсё, чаго ў нас не было,*
*За ўсё, што радасна і доўга.*
*Усё ў нас з ім, — як перад Богам*
*Кажу табе, не адышло!..*

*Што гэтак прагна абдымае*
*У неадменнасці сваёй,*
*І слова сэрцам напаўняе,*
*І слова ў сэрца адбірае…*
*Маё ж*
*жывое — Час, пастой!..*

*Хоць ты ў сваёй адвечнай плыні*
*Нікому спуску не даеш,*
*А ні цару, ні сіраціне,*
*А ні хлапцу, а ні дзяўчыне! —*
*Бяссмертна сееш, смертна жнеш!*

*І з невымольнымі вачыма*
*Ты йдзеш скрозь вечнасць і скрозь міг,*
*І цемраззяе за плячыма,*
*І прад табой імгла-цямніна,*
*Табе ж пляваць на ўсё і ўсіх!*

*А ці салодка, ці салёна,*
*Усё адно — няма ці ёсць…*
*А тут паднебна і натхнёна! —*
*А тут — сам Бог — жывое Слова*
*Майго народу і маё!*

*У ім спрадвечная надзея,*
*Яно скрозь попел, кроў і прах,*
*Скрозь пыл стагоддзяў у слязах*
*Прабілася, жыве, зарэе,*
*Гарыць, як Зніч пры абразах!..*

*Уноч, апоўнач нехта ціха*
*Да майго Слова падышоў*
*І моўчкі стаў глядзець і дыхаць.*
*І я адчуў: так толькі ліха*
*Глядзіць і ходзіць — Час прыйшоў…*

## ПЯТРО ЗАСЭНКА

### У княстве траў

*У княстве траў не скрозь лагода й згода —*
*На старасць не зважае маладосць.*
*І дзеўчыну, і яблыню прырода*
*Бывае, рана кідае ў мілосць.*

*А іншая і чорту не згадзіцца,*
*І бабадур увагай абміне —*
*У старых дзеўках звяне, як кісліца,*
*Без плоду-семені да смерці дажыве.*

*У яблынькі патрэскаюцца губы,*
*Экстаз любоўны цяжка перажыць.*
*І дзеўчына пад яблыняю з любым*
*Кахання мёд схілілася адпіць.*

*З зялёных дзён саб'е тугу-аскому,*
*На суд людскі свой вынесе пагляд,*
*І маці, што прагоніць яе з дому,*
*Дзіця пакіне ў засені прысад.*

*І дзеўчына, і яблыня дазвання*
*Парушылі біблейскі запавет —*
*Да сэрца тулять парасткі кахання,*
*І як дурніцы дзівяцца на свет.*

*У княстве траў, нібы ў старым пісанні,*
*Ад радасці паўкрока да бяды.*
*У позніх слёзах — ранняе каханне,*
*А позні квет б'юць рана халады.*

### Мой самалёт

*Самалёт мой не спіць,*
*Сушыць крылы край ночы,*
*Як пчала, што ў палёт сушыць крылы як след.*
*Ад шалёных страсцей я стаю на узбоччы,*
*І аб вочы мае*
*Трэцца вымыты свет.*
*Трэцца сотнямі доляў,*
*Мільёнамі крокаў,*
*Абрывае мне полы,*
*Цалуе,*
*Кляне,*
*Пасылае,*
*Вяртае,*
*Даруе — аж покуль*
*Усяго не раздорыць на часткі мяне.*
*Развіднеецца.*
*Сонца кувае маркотна.*
*Гнуцца ў дугі блакітных нябёс віражы…*
*Пасылай мяне, часе,*
*У такія палёты,*
*Каб сягнуў да вышынь*
*Чалавечай Душы.*

### Песня маёй матулі

*Твая, мама, песня ратуе ад ліха,*
*Ад злога ўроку*
*І злой гадзіны.*
*Пачую — і ў сэрцы маім адліга*
*Растопіць смутку цяжкія льдзіны.*

*Спяваеш — раю,*
*Мовіш — малітва —*
*Высока і чыста, нібы з «Адысеі».*
*Душа, як соты, твая наліта*
*Духмяным мёдам з садоў Арфея.*

*А словы — яблыкамі звісаюць,*
*Звысоку падаюць, коцяцца звонка.*
*Іх прыгубіўшы, уваскрасаю,*
*Як ад прычасця святой іконкай.*

### Каларадскія жукі

*А лета зноў на украінскі лад*
*Гудзе пчалою ў творчым захапленні…*
*Гароды шчыльна туляцца да хат —*
*Вартуюць бульбяную суверэннасць.*

*На ветры ледзь хістаюцца ўбакі*
*Зялёнага бульбоўніку прысады.*
*На іх жукі… Нібы бальшавікі,*
*Што ўсё гайдаюцца на вяршаліне ўлады.*

*У строях паласатых — проста шык!*
*Прылюдны секс у іх да адурэння…*
*Выплоджваюць пражорлівае племя*
*Чырвонае ад ног да галавы.*

*Яно абсядзе густа агарод,*
*Гусцей за чырвань гронак арабіны,*
*І будзе жэрці цела Украіны*
*Аж покуль… ні лісточка на развод.*

*Пасадзіш бульбу, а душа не рада.*
*Жук аглядае соткі як свае.*
*Ні сельсавет, ні Старшыня урада*
*Тым каларадам рады не дае.*

*Яны з'явіліся без візы і без меры*
*У наш гарод, у нашую сям'ю.*
*І зімаваць у іх тут ёсць намеры —*
*Вясною бульба ляжа у зямлю…*

*Кішаць жукамі міскі і збанкі,*
*Ніякай тары для атары той не хопіць.*
*Нібы папы з кадзіламі, жанкі*
*Свае прыходы венікамі кропяць.*

*Жукі жуюць. Ні дня на перадых.*
*Жуюць, даелі поле і надзелы…*
*Краплю гарод і думаю пра тых,*
*Хто мой народ, нібы жукі, абселі.*

## ІВАН МАЛКОВІЧ

### Музыка, што пайшла

*Калі яна плялася ў косы —*
*чаму ты, скрыпка, знікла з воч?*
*І музыку пусціла босай*
*у спеўна-звабліўую ноч.*

*Ох, смыча, хіба ты не бачыў? —*
*на скронях снег, на сэрцы дождж, —*
*як музыка пайшла жабрачкай*
*у спеўна-зваблівую ноч?..*

*Вазьму з сабой зямлі акраец,*
*пайду ў сусвет сабе на страх, —*
*хай толькі вецер завывае*
*ў маіх расхрыстаных слядах...*

*Матуля, тата, як спытаюць,*
*куды ваш сын падаўся з воч —*
*скажыце: музыку шукае,*
*што босая пайшла у ноч.*

### Далёкае лета

*Так хутка лета адышло —*
*што не дацягнешся рукою,*
*нібы туман празрысты, шкло*
*між летам стала і між мною;*

*і хай яно штосьць адняло*
*у нас з табой: дало ўсё ж болей —*
*прынамсі столькі супакою,*
*каб хоць не біцца ў тое шкло.*

### Дзіўная песенька

*Разгублены і бледны малачай,*
*зеленалісты, росны, белачары...*
*Ой, заварыце мне, матуля, чаю*
*з карэньчыкаў духмяных малачаю.*

*Сінеюць жылкі на маіх руках —*
*чаго ж, матуля, вы ў такім адчаі?*
*Падайце мне ў збаночку малака*
*з лісткоў бледназялёных малачаю.*

*Сваю усмешку й жылкі на руках —*
*вось гэта ўсё, што вам я пакідаю...*
*А вы... вы не зрывайце малачаю,*
*што зацвіце на досвітку ў лугах.*

* * *

*Пры гэтых дрэвах, гэтым ладзе*
*у парыванні духу ўпертых*
*мне б прытуліцца недзе ў садзе*
*і хоць бы трошачкі памерці.*

*Бо вершы — што? — каб і хацеў бы*
*у іх апець той смутак чысты,*
*ды струны ніжнія ў запеве*
*парваліся б ад жалю й ціску.*

*Бо так самотна ведаць зрэшты*
*у тым касандраўскім зацішку,*
*што ў гэтым садзе не пампэш ты*
*і вечных вершаў не напішаш.*

**Пераклаў з украінскай Эдуард Акулін**

ВЕРШЫ

# КОЖНЫ ВЫБІРАЕ САМ

Даша КАБАКОВА

**Даша — студэнтка Віцебскага ўніверсітэта. Захапляецца паэзіяй, турбуецца грамадскімі клопатамі, штудыруе медыцыну, малюе, марыць пра сваю першую кнігу — і прыгожа, сонечна, таленавіта шукае сябе ў нашым складаным свеце.**

**А яшчэ яна — дачка беларускага мастака Алеся Пушкіна, чым таксама вельмі ганарыцца…**



* * *

*Подых хмар*
*У брудны твар*
*Шэрага неба.*
*Мне пажар,*
*Мне цяжар*
*У сэрцы не трэба.*

*Хай не ў маім,*
*Хай у другім*
*Садзе рабінка*
*Дорыць свой пах*
*І кіне на дах*
*Цень ад галінкі.*

*Хоць вакол ціш,*
*Хоць ты маўчыш*
*І ахутваюць хмары,*
*Хай не са мной*
*Стануць маной*
*Марныя мары.*

*Хай не са мной*
*Расквітнее бядой*
*Дрэўца рабіны.*
*Лепш дробны дождж*
*Ды ціхая ноч,*
*Чым вецер няспынны.*

Люты 2010

## Монолог

*Бывает и на свободе тесно,*
*В последнее время всё чаще.*
*А чтобы сидеть было слаще,*
*Поставили в углу кресло*
*Да покрасили клетку в белый —*
*Раздвинули стены визуально.*
*Состояние экзистенциально.*
*Каждый выбирает сам.*
*А де-факто — всё те же рамки.*
*Если хочешь пробиться в дамки,*
*Пройди по законным следам*
*И стань цепным псом у «Грозного»,*
*С видом идиота серьёзного*
*Вещай, как ты любишь пространство*
*И веришь псевдоотцам!*

*Так было, так есть и будет;*
*Всегда находились люди,*
*Которые не гнушались методов*
*Любых достижения целей,*
*Сыто жрали, пили да пели,*
*Ведь им был обеспечен завтрак,*
*И обед, и светлое «завтра»*
*Под защитой крыла отцов,*
*Кому лизали они лицо.*
*На паркете не так страшна*
*Блокада, осада, война,*
*Но, как известно, в зданиях*
*С высокими потолками*
*Существуют свои сражения,*
*И одними лишь кулаками*
*И ботинками не ограничивается*
*Межличностная война;*
*И тогда в изнеможении,*
*Чувствуя в глотке жжение,*
*В ознобе дрожит страна.*

*Нет, я не за идеальное общество —*
*Идеалы рождаются после бутылки,*
*Наше утопическое зодчество,*
*Возведение воздушных замков,*
*Даже факторы и предпосылки*
*Всемирной эволюции*
*Не всегда приводили к прогрессу,*
*Но повернуться задом к лесу*
*И тупым молчанием выражать*
*протест —*
*Не шаг к Великой революции.*

*Я совсем не против монархии,*
*Если бы в ней открыто признались!..*
*На заборах не рисовали бы значки*
*анархии,*
*Если б сверху не кричали*
*про демократию,*
*О которой все знают — читали! —*
*Но никто её так и не видел.*
*Состояние века: in the middle*
*Of nowhere, как говорят в Британии.*
*Речь не идет о восстании —*
*Такая уж наша натура:*
*Либо свалить за границу,*
*Либо стонать, но терпеть диктатуру.*
*В моём государстве такая позиция:*
*Если ты умный, то ты в оппозиции;*
*Ты можешь не состоять в партии,*
*Не быть журналистом Хартии,*
*Не ходить по проспекту с плакатом,*
*Как отец мой ходил когда-то,*
*А просто быть солидарным,*
*Разделять мою точку зрения —*
*Хотя бы не делом, а словом и мнением.*

*Я всё-таки верю свято:*
*В Нацию превратится*
*Когда-нибудь население*
*И сможет в потугах родиться*
*Обещанная свобода —*
*Пусть только в жизнь воплотится*
*Калиновского изречение:*
*«Не народ должен быть для власти,*
*А власть — для народа!»*

17–18 апреля 2010

## У апошнюю восень

*(З Юрыя Шаўчука)*

*У апошнюю восень ні слова, ні ўздыху,*
*Апошнія песні паздзьмуліся ветрам.*
*Развітальным агнём дагарае ўсё ліха,*
*І мы назіраем за ценем і светам.*

*Халодная непагадзь параскідала*
*Ўсё, што душыла нас моцна і палка.*
*Усё, што бурліла, мігцела, палала,*
*Асінавы вецер парваў на кавалкі.*

*Ах, Аляксандр Сяргеевіч, мілы,*
*Чаму ж Вы нічога нам не сказалі*
*Пра тое, як увосень шукалі, любілі,*
*Пра што Вы апошнюю восень спыталі?*

*Галоднае мора за хмары-аблокі*
*Цяпло паглынула; за шэрай заслонай*
*Таго не прыпомніце больш,*
*што было тут,*
*Ласкавай травы не кранеце на строме.*

*Ідуць у апошнюю восень паэты,*
*І іх не вярнуць — пазачынены дзверы.*
*Дажджы засталіся, схаладнелае лета,*
*Засталася любоў з неўміручаю верай.*

*У апошнюю восень…*

6 кастрычніка 2010

## Правдой на правду

*По дороге тревоги беспечной*
*Дошли до черты.*
*Шаг — и мрак. Сейчас бы нам лечь на*
*Траву немоты,*
*Пару-тройку станций догнать —*
*И красный стоп-кран.*
*Но пить невозможно,*
*Но пить невозможно,*
*Но пить невозможно бросать,*
*Когда полон стакан.*

*Если вжать тормоза до упора —*
*Жалобный визг.*
*Амбиций голодных свора —*
*Оправданный риск.*
*Мы стоим, мы бежим, мы плюём,*
*А суть не видна...*
*Правдой на правду,*
*Правдой на правду,*
*Правдой на правду идём —*
*БУДЕТ война.*

*Зашкалили стрелки прибора —*
*Изменим закон!*
*Граффити-крики забора*
*Глотает вагон.*
*Мир, почётный железнодорожник,*
*Чинит состав,*
*Странных людей,*
*Жутких идей,*
*Странных идей заложник,*
*Меркнет, восстав.*

*Прелесть полезных теорий*
*Коверкает власть.*
*Боже мой, в мелочной ссоре*
*Не дай нам пропасть!*
*Помоги различить в эту осень*
*Тени и свет,*
*В риторичном, немом,*
*В риторичном, немом,*
*В риторичном, немом вопросе*
*Слышать ответ,*

*Как с загипсованных рельсов*
*Вбок не сойти,*
*Встретить своих Парацельсов*
*На шатком пути,*
*Чтобы успеть нам подправить*
*Трещины лет,*
*Что-то убрать,*
*Что-то убрать,*
*Что-то убрать и добавить,*
*Что-то убрать и добавить,*
*Что-то убрать и добавить*
*В но-вый рас-свет...*

4 апреля 2010



Малюнак аўтара

АСОБА

# ПАМЯЦЬ З КАНВЭРТА

Жыццё, здараецца, яшчэ не перастае здзіўляць пакутніцтвам, неўміручасцю і святасцю нашай Беларусі. Як гэтым разам, калі ў «Літаратурную Беларусь» патрапіў канвэрт з успамінамі. Правільней, яго прынёс нястомны апякун культурніцкай спадчыны Уладзімір Максімавіч Дамашэвіч, які і атрымаў той канвэрт-рукапіс ад Ірыны Пальчынскай, даўно знаёмай яму па Клецку.

Спадарыня Ірына шчыра і дэталёва апісала гісторыю свайго радаводу і свой лёс. Нарадзілася яна 2 сакавіка 1927 года ў Клецку, закончыла медыцынскую школу ў Баранавічах (вучылася па праграме Віленскай беларускай гімназіі).

«Пасля выгнання немцаў зноў вярнулася на вучобу ў Баранавічы, — згадвае спадарыня Ірына, — у фельчарска-акушэрскую школу, якую скончыла і была накіраваная на працу ў Клецак. Мела сям'ю, мужа і дачку Кацьку. Але шчасце было нядоўгім. 10.07.1951 года была арыштавана ў тых жа Баранавічах, куды паехала па медыкаменты. Асуджана за «прыналежнасць да антысавецкай арганізацыі СБМ і антысавецкую прапаганду» — сшытак з вершамі — да 10 гадоў Папраўча-прымусовай калоніі і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Пакаранне адбывала ў адным з лагероў на Валагодчыне, на лесапавале. Пасля смерці Сталіна ў лютым 1954-га этапавана ў лагер «Шылуцэ» каля Каўнаса. Вызвалена 16.05.1955 года, вярнулася ў Клецак, але сям'я за гэты час распалася. Забраўшы дачку, паехала да сяброў па лагеры ў Вільнюс і працавала па спецыяльнасці пры філіяле бальніцы «Чырвоны крыж». Тут аддала замуж дачку, прычакала ўнука. Але ў 1986 годзе вярнулася ў Клецак, атрымала двухпакаёўку як кампенсацыю за бацькоўскую хату. Жыву на пенсію, пішу ўспаміны свайго жыцця».

Але не толькі спавядальна-пранікнёныя ўспаміны пра сваё жыццё імкнецца засведчыць няскорная нашчадка святой Еўфрасінні Полацкай і Ларысы Геніюш — спадарыня Ірына, але і шчырую праўду пра нашую агульную гісторыю вымагаецца пакінуць, праўду пра яе некалі бяздушна вырваныя старонкі. Як гэтыя, што і прапануюцца чытачам «Літаратурнай Беларусі», — пра легендарную асобу нашага мінулага, пра аднаго з першых грамадзянаў вольнай БНР, пра дужага духам і справай Клаўдыя Дуж-Душэўскага, які на падставе колераў народных строяў і арнаментаў стварыў эскіз беларускага нацыянальнага сцяга, што бела-чырвона-белым світанкам упершыню ўзняўся над Менскам падчас Усебеларускага з'езда ў 1917 годзе.

Архітэктар, выдавец, грамадскі дзеяч Клаўдый Дуж-Душэўскі нарадзіўся 27 (ці паводле ніжэйапублікаванага сведчання — 26-га) сакавіка 1891 года ў Глыбокім. Скончыў Віленскую рэальную вучэльню. Вучыўся ў Пецярбурскім горным інстытуце. У 1921-м прыехаў у Коўна. Працаваў на розных афіцыйных і неафіцыйных пасадах: ад выкладчыка Віленскай беларускай гімназіі да дыпламатычнага прадстаўніка Беларускай Народнай Рэспублікі ў краінах Балтыі і Дзяржаўнага сакратара ва ўрадзе БНР на чале з Вацлавам Ластоўскім. Абіраўся старшынём Беларускага цэнтру ў Коўне.

Пасля далучэння Летувы да СССР К. Дуж-Душэўскі трапіў у савецкую турму. Падчас нямецкай акупацыі яго за дапамогу габрэям кінулі ў нацысцкі канцлагер. У лютым 1952-га К. Дуж-Душэўскі як «актыўны беларускі нацыяналіст» быў асуджаны да 25 гадоў зняволення ў канцлагерах ужо савецкіх. Дзе і пазнаёмілася з ім Ірына Пальчынская…

Спачыў Клаўдый Сцяпанавіч Дуж-Душэўскі 25 лютага 1959 года ў Вільні (паводле іншых звестак — у Коўне)…

**Алесь ПАШКЕВІЧ**

## Мае сустрэчы з Клаўдыем Дуж-Душэўскім

**Ірына ПАЛЬЧЫНСКАЯ**

Архітэктар Клаўдый Дуж-Душэўскі вядомы як актыўны сябра Рады БНР і стваральнік бел-чырвона-белага сцяга. У 1919 годзе ён узначальваў Беларускую Раду Віленшчыны і Гарадзеншчыны, але калі Юзаф Пілсудскі адмовіў у стварэнні беларуска-польскай федэрацыі, пакінуў сваю пасаду. На яго месца быў абраны Браніслаў Тарашкевіч (28 ліпеня 1919 года).

З Клаўдыем Сцяпанавічам я была знаёмая асабіста. Так сталася, што мы абое апынуліся ў адным лагеры ў статусе палітвязня і ў адзін дзень выйшлі на волю.

У канцы свайго тэрміну зняволення, у 1954 годзе, я, як інвалід II групы, была пераведзена з Каргопальлага ў Літву, у лагер Шылутэ. Гэта быў інвалідны лагер, падзелены на мужчынскую і жаночую зоны. У жаночай зоне размяшчаўся ДМР («Дом матери и ребёнка») і, калі яго можна так назваць, радзільны дом — маленькае памяшканне на пяць коек. Там я працавала па спецыяльнасці, акушэркай. Звычайна парадзіхі 10–12 дзён знаходзіліся ў радзільным доме, потым дзетак пераводзілі ў ДМР, а мамаў вярталі ў баракі. Некаторым шанцавала прыстроіцца ў ДМР нянечкамі ці прыбіральшчыцамі, каб быць разам з дзеткамі. Побач, у мужчынскай зоне, знаходзілася санітарная частка.

Там і працаваў статыстам-рэгістратарам Клаўдый Дуж-Душэўскі. Быў гэта ціхі, сціплы і, як мне тады здавалася, старэнькі чалавек (яму было за 60, а мне — 25). У лагеры яго называлі айцец Клаўдыюш, таму што нечым ён быў падобны на святара. Часам мы сустракаліся ў лагеры, па працы, але не маглі пагутарыць. Усё ж такі лагер ёсць лагер, і мы былі людзьмі падканвойнымі. Тым не менш, я ведала, што ў нас з ім аднолькавыя артыкулы «58 п.10» — антысавецкая прапаганда.

Але ж так сталася, што 25 сакавіка 1955 года айцец Клаўдыюш прыйшоў у маю «рэзідэнцыю» без канвоя. Яго прывяла ў Дом маці і дзіцяці, для праверкі дакументаў, начальніца ДМР доктар Юдзіта. Вось тады мы і пазнаёміліся бліжэй. Яго твар быў такі радасны і светлы, з блакітных вачэй пад акулярамі так і сыпаліся праменьчыкі радасці. Мне так хацелася размаўляць з гэтым чалавекам! Айцец Клаўдыюш сказаў мне, што ён не святар, а палітык. Запытаўся, ці ведаю я, якое сёння свята. Я адказала, што ведаю — каталіцкае Звеставанне, і пачала, як вучаніца, расказваць, што ў гэты дзень архангел Гаўрыіл падаў вестку Дзеве Марыі, што ў яе народзіцца сын, яна ж усумнілася, бо ў яе не было мужа. Дуж-Душэўскі запытаўся, адкуль я гэта ведаю, хіба я каталічка? Я адказала, што вучыла Закон Божы, і хаця сама праваслаўная, але мой дзядуля па матчынай лініі быў каталік, і мы святкуем падвойныя святы.


Клаўдый Дуж-Душэўскі

Але тут Клаўдыюш спытаў, ці ведаю я, што гэта яшчэ і беларускае нацыянальнае свята: дзень абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе.

— А ў мяне заўтра дзень нараджэння, — сказаў ён. А сёння былі госці. Меў сустрэчу з дачкой. Вось, гэта вам, — і працягнуў мне шакаладку.

Я збянтэжылася:

— Ну што вы, гэта я павінна зрабіць вам падарунак…

Але тут з'явілася доктар Юдзіта. Мы пагарталі нейкія запісы ды перадалі Дуж-Душэўскаму карткі «Гісторыі хваробы», пасля чаго ён пайшоў. Так скончылася нашая першая сустрэча.

Праз некаторы час я зазірнула ў рэгістратуру санчасці, дзе Дуж-Душэўскі, як запраўскі пісар, запаўняў сваім прыгожым почыркам бланкі на «акціроўку». Я не змагла доўга размаўляць, і таму паспяшалася ўручыць яму свой падарунак у адказ. Гэта быў уціральнік-ручнічок з вышытым крыжыкам узорам у выглядзе васількоў і шлячком чырвонага колеру. Клаўдыюш узрадаваўся, падзякаваў і пацалаваў мне руку.

Наступнага разу мы ўбачыліся амаль праз месяц, 1 мая 1955 года. Быў сонечны дзень, я сядзела каля сваёй бальніцы. Тут былі і дзве парадзіхі з дзеткамі на руках. Раптам убачыла знаёмую постаць з кіёчкам, якая ўпэўнена рухалася ад вахты — прахадной паміж мужчынскай і жаночай зонамі, у напрамку радзільнага дома. У мяне сэрца закалацілася, не ведаю — ці ад страху, ці ад радасці. Клаўдый Сцяпанавіч падышоў, па-джэнтэльменску пакланіўся. Пазабаўляў дзетак, перакінуўся парай слоў на летувіскай мове з матулямі. Пажадаў ім здароўя ды хутчэйшага вяртання дадому. Поўдзень выдаўся спякотным, і сп. Клаўдыюш папрасіў выйсці ў цень, ды й матулям з дзеткамі не раіў доўга знаходзіцца на сонцы.

Мы ўвайшлі ў мой пакой. Яго вочы асвяціліся нейкім дзіўным бляскам:

— Ірэна, мы ўжо вольныя, прыйшлі паперы. Цуд! Хутка і вы і я будзем дома! Толькі маўчыце, нікому ні слова, а то мне за парушэнне лагернага рэжыма дадуць дадатковы тэрмін. Разумееце, я раскрываю вам вялікую тайну, хутка лагер расфарміруюць. Мы будзем на волі, жывыя!

Ён усё гаварыў і гаварыў, нібыта спяваў. А я, як зачараваная, слухала і не разумела: праўда гэта ці казка. Хоць і мала яго ведала, але ў гэты момант ён быў для мяне самым блізкім чалавекам.

Праз пару дзён пасля візіту Клаўдыя Сцяпанавіча прыйшоў пасыльны з вахты і сказаў, што мяне выклікае начальнік. Я адразу ж пайшла. Сэрца калацілася і ў вушах шумела, але я супакойвала сябе: «Спакойна, ты так шмат перажыла, перацярпела, так што баяцца няма чаго». Вось мяне павялі да самога начальніка лагера Хаменкі. Ён мне абвясціў, што прыйшлі дакументы на маё вызваленне, але ён асабіста просіць мяне застацца працаваць на два-тры месяцы. Ліквідуецца ДМР, і я буду вельмі патрэбна ў лагеры. Ён прапанаваў залічыць мяне ў штат вольнанаёмных і абяцаў выплочваць заробак «у лепшым выглядзе». Я ледзьве не абамлела. Што рабіць? І дадому ой як хочацца, і грошай зарабіць было б нядрэнна. Стаўкі тут, у сістэме МУС, нашмат большыя, чым у цывільных. Праўда, начальнік папярэдзіў, што працэдура афармлення маіх дакументаў зацягнецца не менш як на два тыдні. Для выканання гэтых працэдураў давядзецца ехаць у Вільню.

Тады я пачала выкладаць свае меркаванні. Гаварыла пра тое, што больш як чатыры гады не была дома, не бачыла дачушку, якой ужо пяць гадоў і г.д. Хаменка параіў: няхай сваякі прыедуць да вас. «Выдзелім пакой для спаткання за межамі зоны, у доме аховы. Падумайце, а заўтра дадзіце адказ».

Я ўзважвала ўсе «за» і «супраць». Чуткі пра тое, што нас, медыкаў, пераводзяць працаваць у сістэму МУС, ужо разнесліся па зоне. Мае калегі радаваліся таму, што будуць забяспечаны высокааплатнай працай. Я ж ніяк не магла зразумець, чаму яны цешацца. Працу ў сістэме МУС я лічыла не гонарам, а знявагай і ганьбай. Нават само гэтае слова «сістэма» здавалася ненавісным. Я разумела, што ў любым выпадку буду працаваць для людзей. Але побач з кім і пад якой шыльдай?

Хацелася пра ўсё расказаць айцу Клаўдыю, параіцца з ім, але спаткацца ў той дзень нам не ўдалося. Толькі праз пару дзён, калі назбіраліся нейкія медыцынскія паперкі, я папрасіла дазволу прайсці ў санчасць. На той момант па лагеры ўжо разнеслася вестка аб маім вызваленні, і я лічылася, так бы мовіць, напалову вольным чалавекам.

Клаўдый Сцяпанавіч нічога не параіў. «Вырашай сама», і я дала згоду затрымацца ў лагеры. Адбылося гэта 16 траўня 1955 года.

Разам з Дуж-Душэўскім мы выходзілі на волю. Спаткаліся на вахце (на прахадной). Ад лагера да горада Шылутэ было кіламетраў пяць. Нам далі машыну — «Газік», каб даехаць да гарадскога аддзялення міліцыі і атрымаць пашпарты. У пашпартным стале я справілася даволі хутка. Ніякіх пытанняў да мяне не было, і я ніякіх прэтэнзій не мела. Тады я яшчэ не ведала, што ёсць пэўны шыфр, што на чалавеку і пасля вызвалення застаецца кляймо былога вязня. Адчула гэта толькі пасля.

А вось у Клаўдыя Сцяпанавіча Дуж-Душэўскага ў даведцы аб вызваленні ў графе «прозвішча» стаяла «Душаўскас», без прыстаўкі «Дуж», што азначала «Дужы». А звесткі з даведкі пераносіліся ў пашпарт. З такім напісаннем прозвішча Клаўдый Сцяпанавіч не пагадзіўся. З-за гэтага ўсчалася спрэчка. Хоць размаўлялі і па-літоўску, але я разумела сэнс гутаркі. Начальнік пашпартнага стала з нейкім сарказмам прамовіў:

— Які ж ты дужы? Можа, лепш напісаць «стары»?

Спадар Клаўдый, аднак, адстойваў «прыстаўку» да свайго прозвішча, але так нічога і не дамогся. З міліцыі ён выйшаў увесь знерваваны, яго літаральна трэсла. Каб супакоіцца, Дуж-Душэўскі запрапанаваў пайсці ў рэстаран — выпіць віна і перакусіць.

На жаль, рэстаран быў зачынены, да яго адкрыцця заставалася яшчэ цэлая гадзіна. Мы селі на лаўку, і айцец Клаўдыюш (як я яго ўжо прывыкла называць) пачаў гаварыць пра тыя праблемы, якія нас чакаюць:

У асобных адзнаках пашпарта стаяць пэўныя зашыфраваныя лічбы. «Гэта тое, што табе, дарагая Ірэна, складзе праблемы. Але, можа, Бог абнясе. Мне ўжо ўсё роўна. Працы ў іх я і так не буду прасіць. А вось свой родавы герб пастараюся адрадзіць для нашчадкаў»…

Потым пачаў расказваць пра сваё жыццё. Гаварыў пра сваю працу ў Радзе БНР у маладыя гады. Расказаў, што некалі пісаў казкі для дзетак. Пра свае тры арышты і турэмныя тэрміны, здабытыя ў розныя часы ад розных рэжымаў. Першы тэрмін атрымаў ад летувісаў у 1923 годзе, другі ад немцаў — у 1942-м; трэці — у 1947-м, за «антысавецкую прапаганду».

Так, у гутарцы, незаўважна праляцела гадзіна. Адчыніўся рэстаран, і кельнер папрасіў нас заходзіць. Праўда, у рэстаране мы не затрымаліся. Спадар Клаўдыюш спяшаўся на аўтобус, а мне трэба было вяртацца да нелюбімага лагера. На развітанне выпілі трохі добрага віна, здаецца, «Вермута», закусілі і разышліся.

Я пешшу падалася на старое месца, у новае жыццё.

ПРЭМІІ

# УРУЧЫЦЕ МЯНЕ!

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

**Калі госцем маёй аўтарскай перадачы «СучБелЛіт» на NETradio быў кніга- ды музыкараспаўсюднік, мэнеджэр беларускамоўных праектаў Алесь Мазанік, у эфір патэлефанавала слухачка. Прадставілася Ірынай і задала наступнае пытанне: «Ці ёсць у сучаснай беларускай літаратуры праект кшталту штогадовага Букера, што ўручаецца ў Расіі, а цяпер і ў іншых краінах? Ці хаця б задума такая?..» І дадала: «Для папулярызацыі сучаснай беларускай літаратуры гэта было б вельмі добра!». Паколькі не адна Ірына задаецца гэтым (ці падобнага кшталту) пытаннем, прапаную нам з вамі ў ім разабрацца.**

Натуральна, не сакрэт, што згаданы Ірынай Букер — адна з самых прэстыжных літаратурных прэмій, што з 1969 года ўручалася ў Вялікабрытаніі за найлепшы англамоўны раман, а з 1992 года — і за раманы, напісаныя па-расійску (так званы «Рускі Букер»). Што да Расіі, то, акрамя «Букера», там існуюць яшчэ літаратурныя прэміі «Антыбукер», «Вялікая кніга» ды іншыя. Усе памянёныя літпрэміі — грашовыя. Гэта, бясспрэчна, і сталася прычынай іх прэстыжнасці, папулярнасці.

Перанясемся ў беларускую літаратурную прастору. У нас таксама ёсць «недзяржаўныя» літаратурныя прэміі. Але ўсе яны: а) сімвалічныя, б) для «сваіх». Тлумачу гэтыя пункты, распавядаючы пра найбольш вядомыя літаратурныя прэміі (дакладная фармулёўка: пра тыя, што на слыху).

«Гліняны Вялес» — самая першая і самая вядомая айчынная літпрэмія. Была заснаваная ў 1993 годзе сябрамі Таварыства Вольных Літаратараў. Старшыня арганізацыйнага камітэту — Алесь Аркуш. Менавіта ён гэтай прэміяй нястомна і займаецца: сам складае шорт-ліст найлепшых, на ягоны погляд, мастацкіх кніг за мінулы год, арганізоўвае журы з прафесійных літаратараў, што маюць пэўную вагу і абіраюць пераможцу, а пасля ладзіць у родным Полацку ганаровае ўручэнне прэміі — стода Глінянага Вялеса. «У яго шырокае поле дзейнасці: пачынаючы ад падземнага свету і сканчваючы жывёлагадоўляй, але акрамя таго ён апекаваўся людзьмі культуры», — патлумачыў мне Алесь Аркуш род занятkaў міфічнага Вялеса.

«Залатая літара» — штогадовая суб'ектыўная літаратурная прэмія, якая ўручаецца пісьменнікам Адамам Глобусам за найлепшую кнігу года. Заснаваная прэмія ў 2004 годзе. «Нешматлюднае мерапрыемства традыцыйна адбываецца ў сакавіку, праводзіцца ў маленькіх кавярнях Мінска («Стары Менск», «Акварыюм»)», — пазначана ў Вікіпедыі. Вось такая «прэмія». Адам Глобус сам выбраў пераможцу, пасядзелі ў кавярні, папілі піва — і разышліся. Усе задаволеныя. Акрамя акрэсленай вузкафарматнасці мерапрыемства, варта адзначыць, што «Залатую літару» можа атрымаць не толькі аўтар мастацкага твора (кнігі), але і аўтар навуковай манаграфіі (першую «Літару» атрымала Аксана Бязлепкіна за манаграфію «Разам і паасобку: Таварыства «Тутэйшыя»). Варта не забывацца толькі на адну маленькую, але істотную дэталь: каб быць уганараваным Адамам Глобусам, трэба быць ягоным сябрам. Ці хаця б добрым прыяцелем. Памятаем: прэмія — суб'ектыўная…

«Залаты апостраф» — штогадовая прэмія літаратурна-мастацкага часопіса «Дзеяслоў». Уручаецца ў намінацыях «Проза», «Паэзія», «Дэбют». Пра публіцыстаў і крытыкаў рэдакцыя часопіса прыгожа забылася. Але я не губляю надзеі, што дажыву такі да таго дня, калі «Залаты апостраф» зможа атрымаць і брат/сястра па крытычна-публіцыстычных пяры… Абіраюць пераможцу прадстаўнікі рэдакцыйнай рады: галоўны рэдактар Барыс Пятровіч, Алесь Пашкевіч, Эдуард Акулін ды Анатоль Івашчанка. Праўда, апошнім разам выбраць пераможцаў «дазволілася» карыстальнікам «Жывога журнала», але ўсё адно вырак выносяць згаданыя літаратары.

«Блакітны свін» — антыгламурная беларуская літаратурная прэмія суполкі «Літаратурнае прадмесце». Заснавальніца (правільней было б сказаць прыдумляльніца) «прэміі» — Людміла Рублеўская. Прэмія, якую складаюць 100 алоўкаў, 100 насовак (кожны год па-рознаму) уручаецца толькі сябру суполкі «ЛітПрадмесце» за (увага!) нонканфармізм у мастацтве, яркія праекты цягам года… Ці ёсць у прадстаўнікоў памянёнай суполкі нонканфармісцкія закіды — для мяне асабіста пакуль пытанне адкрытае. Людміла Рублеўская лічыць, што ёсць…

Што вынікае з усяго гэтага? А тое і вынікае, пра што я пісала напачатку: сучасныя недзяржаўныя беларускія літаратурныя прэміі: а) сімвалічныя, б) цікавыя для вельмі вузкага кола (тут прыемным выключэннем з'яўляецца толькі аркушаўскі «Гліняны Вялес». Ён не для вельмі вузкага — ён проста для вузкага кола). Натуральна, такі стан рэчаў не дапаможа зрабіць сучасную беларускую літаратуру больш папулярнай, пра што так марыць Ірына…

А што трэба? Грошы, дарагія мае, грошы! На сімвалізме, як вядома, далёка не заедзеш. І не выедзеш. Да людзей. Не выйдзеш.

P.S. Сёлета Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-цэнтр сумесна з Літаратурным музеем імя Максіма Багдановіча абвясцілі аб заснаванні новай літаратурнай прэміі — Прэміі імя Максіма Багдановіча, якая будзе ўручацца за найлепшы дэбют года ў трох намінацыях: проза, паэзія, пераклад. Спіс прэтэндэнтаў на Прэмію за 2010 год фармуецца да 14 лютага 2011 года. Уручэнне адбудзецца ў канцы сакавіка 2011-га. Так што ў вас яшчэ ёсць магчымасць падаць свой твор на разгляд прафесійнаму журы…

ВОДГУК

# ВІРТУАЛЬНАЯ РЭЧАІСНАСЦЬ,

## АЛЬБО ЧАКАНАЯ КНІГА

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

**Я была б шчыра ўдзячная пісьменніку Валерыю Гапееву, каб ягоная кніга «Урокі першага кахання» выйшла гадоў сем таму. Тады я вучылася ў школе і спасцігала тыя інтэрнэт-тэхналогіі, пра якія досыць падрабязна, кампетэнтна (а галоўнае — зразумела і для школьнікаў, і для дарослых) піша ў сваіх апавяданнях аўтар. Аська (праграма ICQ) ды рознага кшталту форумы тады былі акурат актуальнымі, імі актыўна карысталіся ўсе мае равеснікі. Што да сённяшніх маладзёнаў, то ў іх ужо іншыя пляцоўкі ды праграмы для стасункаў: skype, facebook, Вконтакте, блогі…**

Кніга Валерыя Гапеева «Урокі першага кахання» — не збор парадаў аб тым, як, з кім і дзе лепей заняцца першым каханнем. Кніга ўтрымлівае тры аповесці пра падлеткаў-аднакласнікаў (спачатку дзея адбываецца ў 10 класе, пасля — у 11-м), якія расчароўваюцца ў дарослых і адно ў адным, знаходзяць сапраўднае сяброўства, пазбаўляюцца ад комплексаў, зарабляюць першыя грошы, спасцігаюць першыя ўрокі кахання… Адным словам — сталеюць.




У цэнтры кожнай з аповесцяў ярка акрэсленая псіхалагічная праблема сталення, з якой вынікае шэраг цяжкасцяў, праз якія праходзяць школьнікі.

У аповесці «Усё цудоўна, або Урок бяспечнага кахання» падлеткі судзяць дарослых за тое, што яны не даваряюць сваім дзецям, гатовыя забыцца на ўсё добрае, што ёсць у іх, пачуўшы, што іхні сын альбо дачка ў лесе з прэзерватывам: «…дастаткова толькі даведацца бацькам аб дзвюх рэчах, як мы, хвіліну назад разумныя і добрыя, ператварыліся ў разбэшчаных распутнікаў». Гэта зразумелая пазіцыя пакрыўджаных на дарослых школьнікаў, якія і думаць не думалі займацца чымсьці непрыстойным. Пазіцыя бацькоў не менш зразумелая нам: «Мы не таму на вас крычым, што думаем пра вас дрэнна. Нам проста страшна ад уяўлення, што тое дрэннае можа з вамі здарыцца».

Спрадвечная праблема, з якой сутыкаюцца дзеці: дарослыя бацькі забываюцца, якімі былі самі ў маладыя гады. Многія бацькі яшчэ не тое рабілі, калі былі 16-гадовымі. Затое сваім дзецям спуску не даюць. Вельмі грунтоўна выказалася класны кіраўнік Вольга Фёдараўна: «…Калі мне было шаснаццаць, быў і ў мяне такі выпадак. Пачула я ад маці далёка не самыя прыгожыя словы пра сябе. Без прычыны. Без падстаў. І так я абурылася… Як і вы сёння. І вось у мяне сёння дачушка дзесяцігадовая. Цяпер я разумею сваю маці… І я прабачыла ёй цалкам тую сваю крыўду». Ці не слушныя словы? Немагчыма зразумець матывацыі дзеянняў іншага чалавека, нават самага блізкага, пакуль не апынешся на ягоным месцы.

Яшчэ адна заўжды актуальная праблема, акрэсленая Валерыем Гапеевым: чаму маладое пакаленне абвінавачваюць у разбэшчанасці тыя, хто выпускае прадукцыю, што прапагандуе шкодныя звычкі, гвалт, парнаграфію? «Дык чаму нас абвінавачваюць у тым, што мы глядзім, гуляем, чуем? Можа, нам асляпнуць, аглухнуць і насы пазаклейваць?» — слушна абураецца 10-класнік Сяргей. Спрэчкі такога кшталту — вечныя. Яны будуць актуальныя, пакуль будуць запатрабаваныя прадукты масавага спажывання для «разгрузкі» мазгоў, якія часта нічым асаблівыя і не абцяжараныя...

У аповесці «Лёшкава каханне, або Віртуальная дрэва рэальнасці» пісьменнік, акрамя асаблівасцяў стасавання ў інтэрнэце, на прыкладзе 10-класніка Лёшкі паказвае мэтанакіраваную моладзь, якая замест бясконцых гулянак-бадзянняў з сябрамі зарабляе грошы. Лёша праграмуе. Хлопец настолькі пагрузіўся ў віртуал, што развучыўся нармальна стасавацца з жывымі людзьмі. Аднакласнік Юрыс вырашае «дапамагчы» сябру: ён рэгіструецца на форуме пад нікам Ксенка і просіць у Лёшкі парады па заробку ў Сеціве. «Ну вось, добрае зрабіў. Зазірне Лёшка — яму будзе прыемна… А там, глядзіш, прывыкне да размоў з дзяўчатамі. То можна будзе перайначыць хлопца!» — вырашае Юрыс. Як тое звычайна бывае, Лёшка ў тую віртуальную Ксенку закахаўся… Прызнанню сябра, што няма ніякае Ксенкі, што яна — гэта ён, Юрыс, хлопец не верыць, яму цяжка аддзяліць віртуальнае ад сапраўднага, жывога.

Аповесць «Першы боль, або Доказ закона прыгажосці» — пра сталеючых Кацярыну ды Юрыя, якім хочацца спазнаць першую блізкасць. Кацярына, як і герой аповесці «Лёшкава каханне», зарабляе грошы. Калі Лёша праграмуе, то Каця вырошчвае гародніну на продаж. Праўда, мне штосьці не верыцца, што на гурках ды памідорах можна зарабіць, каб з ног да галавы апрануць матулю, якая з жаніхом з'язджае на мора, ды яшчэ з сабой грошай даць…

Юрый — сын забяспечаных бацькоў, начытаны не па гадах юнак, якому нецікава са сваімі аднагодкамі: сам сябе ён лічыць вышэйшым за іх па разумовым развіцці. Адно турбуе Юру: яму 17, а ён нават не цалаваўся…

Зноўку Валерый Гапееў скарыстоўвае прыём маскі, што так распаўсюджаны ў Сеціве: Кацярына рэгіструецца на форуме пад нікам Менэджэр ды распачынае дзёрзкую гульню: яна хоча даказаць Юрыю, што вартая яго. Атрымалася. Даказала. Адначасова лёс звodзіць Юру з жывой Кацярынай, якая даглядае за ім, пакуль той хварэе (бацькі з'ехалі на працу ў Эміраты). Кацярына спадабалася Юрыю. Паміж імі адбываецца першая блізкасць. І тут у хлопца ўключаецца халодны разлік: «Хто яна? Звычайны чалавек, яе лёс — лёс яе маці..». Да таго ж, Кацярыну ён ужо спазнаў, а вось Менэджэр застаецца загадкай. Цікава разгадаць, праўда?.. Знаёмая нам псіхалогія мужчыны-паляўнічага.

Фінал нярадасны: Кацярына ўжо сабралася раскрыцца, як атрымлівае ад Юрыя СМС цынічна-халоднага змесціва: «Каця, мы — дарослыя людзі, мы атрымалі цудоўны ўрок… На гэтым кропка… Ніякіх наступстваў. Калі што — не ўмешвай мяне». Як на мяне, дык вельмі жыццёва. Мы мусім прайсці праз шэраг страт і расчараванняў, каб навучыцца больш абачліва ставіцца да людзей, нам неабходна часам пачуваца адзінокімі і ўсімі пакінутымі, каб не думаць, што мы — пупы сусвету і цаніць тых, хто побач, неабходна занурыцца ў віртуал, каб больш цаніць і берагчы жыццё рэальнае. Адным словам — каб пасталець.

Героі аповесцяў Валерыя Гапеева падаюцца занадта ідэальнымі: яны працуюць з 10 класа, яны начытаныя і адукаваныя, яны ведаюць, чым хочуць займацца і кім хочуць стаць. Дасціпныя, вострыя на язык, сябе ў крыўду не дадуць і за сябра пры выпадку пастаяць. Вельмі хацелася б, каб такімі былі нашыя школьнікі. Тады — глядзіш — і зажылі б па-іншаму…

Я абавязкова дам прачытаць гэту кнігу маім будучым дзецям. І зусім неістотна, што да таго часу гістарычны кантэкст стане неактуальным. Валерый Гапееў таленавіта і поўна раскрыў падлеткавыя праблемы, праз якія прайшлі мы, з якімі сутыкнуцца нашыя дзеці. Пісьменнік нязмушана, простай мовай, без дыдактычных нотак паказаў псіхалогію як дарослых, так і школьнікаў.

АГЛЯД

# «ДЛЯ ЛІРЫКІ НАДТА МНОГА КРЫВІ»

## (СОРАК ДЗЯВЯТЫ «ДЗЕЯСЛОЎ»)

ЛеГАЛ



**Калі глядзіш на парадкавы нумар часопіса, не пакідае адчуванне яго блізкага юбілею. Напраўду — на носе пяцідзесяты. А здаецца, гэта было зусім нядаўна: і планы, і задумы, і падрыхтоўка, і рэдагаванне — і нарэшце першы нумар «Дзеяслова», які чытачы вырывалі ледзь не з рук, а самі літаратары і аўтары хадзілі з ім напаказ па фае тады яшчэ пісьменніцкага Дома літаратара на сваім чарговым творчым сходзе...**

Нумар той, безумоўна, быў адмысловы: Н. Гілевіч, Я. Брыль, А. Разанаў, У. Някляеў, С. Алексіевіч, А. Пісьмянкоў, А. Федарэнка, Ю. Станкевіч, А. Кудравец, А. Асташонак, С. Дубавец, А. Сідарэвіч, Л. Рублеўская, І. Шаўлякова... Ва ўступным «Слове ад «Дзеяслова» рэдакцыя пісала: *««Беларусь, твой народ дачакаецца...» — гэтыя словы з аптымістычнага чатырохрадкоўя Максіма Багдановіча ўсё часцей сімвалічна і пагрозьліва-перасьцерагальна абрываюцца на першым радку. Пісьменнікі, якія ціха сядзелі — абы іх не чапалі — у сваіх літаратурна-мастацкіх выданнях і сваім пісьменніцкім Доме, ужо дачакаліся... Холдынг пад назовам «саюзная дзяржава» — рэальная перспэктыва і для ўсіх беларусаў. Няўжо ж беларусы настолькі бездапаможныя гаспадары, што гатовыя перасяліцца з уласнага дому ў інтэрнат для «брацкіх» народаў, аддаць уласную сядзібу ў новы «калгас», страціць дзяржаўнасць дзеля ўяўна абяцаных танных «энерганосьбітаў»?.. Ці знойдзецца сёньня на Беларусі хоць адзін здаровы чалавек, які адказа на гэтыя пытаньні станоўча?.. Не, нам жыць у незалежнай, суверэннай Беларусі. Нам непатрэбныя ніякія «холдынгі» ды «саюзныя дзяржавы». Нам непатрэбныя гаспадары над намі, якія будуць дыктаваць, што і як рабіць — што друкаваць, што пісаць, як пісаць і пра каго пісаць. Мы хочам быць самастойнымі і мы будзем такімі! На пачатку было Слова? Так, але за словам была Дзея! Дык ня будзем жа чакаць, будзем дзейнічаць!».*

Зразумела, што працай было пісаць падобныя словазвароты, — складаней і цяжэй ствараць і рэалізоўваць гэтыя планы. Тым больш, што ад пачатку заснавання рэдакцыя часопіса як была, так і па сённяшні застаецца нешматлікай і па сутнасці «хатняй». Можа гэта і добра. Няма вялікіх сварак і разборак, а набалелыя пытанні вырашаюцца калегіяльна і па-таварыску. Спадзяюся, што і юбілейны нумар часопіса прыдасца яе новым і сталым чытачам адмысловымі творамі і шырокай панарамай беларускіх рэалій. Але наўмысна яшчэ раз вярнуся да першага нумара «Дзеяслова». Якраз на яго старонках ужо тады апальны паэт Уладзімір Някляеў друкуе напісаную ім у Польшчы выдатную паэму «Паланэз», з узятымі рэдакцыяй для вынаскі радкамі: *«Радзіма сталася таварам! //Як на такой Радзіме жыць?..».* І вось жа так атрымалася, што сёння паэт апынуўся ў яшчэ большай апале — ён агулам, як у вядомыя сталінскія часы, пасаджаны за краты. І цяпер яго словы з той паэмы 2002 года гучаць як прарочыя:

*Вы — беларусы? Хто такія?*
*Ёсць Польшча,*
*Жмудзь,*
*Літва,*
*Расія —*
*Як вы ўшчаміліся сярод?*
*Адкуль зьявіліся? З балот?*
*З чаго зьляпіліся? З туманаў?..*
*Такіх падмен,*
*Такіх падманаў*
*Ня ведаў ні адзін народ.*
*І што цяпер? Хай так і будзе,*
*Абы нягорш? Вы што за людзі:*
*Вам зваціца хочацца людзьмі,*
*Ці імі быць,*
*Ці біцца ў грудзі —*
*Ці ўстаць за крэўны край грудзьмі?*

Сваім учынкам паэт, здаецца, зняў гэтыя набалелыя пытанні. Найперш для сябе самога. Але для большасці, на жаль, яны ўсё яшчэ актуальныя. Тым жа, хто паразумеўся з творцам, застаецца толькі прыкладваць магчымыя высілкі для вызвалення паэта з астрогу. Самому ж Уладзіміру Пракопавічу хочацца пажадаць словамі Таўлая *«плаваць вершамі краты»*, а нязломнасцю духу быць прыкладам і мацаваць веру ў тых, хто яшчэ хоча «людзьмі звацца».

Цяпер што да перад'юбілейнага (49) нумара часопіса. На мой погляд, найбольшай удачай не толькі апошніх нумароў часопіса, але і ўсяго года з'яўляецца раман **Людмілы Рублеўскай** «Сутарэнні Ромула». Нават тыя мае суб'ектыўныя заўвагі, якія я выказваў у папярэдніх аглядах і мог бы дадаць у гэтым (да прыкладу, папрокі пісьменніцы ў парнаграфіі некаторых аўтараў, пры гэтым поруч, пад сурдзінку, выдаючы самой «небяспечныя» пасажы на гэтую ж тэму), ніякім чынам не зацэняць літаратурную адмысловасць твора таленавітай пісьменніцы. Жанр фэнтэзі апраўданы ёю напоўніцу, вобразы і характары выпісаны нязмушана і запамінальна, не кажучы ўжо пра інтрыгу і востры сюжэт рамана ў цэлым. Аказваецца, што два варагуючыя кланы — Варановічаў і Вяжэвічаў — гэта выхадцы аднаго роду, браты па крыві. І вось якія высновы робіцца адным з герояў, калі ён даведваецца пра гэта, прачытаўшы старажытную вязь на пергаменце тэстаменту: *«Братняя кроў... — прашаптаў Даніла, не адплюшчваючы воч. — Божа мой, колькі мы адзін аднаму пралілі тое братняе крыві... Уся Беларусь залітая. Колькі маны. Колькі дарэмнай нянавісці. Здрады. Дурасці».* І ўжо зусім рэалістычна прачытваецца канец рамана, дзе «ўнутраны аўтар гэтай гісторыі» *«іранічны, шалёна-вясёлы, адчайны беларускі пісьменнік, не патрэбны масаваму чытачу»* Вячка пытаецца: *«Ну, чым жа завяршыць гэтую эпапею? — падумаў. — Вось што, скажыце мне, спадар Даніла, як у рамане Булгакава гаворыць майстар Понцію Пілату: «Свабодны!»*

*Корб-Варановіч сур'ёзна паглядзеў на аўтара і без ценю іроніі прамовіў адведзеную рэпліку:*

*— Свабодны!*

*— І вы таксама! Жыве Беларусь!*

*Раманіст падняў руку ў развітальным жэсце і выскачыў за дзверы палаты нумар шэсць, паспеўшы ў апошні момант размінуцца з каталкай, на якой везлі чарговага скалечанага незалежным жыццём беларускага індывіда ў абдоймы самай бясплатнай у свеце медыцыны».* Усе грамадзянскія і літаратурныя сімвалы і намёкі тут вызнаюцца актуальнымі. Мяркую, што некалі гэты твор будзе ўключаны ў хрэстаматыі для старшакласнікаў і ў навучальныя праграмы для студэнтаў ВНУ.

Цікавымі і нечым блізкімі да асноўнай ідэі рамана Л. Рублеўскай — адраджэнскай і нацыянальна-гістарычнай тэматыкі — і **тры кароткія аповеды Анатоля Івашчанкі,** але яны найперш вызначаюцца выразнай сучаснай псіхалагічнасцю і ўнутранымі аўтарскімі адсыламі да душы і духоўнасці. Асаблівa пранікся я — мажліва з прычыны нечаканасці знаёмства — лірычнай прозай **Алеся Тварановіча** «Бабіна лета» (паэма Берліна) і **Рыгора Сітніцы** «Ой, хадзем жа мы...» (калядная паэма ў прозе). Нейк нічым асабліва не зачапілі кароткія аповеды-запісы **Паліны Качатковай.** Выдрукаваны ў часопісе фарс у двух дзеях **Уладзіслава Ахроменкі** і **Максіма Клімковіча** «Русалка Камсамольскага возера» — своеасаблівая сцэнічная пародыя на сталічную беларускую рэчаіснасць. Не зважаючы на рэмаркі, рэч чытэльная, займальная, вясёлая, месцамі парадаксальная.

Парадаваў сваім маладым паэтычным духам адзін з аксакалаў нашай паэзіі **Генадзь Бураўкін.** У нізцы вершаў знанага паэта ёсць і традыцыйная грамадзянская лірыка, і праявы паэзіі чыстай красы *(«лісце ў лесе скача басаножа»),* і... гімн каханню *(«Але і, // Збалелы дазвання, // Сабе і табе не схлушу, // Што нават руіны кахання // Маю саграваюць душу».)* Словам:

*Паэтам не спіцца на панскім кіліме.*
*Яны не бываюць ніколі былымі.*
*Яны не старэюць,*
*Не паміраюць —*
*Яны,*
*Як высокія зоркі,*
*Згараюць...*

Астатнія вершаваныя публікацыі — адносныя, альбо, як кажуць, на аматара. Асаблівa крыўдна за таленавітую **Аксану Данільчык,** у якой цудоўныя творы перамяжоўваюцца з даволі пасрэднымі. Зрэшты, мажліва, гэты пасаж з яе верша гаворыць пра тое, чаго я *не дачуў* у іншых яе радках і высновах:

*гэта крапіва ведае як жыць*
*гэта крапіва ведае як выжываць*
*крапіва што вучыць*
*мяне трыванню*

Шчыра кажучы, ад вершаў **Юрася Шамецькі** і **Віктара Вабішчэвіча** я большага і не чакаў, у адрозненне ад вядомага празаіка **Сяргея Балаханава,** які заўважна стараўся, але ў паэзіі так нічым і не здзівіў мяне.

Парадавалі сваёй творчай неардынарнасцю дэбютанты часопіса: **Рыта Трайкевіч** (менавіта яе радок я скарыстаў для назову гэтага артыкула), якая выступіла з падборкай вершаў («Між астатніх пагроз нетрывалага часу // мне скалечыла лёс «беларуская кляса», //і збываюцца белачырвоныя сны //ў дні вялікай айчыннай ідэйнай вайны») і **Алесі Іванньковай** з невялікім апаведам «Чырвонае паліто» з суіцыднай медытацыяй, якая ажыўляецца прыстойным стылем пісьма. Безумоўна, варта адзначыць публікацыі з раздзела «Архівы і спадчына», прынамсі, заканчэнне «абрысаў няспраўджаных вершаў» **Уладзіміра Марука** і спробу эпісталярнай споведзі **Алеся Асташонка** «Помнік», якая пралівае святло на трагічнасць нядоўгага жыцця таленавітага пісьменніка.

Гэтым разам падаліся вельмі ўдалымі пераклады з **Рышарда Капусьцінскага** (эсэ «Майстэрства рэпарцёра», пераклад Р. Серыкава) і з **Сільвіі Плат** (нізка апошніх вершаў, пераклад В. Гапеевай). Праўда, як на маю думку, выбар твораў вядомай паэтэсы мог быць і трохі іншым, больш адмысловым, скажам, з перакладамі такіх вершаў, як «Праз возера», «Словы», «За мяжой»...

Вельмі дарэчная і своечасовая, калі не запозненая, публікацыя артыкула **Эдуарда Дубянецкага** «Хаатычна-фрагментарная культура: шлях у бездань або падмурак росвіту», ідэі якога я ў асноўным падзяляю. Калі што і зніжае энергетыку філасофска-культуралагічнага тэксту, то гэта самапаўторы некаторых ідэй і хаджэнне па коле (я хачу сказаць, што артыкул нічога не згубіў бы, калі б быў аўтарам самакрытычна і ўдумліва перачытаны і сям-там скарочаны). А сама тэма і пасыл гаворкі даўно наспелі, таму хацелася б, каб вакол іх неадкладна завязалася шчырая, цікавая ва ўсіх аспектах і карысная для нашай сучаснай літаратуры палеміка. Прыцягнуць пэўную ўвагу чытачоў і публікацыі «літарацкіх благаслаўленняў» (рэкамендацый) для ўступлення ў пісьменніцкі саюз, сабраныя **Сяргеем Шапранам,** і чарговая гутарка **Андрэя Масквіна** з таленавітай паэткай **Вікай Трэнас,** і «зацемкі з натуры» **Раісы Крывальцэвіч,** і «згадкі пра старэйшага сябра» (Г. Кісялёва) **Аляксея Каўкі,** і «рознапалярны розгалас» ды своестаўленне чытачоў і экспертаў да гістарычнай трылогіі **Васіля Якавенкі** «Пакутны век». Завяршае публікацыі часопіса рубрыка **«Дзеяпіс»** пра новыя кніжныя выданні.

Нельга не заўважыць, што ступіўшы на парог *дзеяслоўнага* юбілею — і рэдактары, і выдаўцы, і чытачы — поўныя творчага аптымізму ды мастацкіх ілюзій адносна далейшага літаратурнага росквіту нацыянальнага красная пісьменства, што абсалютна магчыма, а ўпадаючы ў экспрэсіўную крайнасць, скажам, проста непазбежна. Між іншым, апошнія скрушныя падзеі ў краіне гэтага майго доваду не абвяргаюць, як некаму, у тым ліку і ва ўладзе хацелася б, а наадварот, як мне падаецца, — прыспешваюць.

## ПАЛІЦА

**Андрасюк Міхась. Вуліца Добрай Надзеі: апавяданні. — Мінск: Медысонт, 2010. — 304 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 7.)**




Вядомы на Беласточчыне празаік і паэт, лаўрэат прэміі «Залаты апостраф» за 2009 год, супрацоўнік «Радыё Рацыя» Міхась Андрасюк нарэшце «мае кнігу» і на Беларусі. Чытачы «Дзеяслова» добра знаёмыя з творчасцю слыннага аўтара, але гэты зборнік будзе і для іх прыемным сюрпрызам. Бо гэта будзе падарожжа ў малазнаёмыя нам (хоць і блізкія) белавежскія, пушчанскія вёсачкі і мястэчкі, населеныя каларытнымі асобамі, якіх Міхась Андрасюк апісвае з асаблівай любоўю, а таксама лірычнай іроніяй і дасціпнасцю.

**Багданава Галіна. Сакрамэнта: апавяданні, аповесці. — Мінск: Медысонт, 2010. — 308 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 9.)**




Галіна Багданава чакала гэтую кнігу доўгіх шаснаццаць гадоў.Так, менавіта ў 1994 годзе выйшла яе апошняя кніга «Дом іхняе мары». У гэта цяжка паверыць, але гэта ёсць сапраўдная трагедыя літаратараў пакалення Г. Багданавай, якім цяпер зусім няшмат гадоў — каля 50, і якіх «рыначная эканоміка» і «дзяржаўная палітыка» пазбавілі сваіх чытачоў... Новая кніга Галіны Багданавай, якая цяпер выступае пад псеўданімам Галіна (друкавалася таксама як Галіна Ланеўская) — «шчырая споведзь перад сабою і перад чытачом пра наш час, пра вечныя пераўтварэнні кахання ў жыцці і вобразным свецe мастацтва».

**Бічэль Данута. Мост святога Францішка: успаміны. — Мінск: Медысонт, 2010. — 290 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 8.)**




Папярэднюю кнігу Дануты Бічэль з дзіўным назовам «Хадзі на мой голас» (2008, Гродня-Вроцлаў) паспелі ўжо ацаніць і палюбіць чытачы. «Мост святога Францішка» — своеасаблівы працяг гэтага зборніка. Аснову кнігі склалі згадкі пра людзей найраднейшых для Дануты Бічэль. Гэта кніга пра каханне і сяброўства, пра любоў да Бацькаўшчыны і людзей «духоўна прыгожых, якія жылі для саміх сябе, для сваіх блізкіх і для Радзімы, — у тым сэнсе, як яны разумеюць паняццe Радзімы»…

**Гілевіч Ніл. Дзверы ў гісторыю: сатыра і гумар. — Мінск, 2010. — 64 с.**




Назву кнізе далі наступныя дасціпныя радкі:

*Дзверы ў гісторыю вузкія вельмі,*
*Цяжка праходзяць і людзі, і шэльмы,*
*Дзверы ж адтуль — шырэй за вароты:*
*Вылеціш вон — і не ўспомняць хто ты.*

Вядома, гэта не першая кніга сатыры і гумару народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча. За шэсцьдзясят гадоў жыцця ў літаратуры ён выдаў больш за дзесяць такіх кніг, у тым ліку «Званковы валет», «Як я вучыўся жыць», «Сказ пра Лысую гару», «Ачмурэнне» і інш. У новую кнігу ўвайшлі сатырычныя вершы і эпіграмы, напісаныя з 1995 па 2010 год. Напрыканцы зборніка — гумарыстычныя сяброўскія пасланні ды жарты.

**Зуёнак Васіль. Выбраныя творы. Уклад., камент. аўтара; прадм. Н. Заяц. — Мінск: Кнігазбор, 2010. — 512 с.**




У пяцьдзясят пяты том «Кнігазбору» ўвайшлі выбраныя творы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы Васіля Зуёнка — вершы, паэма «Маўчанне травы» (адна з пяці паэм кнігі «Пяцірэчча»), а таксама празаічныя элегіі, эсэ, эцюды і літаратурна-крытычныя артыкулы. «Гаспадар паэтычнай Сялібы» — так назвала сваю прадмову да зборніка Наталля Заяц. Дык адгукнемся ж на яе і аўтара кнігі запрашэнне «судакрануцца з багатым набыткам гэтай Сялібы» і акунемся ў найбагацейшы паэтычны свет Паэта Васіля Зуёнка!

**Залоска Юрась. Праўда як рэлігія: гутаркі з Васілём Быкавым. — Мінск: Медысонт, 2010. — 192 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 6.)**




Рыгор Барадулін назваў у свой час Васіля Быкава Прарокам... Гутаркі журналіста і літаратара Юрася Залоскі з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым адбыліся ў сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя, але чытаюцца гэтак, нібыта не прайшло з таго часу 15 гадоў... Усё, пра што гаворыць Васіль Уладзіміравіч, якія «дыягназы» ставіць тагачаснаму ладу і як прагназуе будучыню — быццам прамоўленае сёння. Гэта, як сказана ў анатацыі, «нацыянальная споведзь «песіміста ў адносінах да пакалення свайго веку» і валадара беларускай нацыянальнай ідэалогіі будучыні — вялікага літаратара, мастацтвазнаўцы, філосафа, палітыка, грамадзяніна і прарока».

**Кандрацюк Ганна. Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. — Беласток: Праграмная рада тыднёвіка «Ніва», 2010. — 116 с.**




Кніга журналісткі тыднёвіка «Ніва» (Беласток, Польшча) Ганны Кандрацюк-Свярубскай — гэта распавед пра падарожжа на Беларусь, на радзіму паэта Анатоля Сыса ў вёску Гарошкаў у Рэчыцкім раёне, дзе адзначалася ягонае 50-годдзе, якое яна разам з паэткай Мірай Лукшай здзейсніла летась. Кніга насычаная ўспамінамі пра сустрэчы з Анатолем Сысам, уражаннямі ад наведвання Беларусі — а вандроўніцы пабывалі яшчэ і ў Гародні, Мінску, Жыровічах, дзе сустракаліся з вядомымі на Беларусі людзьмі, сябрамі Анатоля і тымі, хто яго ведаў. Кніга багата ілюстраваная фотаздымкамі, большасць з якіх друкуецца ўпершыню.

КОНКУРС

# ЛЕПШАЯ ДРУГАЯ…

**Паважаныя паэты і празаікі!**

**Шаноўныя аўтары, хто ўжо апублікаваў дэбютныя зборнікі!**

Саюз беларускіх пісьменнікаў абвяшчае Конкурс на лепшы рукапіс другой кнігі і ласкава запрашае дасылаць-перадаваць на суд нашага журы свае паэтычныя ці празаічныя зборнікі — на наступныя адрасы:

**220012, Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, д. 31, пак. 906;**
**e-mail: ubw.office@gmail.com.**

Чаму менавіта Конкурс другой кнігі? Як сведчыць беларуская выдавецкая ды і быццёвая практыка, менавіта ў стварэнні і выданні другой кнігі літаратары маюць найбольшыя праблемы і клопат.

Удзел у Конкурсе могуць браць аўтары і аўтаркі розных мастацкіх кірункаў і стыляў.

Перавага аддаецца літаратурнай моладзі.

Пераможца Конкурса атрымае адпаведны падарунак — бясплатнае выданне яго кнігі!

**Сакратарыят СБП**

ПРЭМІЯ

# ЛІТАРАТУРНАЯ ПРЭМІЯ ІМЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

У дзень народзінаў Максіма Багдановіча Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-цэнтр і Літаратурны музей імя Максіма Багдановіча абвесцілі пра заснаванне літаратурнай прэміі. Яна будзе ўручацца за найлепшы дэбют года ў трох намінацыях: паэзія, проза і пераклад.

«Да намінантаў Прэміі імя Максіма Багдановіча ёсць абавязковыя ўмовы, — кажа сябра журы, пісьменнік Уладзімір Арлоў. — Твор мае быць напісаны па-беларуску, аўтар на момант вылучэння мусіць мець не больш за 35 поўных гадоў».

Да разгляду журы прымае дэбютныя кнігі аўтараў, якія выйшлі цягам года. Могуць разглядацца і грунтоўныя публікацыі ў літаратурных часопісах (раман, аповесць, вялікі пераклады твор).

Спіс прэтэндэнтаў на Прэмію імя Максіма Багдановіча за 2010 год фармуецца да 14 лютага 2011 года.

Уручэнне адбудзецца напрыканцы сакавіка 2011 года.

Вылучэнні ад выдавецтваў і аўтараў з пазнакай «Прэмія імя Максіма Багдановіча» можна дасылаць на наступныя адрасы:



**ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»: вул. Кузьмы Чорнага, д. 31, пак.906, Мінск, 220012**
**E-mail: ubw.office@gmail.com**

**220050, а/с 218, Мінск.**
**E-mail: pen@vessobel.by.**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 4 ЛЮТАГА, ПЯТНІЦА

### Беларусь 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьмення» (Расія-Украіна).
**11.40** Дзённік публічнага конкурсу «Трыўмф. Героям спорту -2010».
**12.10** Меладрама «Бог смутку і радасці».
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** «Школа доктара Камароўскага».Токшоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў» (Расія).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Крымінальная меладрама «Зацьмення» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Прэм'ера. Драма «Добры» (Вялікабрытанія-Германія).
**23.45** Дакументальны цыкл «Неразгаданая гісторыя» (ЗША).
**00.35** Дак. цыкл «Зброя будучыні» (ЗША).
**01.20** Дзень спорту.

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** Цырымонія народнай прэміі «Залаты грамафон».
**00.05** «Наша Белараша».
**00.35** Фільм «На лініі агню».
**02.40** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.30** «Абанент часова недаступны». Серыял. Заключная серыя.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Дом Вялікай матулі 2». ЗША, 2006г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «І грымнуў гром». ЗША - Германія - Вялікабрытанія - Чэхія, 2005г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.30** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.30** Прыгодніцкі вестэрн «Узброены і вельмі небяспечны» (СССР).
**12.15** Гаспадар.
**12.45** Жывы гук.
**13.30** Кінаспробы.
**13.50** Пазакласная гадзіна.
**14.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**14.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**15.55** Усё аб бяспецы.
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.45** Халі-галі.
**18.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**20.30** «Калыханка».
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.40** «Бітва экстрасэнсаў».
**22.40** «Пра мастацтва».
**23.10** Дыялогі аб рыбалцы.
**23.35** Фантастычны трылер «Газонакасільшчык» (ЗША).
**01.30** Дэтэктыў «Пачаткоўцы ў паліцыі» (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**22.30** Навіны - Беларусь.
**22.40** «Дзяўчаты».
**23.40** Фільм «Ніколі не прамаўляйце з невядомымі».

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «У зоне адмысловай рызыкі».
**10.50** «Жывуць жа людзі!».
**11.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**12.10** «Да суду».
**13.30** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.55** «Нтвшнікі».
**22.05** Прэм'ера. Драма «Фантомны боль».
**23.55** Вострасюжэтны фільм «Дзень адчаю».

### EUROSPORT

**09.30** Санкавы спорт. Чэмпіянат свету ў Італіі (Чазана).
**10.30** Вось дык так!!!
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Цвізель). Жанчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**12.30, 15.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). HS 140.
**13.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**14.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Цвізель). Жанчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. Гонка пераследу.
**16.15** Зімовыя віды спорту. Біятлон. Часопіс.
**16.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША. Мужчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**18.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Кваліфікацыя. HS 213. Прамая трансляцыя.
**19.00** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Жанчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**20.30** Снукер. Мастэрс (Берлін). Дзень 3-і.
**21.00** Снукер. Мастэрс (Берлін). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**00.00** Шары. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ланэлі, Вялікабрытанія). Фінал.
**01.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**01.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі. Кваліфікацыя. HS 213.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы камentар.
**07.30** Праект «Будучыня».
**08.00** Рэпартэр.
**08.30** Маю права (праваВая праграма).
**08.50** Форум: «Яны і мы».
**09.30** «Школа на санцапёку», серыял.
**10.00** Басанож па свеце: «Штодзённае жыццё індзейцаў».
**10.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, Польшча, ч. 1.
**11.25** «Be Free–2008», фестываль: выступ гурта «Крама».
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Праект «Будучыня».
**12.30** Рэпартэр.
**13.00** Маю права (праваВая праграма).
**13.20** Форум: «Яны і мы».
**14.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**14.30** Басанож па свеце: «Штодзённае жыццё індзейцаў».
**14.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, Польшча, ч. 1.
**15.55** «Be Free–2008», фестываль: выступ гурта «Крама».
**16.25** «Ложак Леніна», дак. фільм, рэж. Кшыштаф Магоўскі, 1996 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 3 серыя.
**17.35** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**18.25** Форум: «Яны і мы».
**19.05** «Алкаш», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы камentар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** На колах.
**20.25** «Святаслаў Фёдараў – жыццё пасля смерці», дак. фільм, 2006 г., Беларусь: ч. 3: «Змагар».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі бал», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.05** «Happy New York», маст. фільм, 1997 г.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «З пекла».
**23.45** Аб'ектыў.
**00.10** Гарачы камentар.

## 5 ЛЮТАГА, СУБОТА

### Беларусь 1

**06.50** Дзень спорту.
**07.05** Мультфільмы.
**07.30** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.10** «Славянскі базар».
**10.40** Серыял «Сваты» (Украіна). 2-я серыя.
**12.10** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».
**13.50** Дак. цыкл «Невядомая версія».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Nota Bene.
**16.40** Дак. цыкл «Атлас Дыскаверы» (ЗША).
**17.40** Відэафільм АТН «Нараўлянская быль» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лата».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля-2010».
**21.00** Панарама.
**21.40** Прыгодніцкая драма «Ізгой» (ЗША).
**00.20** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**01.10** Дзень спорту.

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** Прэм'ера. «Смак жыцця».
**12.20** «Разумніцы і разумнікі».
**13.10** «Хвіліна славы».
**15.10** «Мой радавод».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.15** Фільм «Чалавек-павук 2».
**19.30** «Адзін супраць усіх».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.50** «Дэтэктар хлусні».
**23.50** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.30** Фільм «Хуткі і мёртвы».

### СТВ

**06.15** «Анфас».
**06.30** Фільм «Тры таўстуны». СССР, 1966 г.
**08.00** Фільм «Дом Вялікай матулі 2». ЗША.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.25** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** Фільм «Па галоўнай вуліцы з аркестрам». СССР, 1986 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Мой прынц». Украіна, 2006 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Падшыванец». ЗША, 2003г.
**23.25** Фільм «Шчасце Эмы». Германія.
**01.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.05** Нашы тэсты.
**07.35** Усё аб бяспецы.
**08.00** «Рэальны свет».
**08.30** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.05** Жансавет.
**09.40** Дача здароўя.
**10.25** Тэлебарометр.
**10.30** «Ты і Я». Забаўляльнае ток-шоў (Расія).
**11.30** «Запал па культуры».
**12.10** Дакументальны фільм «Жорсткі раманс Лідзіі Русланавай» (Расія).
**13.10** Сямейная меладрама «Маляня і Богіс» (ЗША).
**15.25** «Смешныя людзі» Гумарыстычная праграма (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Ньюкасл - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**18.55** Тэлебарометр.
**19.00** Музычна-дакументальны фільм «Ролінг Стоўнз. Няхай будзе свята» (ЗША-Вялікабрытанія).
**21.20** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**22.50** Жывы гук.
**23.30** Хакей. КХЛ. Матч зорак.
**01.20** Дэтэктыў «Пачаткоўцы ў паліцыі» (Францыя). Заключная серыя.

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.10** Фільм «Прыехалі на конкурс кухара…».
**08.30** «Крывое люстэрка».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Ніколі не прамаўляйце з невядомымі».
**13.20** «Пакой смеху».
**14.15** «Гарадок». Дайджэст.
**14.45** «Шукальнікі». Дак. фільм.
**15.40** «Казачныя прыгажуні. Жыццё пасля славы». Дакументальны фільм.
**16.40** «Мой срэбны шар».
**17.45** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Тэлесерыял «Цыганачка з выхадам».
**00.00** Фільм «Заканы па ўласным жаданні».

### НТВ

**07.30** «Агляд».
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «ФДР: Саюзнік гісторыі».
**14.10** Камедыйны баявік «Дзеці шпіёнаў».
**16.20** «Апошняе слова».
**17.30** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Руская сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.05** «Музычны рынг НТБ».
**00.25** Прэм'ера. Біяграфічная драма «Буш».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Кваліфікацыя. HS 213.
**10.00** Зімовыя віды спорту. Біятлон. Часопіс.
**10.15** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Мужчыны. Спрынт.
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Цвізель). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Хінтэрстодэр). Мужчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**13.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Цвізель). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.45** Снукер. Мастэрс (Берлін). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**17.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 213. Прамая трансляцыя.
**18.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем.
**19.15** Снукер. Мастэрс (Берлін). 1/2 фіналу.
**20.00** Снукер. Мастэрс (Берлін). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**21.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**22.45** Снукер. Мастэрс (Берлін). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.30** Снукер. Мастэрс (Берлін). 1/2 фіналу.
**00.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Janus Fight Night.
**02.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 213.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы камentар.
**07.30** На колах.
**08.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**08.50** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 3 серыя.
**09.20** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45** «Святаслаў Фёдараў – жыццё пасля смерці», дак. фільм, Беларусь: ч. 3: «Змагар».
**10.15** Без рэтушы.
**10.35** «Алкаш», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**10.55** Госць «Белсату».
**11.10** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі бал», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**11.35** Асабісты капітал.
**11.50** Форум: «Яны і мы».
**12.35** На колах.
**13.00** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 3 серыя.
**13.35** Калыханка для самых маленькіх.
**14.00** «Транзіт», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**14.35** «Happy New York», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**16.10** «Ранча», серыял: 29 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.05** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Анна, сем год на лініі фронту», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**19.25** Навігатар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.35** «Цяжкі», дак. фільм, 2007 г., Украіна.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Кроўны брат», маст. фільм, 2001 г., ЗША.
**22.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Зінка».
**23.05** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 6 ЛЮТАГА, НАДЗЕЛЯ

**07.55** Дзень спорту.
**08.05** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальны фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Альманах вандраванняў.
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** «Культурныя людзі».
**11.20** «Школа доктара Камароўскага». Токшоў (Украіна).
**12.15** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».
**13.55** Дакументальны фільм цыклу «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Адмысловы рэпартаж АТН «Генетычны код».
**15.45** Трагікамедыя «Нябёсы запаветныя» (СССР).
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Вострасюжэтная драма «Грошы на дваіх» (ЗША).

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** «Фазэнда».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.20** Лірычная камедыя «Насця».
**15.05** «КВЗ. 50 віртуальных гульняў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**17.30** Прэм'ера АНТ. «Эстрадны кактэйль».
**18.45** Прэм'ера АНТ. «Зачыстка».
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Пахавайце мяне за ліштвой».
**23.15** Прэм'ера. «Шоў».
**23.45** Камедыя «Дракула мёртвы і задаволены».

**06.10** Фільм «Сумленнае чарадзейнае». СССР, 1975 г.
**07.20** Фільм «Падшыванец». ЗША, 2003 г.
**09.00** СТВ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Ганна на шыі». СССР, 1954 г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Дурняў няма». ЗША, 1994 г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.45** Фільм «Бразілія». Вялікабрытанія, 1985 г.
**02.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**08.00** Дабравест.
**08.30** Мір вашай хаце.
**08.40** Прэм'ера. Дакументальна-пазнавальны фільм «Сурыкаты» (Вялікабрытанія).
**10.15** Медычныя таямніцы.
**10.55** Школа рамонту.
**12.05** Тэлебарометр.
**12.10** Нашы тэсты.
**12.50** Кінаспробы.
**13.10** «Правы чалавека».
**13.25** Бухта капітанаў.
**14.05** Канцэрт ансамбля «Бяседа».
**15.55** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Чэлсі - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**19.55** Смешная часіна.
**20.30** Тэлебарометр.
**20.50** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
**21.45** Драма «Здымкі ў Палерма» (Германія-Францыя-Італія).
**23.45** Культасвет.
**00.15** Канцэрт «Shakira. Oral Fixation Tour» (ЗША).

РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.50** Тэлесерыял «Цыганачка з выхадам».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Уся Расія».
**12.20** Фільм «Лёгкая вада».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка раманса».
**15.40** «Жарты вялікага чалавека. Яўген Маргуноў». Дакументальны фільм.
**16.40** Фільм «Дажывем да панядзелка».
**18.35** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.20** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.20** Фільм «Самотны гулец».

НТВ

**07.40** Мультфільм «Баранкін, будзь чалавекам!».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Таямнічая Расія».
**14.10** Дэтэктыў «Шпількі-3».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Помста без права перадачы».
**23.50** «Асабліва небяспечны!».
**00.20** «Нерэальная палітыка».

EUROSPORT

**09.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Змяшаная эстафета.
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Хінтэрстодэр). Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. 4х10 км. Прамая трансляцыя.
**13.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 213.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Хінтэрстодэр). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Каманды. HS 213. Прамая трансляцыя.
**16.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. 4х5 км.
**17.00** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Мужчыны. Гонка пераследу.
**17.45** Снукер. Мастэрс (Берлін). Фінал.
**19.00** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**19.40** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**19.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Каманды. HS 213.
**21.00** Снукер. Мастэрс (Берлін). Фінал. Прамая трансляцыя.
**00.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Каманды. HS 213.
**01.00** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Мужчыны. Гонка пераследу.
**01.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Жанчыны. Гонка пераследу.
**02.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. 4х10 км.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**08.35** «Чароўнае дрэва», серыял.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** Форум: «Яны і мы».
**10.10** Навігатар.
**10.25** «Цяжкі», дак. фільм, 2007 г., Украіна.
**10.45** Вагон.
**10.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.05** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Анна, сем год на лініі фронту», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**12.25** Еўропа сёння.
**12.55** «Чароўнае дрэва», серыял.
**13.20** Калыханка для самых маленькіх.
**13.45** МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Лявона Вольскага.
**14.20** «Кроўны брат», маст. фільм, 2001 г., ЗША.
**16.00** «Ранча», серыял: 30 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.10** «Час гонару», серыял: 15 серыя.
**18.00** Прыватная калекцыя.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, 2003 г., ЗША.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Сымон Будны».
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце: «Мужчынскі свет».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Сонечная дзяржава», маст. фільм, 2005 г., Чэхія.
**23.30** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Будаўніцтва».
**23.40** Тыдзень у «Аб'ектыве».

---


# Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, афоміўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Віцебск: (8 029) 308 49 78, Юрый.
Масты: (8 029) 138 79 94, Дзмітрый.
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей,
(8 029) 178 31 68, Вольга,
(8 029) 625 57 51, Аксана.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Шаноўныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 625 57 51.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик

Кассир

Пеня

Всего

# Для тых, хто прымае рашэнні!

НОВЫ ЧАС

**www.novychas.org**

МЕРКАВАННЕ

# НАЗАРБАЕЎ НАЗАЎСЁДЫ

**СНД працягвае здзіўляць свет сваім арыгінальным разуменнем дэмакратыі. Апошнімі прарывамі тут былі выбары ў Беларусі і ініцыятыва казахскіх уладаў. У Астане вырашылі прэзідэнцкія выбары ўвогуле не праводзіць, а працягнуць тэрмін кадэнцыі Назарбаева на 10 гадоў за кошт рэферэндуму. Пра апошнія падзеі ў Казахстане журналіст газеты «НЧ» размаўляе з Андрэем Грышыным, палітолагам з Алма-Аты.**



***— Наколькі нечаканай для грамадства аказалася навіна пра рэферэндум?***

— Гэта быў абсалютны сюрпрыз. Тым больш, што пра рэферэндум даведаліся напярэдадні Новага году, калі ўсе расслабіліся. А тут замест салата аліўе — разнарадка збіраць подпісы ў падтрымку плебісцыту. Палітыкум таксама аказаўся не ў сваёй талерцы. Усе меркавалі, што выбары пройдуць, як і планавалася, у 2012 годзе. Апазіцыя нават пачала выстаўляць кандыдатаў. Самі ўлады неадназова казалі, што чуткі пра рэферэндум не маюць ніякіх падстаў. Сёння высвятляецца, што на самай справе схема была распрацаваная даўно. Нядаўна дэпутат Кайсараў у інтэрв'ю прагаварыўся, што дэпутатам Еўрапарламента гэтая ідэя была быццам вядомая яшчэ ў кастрычніку мінулага года. Больш таго, яе агучыў сам жа елбасы (па-казахску «лідар нацыі» — так, адпаведна Кастытуцыі, цяпер гучыць тытул Назарбаева).

***— Якая афіцыйная матывіроўка неабходнасці правядзення рэферэндуму?***

— Афіцыйная матывіроўка не вытрымлівае ніякай крытыкі — маўляў, каб не марнавацца на непатрэбныя прэзідэнцкія выбары і зэканоміць для радзімы грошы. Усё адно перамажа Назарбаеў, так навошта яшчэ рабіць нейкія рухі? А грошы, якія можна зэканоміць на выбарах, пойдуць на барацьбу з крызісам. Гэта цалкам супярэчлівая аргументацыя. Вось перада мной «Казахстанская правда» за 26 студзеня, якая піша наступнае: «Нялёгкія 90-я гады мінулага стагоддзя. Гэта былі сапраўды цяжкія часы, але дзякуючы мудрай палітыцы прэзідэнта ад крызісу не засталося і следу, а апошні сусветны эканамічны катаклізм казахі практычна не адчулі. Эфектыўныя меры кіраўніцтва краіны, наадварот, дазволілі не проста паспяхова змагацца з негатыўнай з'явай, а пачаць мадэрнізацыю дзяржавы — распрацаваць дэталёвы план фарсіраванай індустрыялізацыі. І, натуральна, за гэтыя маштабныя пераўтварэнні ў рэспубліцы кожны жыхар краіны дзякуе свайго лідара». Адсюль пытанне — калі крызісу ў нас нават не адчуваецца, нашто рэферэндум, які праводзіцца менавіта для таго, каб пераадолець яго наступствы?

***— Наколькі праект рэферэндуму адпавядае Канстытуцыі краіны?***

— У грамадстве зараз ідзе юрыдычная бойка. Лаяльныя праваазнаўцы даказваюць, што рэферэндум цалкам адпавядае духу канстытуцыі. Ні ў канстытуцыі, ні ў законе пра рэферэндум і ні ў якіх-небудзь іншых законах няма забароны на тое, каб вынесці пытанне пра падаўжэнне паўнамоцтваў прэзідэнта на рэферэндум. Незалежная прававая ацэнка сыходзіць з тэзісу пра тое, што, паводле канстытуцыі, правы і свабоды чалавека належаць кожнаму ад нараджэння і прызнаюцца абсалютнымі і неадчужальнымі. Нельга шляхам прыняцця паправак фактычна пазбавіць грамадзян права абірацца і быць абранымі. Незалежна ад таго, якая колькасць людзей жадае рэферэндуму. Варта дадаць, што, паводле Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека пры АБСЕ, гэта супярэчыць міжнароднаму праву, якое прызнае Казахстан.

***— Чаму Назарбаеў насамрэч даў дабро на рэферэндум?***

— Становішча ў Казахстане імкліва пагаршаецца, і Назарбаеў гэтага не можа не адчуваць. Кошты на прадукты, на камунальныя паслугі рэзка ўзляцелі, павялічыліся ў разы — а нават апошнія рэвалюцыі ў Кіргізіі, у Тунісе, беспарадкі ў Еўропе і на Блізкім Усходзе паходзяць з-за сацыяльна-эканамічных праблем. Да таго ж відавочныя правалы і ў іншых сферах. Сёлета тры гарады Казахстана замярзалі пры 30-градусным марозе — паляцелі сістэмы ацяплення, якія працуюць з савецкіх часоў. Адначасова амаль у дзясятку гарадоў адбыліся прарывы водаправодаў. Гэта значыць, разбураецца сама сістэма. Краіна запускае толькі нафтаправоды, забыўшыся пра ўсё іншае. Праграма «100 школ — 100 шпіталяў» правалілася, праграма развіцця «сіліконавай даліны» ў Казахстане правалілася, праваліліся запускі шэрагу прадпрыемстваў. Найбагацейшая краіна фактычна жыве на крэдытах, нічога пры гэтым не вырабляючы. Адзін з апошніх крэдытаў быў атрыманы ад Кітая пад зямельныя гарантыі. Іншымі словамі, зорны час Назарбаева як эфектыўнага кіраўніка даўно мінуў, затое на змену прыйшлі правалы ў знешняй і ўнутранай палітыцы, сталыя скандалы сярод сяброў «сям'і». Зразумела, што пры такім раскладзе Назарбаеў разумее, што свой электарат ён згубіў. Да таго ж новая рэвалюцыя ў Кіргізіі і выхад апазіцыі ў Мінску, думаецца, таксама сталі фактарамі. Вось чаму Назарбаеву трэба ўтрымацца любым коштам і не дапускаць палітычных эскалацый, якія цалкам верагодныя ў выбарчы перыяд.

***— Збор подпісаў за рэферэндум — прымус, ці людзі ўсё ж гэту ідэю падтрымліваюць?***

— Пра якую падтрымку можа ісці гаворка? Мяркуйце, ці рэальна за пяць дзён сабраць 5 мільёнаў подпісаў пры ўмове, каб да кожнага чалавека да хаты прыйшоў агітатар, доўга пераконваў і агітаваў. Акрамя таго, па закону, збіраць подпісы могуць толькі сябры ініцыятыўнай групы, якая складаецца з 460 чалавек. Яны фізічна не могуць прайсці столькі кватэр. Усё было як звычайна — у школы, у інстытуты, ва ўсе дзяржустановы, на вытворчасці, нават прыватныя кампаніі прыйшлі разнарадкі — сабраць подпісы, а інакш самі ведаеце, што будзе. І гэта не галаслоўныя абвінавачванні — пяцёра маіх знаёмых (хтосьці працуе, у кагосьці дзеці ў школе вучацца) так ці інакш вымусілі аддаць свае подпісы. Прамых пагроз, вядома, таксама няма, але ўсё выдатна разумеюць, што рэакцыя непазбежная.

***— Нашто Назарбаеву былі такія цяжкасці: 6 студзеня ён наклаў на Закон пра рэферэндум вета, а парламент зноў сабраўся і абсалютнай большасцю пераадолеў вета прэзідэнта?***

— А гэта ў нас старыя і традыцыйныя гульні. Парламентарыі-рэтраграды і народ, які любіць уладу, прапануюць ініцыятыву. Захад незадаволена моршчыцца, і ўслед за гэтым моршчыцца Назарбаеў — мне, маўляў, таксама непрыемна, але што я магу зрабіць. І высвятляецца, што нічога прэзідэнт зрабіць не можа: парламентары заўсёды знаходзяць заканадаўчы ход, каб пайсці супраць волі прэзідэнта. Так было, калі Назарбаеву давалі тытул «лідар нацыі», так было з некаторымі драконаўскімі законапраектамі. Але затое сам Назарбаеў заставаўся заўсёды ў белым.

***— Якая рэакцыя на апошнія падзеі з боку Расіі і Захаду?***

— Расіі абсалютна ўсё роўна, што тут робіць Назарбаеў. Да таго ж ён паказаў Расіі, што пакуль ён пры ўладзе, нацыяналістычную карту разыграваць не дазволіць (прынамсі без яго санкцыі). Ва ўсім іншым Расіі ён цалкам падыходзіць. У Захаду ж свае гульні. Захад кожны раз выяўляе сваю незадаволенасць, але пры гэтым працягвае верыць у тое, што Назарбаеў не пры чым, ва ўсім вінаваты парламент, сілавыя структуры, урэшце, народ, які патрабуе аўтарытарную ўладу. Ды і наогул, што разумець пад Захадам: незадаволенасць выяўляе хіба што ЗША, ну і, можа, быць Нарвегія. А Італія, Францыя, Германія праяўляюць толькі сваё захапленне поспехамі Казахстана і яго лідара. Як правіла, пасля такія дыфірамбы падмацоўваюцца новымі кантрактамі.

***— Што кажа просты народ на прыпынках і ў курылках? Якія сцэнары развіцця краіны на бліжэйшыя гады?***

— «Народ безмолвствует». Хіба што знаходзіць аддушыну ў інтэрнэце. Шмат каментараў на падзеі ў Тунісе, асабліва на тое, як тунiскі народ распраўляецца з сябрамі прэзідэнцкай сям'і. Ну а сцэнары… Недзе ўвесну пройдзе рэферэндум, аднак наўрад ці нехта з простых казахаў ставіцца да яго сур'ёзна. Усё жывуць сённяшнім днём, хто можа — той вывозіць грошы з Казахстана, ці прынамсі вывозіць дзяцей на навучанне за мяжу. І ў першую чаргу, службоўцы, якія ўвесь час б'юць сябе ў грудзі і кажуць пра любоў да радзімы. Думаю, гэта лепшы паказчык таго, што пацукі ўжо пакідаюць карабель.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Такіх суровых рэпрэсій мы не назіралі шмат гадоў. І, падобна, яны становяцца перманентнымі. Немагчыма не заўважыць паралеляў паміж Польшчай 1980-х і сучаснай Беларуссю. Галоўнае зараз — захаваць прастору для дзейнасці апазіцыі. Важна, каб апазіцыя засталася ў Беларусі. Важна таксама, каб яна ведала, што яе падтрымліваюць у Еўропе: апазіцыі давядзецца рыхтавацца да цяжкіх часоў.

**«The Washington Post» (ЗША)**

Разгон мітынгу ў Мінску быў не проста памылкай, а нейкім феерычным ідыятызмам. Калі за Лукашэнку прагаласавала большасць грамадзян, а нават апазіцыя, кажучы пра фальсіфікацыі, не называе лічбаў менш за 40 працэнтаў падтрымкі «Бацькі», навошта было пасля гэтага дэманстраваць сілу? Раніцай дворнікі навялі б парадак, і ўсё было б акурат як у Еўропе. І няма да чаго прычапіцца. А цяпер Лукашэнка, перамогшы на выбарах, прайграў амаль усё, чаго старанна дамагаўся доўгія гады. Выстаўлены з Еўропы, ён ужо не зможа праводзіць больш-менш незалежную палітыку ў адносінах да Масквы. Гэта можа апынуцца канцом «беларускага цуду», і ўсяму віной проста казачная неабдуманасць. Інтэлігенцыю і моладзь Лукашэнка ўжо страціў, і беззваротна, але як толькі пачнуцца эканамічныя цяжкасці, ён страціць і асноўную масу грамадзян, якія галасуюць за яго толькі дзеля адноснага сацыяльнага дабрабыту — ніякай палітычнай ці маральнай матывацыі ў галасаванні большасці няма. Скончыцца кармушка — скончыцца і любоў.

**«Форум» (Расія)**

Лукашэнка на працягу некалькіх гадоў спрабаваў супрацьпаставіць адзін аднаму Расію і Захад, намякаючы на змякчэнне свайго аўтарытарнага кіравання з мэтай прыцягнення абмежаванай дапамогі Захаду і змякчэнні гістарычнай залежнасці сваёй краіны ад Масквы. Яго баланс пахіснуўся ў дзень прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня, калі ўвечары быў разагнаны шматтысячны натоўп пратэстуючых. Пакуль ЗША і блок ЕС з 27 дзяржаў разглядаюць скаардынаваную забарону на выдачу віз і замарожванне банкаўскіх рахункаў высокапастаўленых беларускіх службоўцаў, Расія выступіла з прапановамі пра супрацоўніцтва з Мінскам. Але Расія патрабуе шмат чаго ў абмен на сваю шчодрасць. Расія імкнецца да падвышэння коштаў на нафту і газ для Беларусі, а таксама настойвае на саступках, якім пярэчыць Лукашэнка. Гаворка ідзе пра долю ў беларускіх нафтавых кампаніях і энергетычнай інфраструктуры.

**«The Wall Street Journal» (ЗША)**

У Мінску, нягледзячы на нядаўнія пагрозы Аляксандра Лукашэнкі цвёрда адказаць на санкцыі, якія будуць уведзены супраць Беларусі, сёння вырашылі перачакаць і паглядзець, што насамрэч будзе. У эфектыўнасць прынятых Еўропай выхаваўчых мер для Лукашэнкі і яго асяроддзі мала хто верыць — усё гэта Мінск ужо праходзіў. У дадатак існуюць надзеі на падтрымку Масквы, якая хоць і сварыцца з Мінскам, аднак не збіраецца выключаць яе з зоны ўплыву. Праўда, у беларускай сталіцы пры гэтым не заўважаюць ці не жадаюць заўважаць таго, што Масква ў гэты раз не спяшаецца расчыняць абдымкі для саюзніцы, што пацвярджае адсутнасць на інаўгурацыі Аляксандра Лукашэнкі прэзідэнта РФ. Крэмль трымае паўзу ў чаканні крокаў ЕС. І таму хутчэй будзе прыкормліваць Мінск, але не карміць яго, як было раней.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. БАНДЭРАЎЦЫ ЗА МЭЛА ГІБСАНА



Адэскае аддзяленне ўкраінскай нацыяналістычнай арганізацыі «Свабода» выступіла ў абарону Мэла Гібсана — вядомага амерыканскага акцёра і рэжысёра. Зараз яго судзяць за збіццё сваёй былой жонкі — расійскай мадэлі. На думку «свабодаўцаў», сапраўдная прычына суда — свядомая грамадская пазіцыя Мэла. «Мэл Гібсан — абаронца традыцыйных каштоўнасцяў, у свой час ён асудзіў вайну ў Іраку, выступаў супраць эўтаназіі, ставіў пытанне пра галадамор ва Украіне, асуджаў гомасексуалізм». Па версіі нацыяналістаў, каб засудзіць традыцыяналіста-антыліберала, улады ЗША скарысталіся сямейнымі разборкамі ў сям'і Гібсана. «Патрабуем спыніць ціск на гэтую выдатную персону. У ліберальным свеце не існуе аб'ектыўнага правасуддзя, а ёсць толькі крывое люстэрка, у якім можна пабачыць нянавісць да сапраўднай культуры, якую ўвасабляе Мэл Гібсан», — сцвярджаюць ультраправыя.

**Па матэрыялах сайта «Аб'яднанне «Свабода» (Украіна)**

### ФРАНЦЫЯ. ШТО РАБІЦЬ З ПІСЬМЕННІКАМ-АНТЫСЕМІТАМ?



У Францыі скандал вакол фігуры Луі-Фердынанда Селіна. Селін — вядомы літаратар першай паловы XX стагоддзя, аўтар славутага рамана «Падарожжа на край ночы». Калі пачалася вайна, Селін падтрымаў рэжым Вішы, пісаў антысеміцкія памфлеты, за што пазней трапіў у турму. Памёр Луі-Фердынанд у 1961 годзе. Праз нейкі час цікавасць да яго творчасці зноў вырасла. Таму няма нічога дзіўнага, што ў Мінкультуры вырашылі адсвяткаваць 50-ю гадавіну смерці пісьменніка. Дату ягонай смерці — 1 ліпеня — унеслі ў каляндар культурных дат. Аднак тут на сцэну выйшла Асацыяцыя нашчадкаў дэпартаваных яўрэяў і запатрабавала выключыць дату са спісу. Матыў просты: Селін пісаў антысеміцкія пасквілі, робячы свой унёсак у Халакост. У выніку імя Селіна вырашылі з календара ўсё ж выкрасліць. Праўда, гэта не значыць, што гадавіна смерці пісьменніка застанецца нікім не заўважанай. Селін — другі пасля Марсэля Пруста самы папулярны французскі пісьменнік у свеце, і, думаюцца, яго прыхільнікі 1 ліпеня арганізуюць якую-небудзь імпрэзу.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### КУБА. ДЫПЛАМАТАМ ЗАБАРАНЯЮЦЬ СУСТРАКАЦЦА З ДЫСІДЭНТАМІ



Кубінскае МЗС распаўсюдзіла заяву, прысвечаную паводзінам Роберта Джэкабсана, віцэ-міністра замежных спраў ЗША, на востраве Свабоды. У сярэдзіне студзеня ён наведаў Кубу, каб правесці перамовы па праблемах кубінскай міграцыі. Кубінскаму МЗС не спадабалася тое, што пасля афіцыйнай часткі візіту Роберт сустрэўся з прадстаўнікамі апазіцыі. Па словах кубінцаў, тая сустрэча «надала тэрарыстам і злачынцам» (так называюць апазіцыянераў у афіцыйнай прэсе) імпульс «актыўна дзейнічаць». Дзяржаўная прэса сцвярджае, што амерыканец даў дысідэнтам інструкцыю пашыраць інфармацыю пра асаблівы статус кубінцаў у ЗША. Кубінцы — адзіная нацыя ў Новым свеце, прадстаўнікі якой аўтаматычна атрымліваюць у ЗША правы на палітычны прытулак. Апошнім часам на Кубе назіраецца новая хваля нелегальнай эміграцыі ў Штаты, асабліва сярод адукаванай моладзі. Гавана просіць Вашынгтон адмяніць прывілеі для кубінскіх эмігрантаў у абмен на правы амерыканцаў — былых грамадзян Кубы — наведваць радзіму.

**Па матэрыялах «Junge Wet» (Германія)**

СКАНДАЛ

# АГЕНТ ПАКАЯЎСЯ

**Алег НОВІКАЎ**



**Самы буйны шпіёнскі скандал у Вялікабрытаніі за апошнія часы: сакрэтны агент брытанскай паліцыі прызнаўся, што быў інфільтраваны ў шэрагі эколагаў з мэтай дыскрэдытацыі іх руху.**

10 студзеня ў Вялікабрытаніі павінен быў стартаваць судовы працэс, якога чакала ўся краіна. Перад Фемідай мусілі паўстаць шэсць эколагаў, арыштаваных у снежні 2009 года ў адной са школ Нотынгема. Яны сабраліся, каб абмеркаваць акцыю пратэсту супраць вугальнай электрастанцыі Ratcliffe-on-Soar — трэцяга па колькасці выкідаў вуглякіслага газу ў краіне забруджвальніка паветра. Але да акцыі не дайшло — у той жа вечар усіх іх арыштавалі.

Эколагі, як сцвярджалі матэрыялы следства, планавалі вывесці аб'ект з эксплуатацыі з дапамогай акупацыі тэрыторыі станцыі і дыверсіі. Гэта павінна было прыпыніць працу электрастанцыі на некалькі дзён і прыцягнула б увагу грамадства да праблемы экалогіі і змянення клімату.

Але ў выніку чаканага працэсу не атрымалася. У абвінаваўчага боку не аказалася дастатковай базы доказаў. Абвінавачванне было пабудавана на сведчаннях сакрэтнага агента, які быў інфільтраваны ў шэрагі «зялёных». Прыкладна за месяц да пачатку працэсу агент нечакана адмовіўся сведчыць. Больш таго, раскрыў сваё імя і пакаяўся на публіцы за тое, што нарабіў.

З-за адсутнасці галоўнага сведкі абвінавачвання падазраваных у падрыхтоўцы тэракту эколагаў давялося ў выніку адпусціць на волю без суда.

Агента завуць Марк Кенэдзі, хаця сярод эколагаў яго ўсе ведалі пад прозвішчам Марк Стоўн. У задачу Марка ўваходзіла праца з эколагамі, прычым не толькі брытанскімі. Марк за гады сваёй службы (ён быў у шэрагах абаронцаў прыроды з 2000 года) наведаў 22 краіны, кантактуючы з рознымі экалагічнымі групоўкамі, складаючы на кожную з іх спецыяльнае дасье.

Зборам інфармацыі круг задач Марка не абмяжоўваўся. Ён удзельнічаў у планаванні шматлікіх радыкальных экалагічных акцый. Адказваў за іх лагістыку і пошук сродкаў. Грошы, якія ён знаходзіў, як правіла, яму кэшам выдавалі з паліцэйскай касы. Іншымі словамі, Марк Кенэдзі быў не пасіўным шпіёнам, а агентам-правакатарам. Па загаду начальства, ён правакаваў рух на радыкальныя ўчынкі, якія дыскрэдытавалі «зялёных» у вачах грамадства.

Менавіта Марк прапанаваў экалагічным актывістам абясточыць станцыю ў Нотынгеме. Менавіта ён аплаціў білеты ўдзельнікаў фатальнай сустрэчы ў школе. У той калядны вечар у



будынку школы сабралася 114 чалавек. Сам Марк на сустрэчу не прыйшоў. Затое нечакана ў памяшканне ўваліліся чатыры сотні паліцэйскіх, якія затрымалі ўсіх прысутных.

Да гонару Кенэдзі, у канцы мінулага года ён прызнаўся ў тым, што арганізаваў сход у школе па інструкцыі паліцыі. Ён таксама сказаў, што яму «сорамна за тое, што ён зрабіў», і за тое, што «прынёс людзям так шмат шкоды». Былы агент звярнуўся да адвакатаў абвінавачаных з прапановай дапамогі. Пасля прызнання Марка звольнілі з паліцыі, і ён адразу ж са сваёй сям'ёй паспяшаўся схавацца за мяжой.

Прыгоды Кенэдзі-Стоўна нарабілі шмат шуму. Прычым не толькі ў Англіі. Кенэдзі падарожнічаў па свеце з фальшывым пашпартам на імя Стоўна, уступаў у кантакты з грамадзянамі гэтых краін, штурхаў іх на экстрэмісцкія дзеянні.

Нямецкае МУС ужо запатрабавала ад брытанскіх калегаў дадатковай інфармацыі наконт таго, як іх супрацоўнік мог наведваць ФРГ па фальшывых дакументах. У сваю чаргу, група апазіцыйных дэпутатаў Бундэстага лічыць, што нямецкая паліцыя ведала пра тое, што брытанскі эколаг — таемны агент. Пры гэтым яны таксама карысталіся яго паслугамі для атрымання інфармацыі пра арганізатараў экалагічных пратэстаў у ФРГ.

Але і ў самой Брытаніі вакол справы Кенэдзі хапае эмоцый. Па-першае, усіх шакавала заробкі агента. Калі верыць яму самому, штогод Марк атрымліваў з бюджэту 250–300 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Акрамя таго, цалкам верагодна, што Марк быў не адзіным «засланым казачком». Сам ён сцвярджае, што асабіста ведае яшчэ некалькі супрацоўнікаў спецслужбаў, якія працуюць на радыкальнай экалагічнай глебе. У якую суму ўлятае падаткаплацельшчыку іх «праца»? — задаюцца пытаннем газеты.

Партыя Зялёных Англіі і партыя лейбарыстаў ужо прынялі спецыяльную заяву супраць практыкі шпіянажу за экалагічнымі і сацыяльнымі актывістамі.

«Кідацца такімі вялізнымі сумамі для таго, каб кантраляваць экалагічную грамадскасць, не што іншае, як пустая растрата грошай. Падобныя аператыўныя дзеянні не могуць ужывацца супраць людзей, якія не плануюць гвалтоўныя акцыі», — гаворыцца ў партыйнай заяве Зялёных.

Але самае галоўнае заключаецца ў тым, што правакатарская дзейнасць Марка і яму падобных з'яўляецца пагрозай для грамадскай актыўнасці. Любую грамадзянскую ініцыятыву такія людзі, як Кенэдзі, могуць лёгка дыскрэдытаваць. Менавіта так было ў выпадку з арыштам у Нотынгеме. Большасць з затрыманых падчас зачысткі ў школе былі звычайнымі эколагамі, якіх запрасілі на сход, на парадку дня якога не было пытання пра дыверсію на станцыі. Але ў выніку на ўсіх іх павесілі кляймо «арганізатар тэракту».

Таму апазіцыя запатрабавала ў дырэкцыі МУС справаздачы наконт агентурнай працы сярод абаронцаў прыроды і адказу на пытанне: чым жа займаюцца агенты — збіраюць інфармацыю або самі правакуюць арганізацыі?

Пакуль паліцыя і ўрад не каментуюць справу Марка Кенэдзі. Звычайна спісваюць інцыдэнт на «праклятую спадчыну» папярэдняга кабінета лейбарыстаў.

Зрэшты, адзін з паліцэйскіх бонзаў прызнаўся, што справа Кенэдзі прымусіць спецслужбы змяніць тактыку. Паводле яго слоў, пакаянне Марка — гэта нешта новае ў гісторыі тайнай паліцыі. Ніколі раней агент пад уплывам асяроддзя, у якое ён быў укаранёны, не пераходзіў на бок праціўніка.

«Экалагічныя ідэі — вельмі заразная рэч», — прызнае начальнік паліцыі.

З НАГОДЫ

# ЧАМУ РУХНУЎ ТУНІСКІ РЭЖЫМ?

Алег НОВІКАЎ

**23 гады прэзідэнт Зін эль-Абідзін Бен Алі быў туніскім прэзідэнтам, каб у выніку страціць усе за адзін дзень. Чаму ліміт рэвалюцый аказаўся не вычарпаным у Тунісе?**



Калі глядзець на голую статыстыку і палітычныя працэсы ў Тунісе апошніх двух дзесяцігоддзяў, цяжка зразумець прычыны рэвалюцыі. Бен Алі заняў пасаду прэзідэнта ў 1987-м. На той момант эканамічная сітуацыя ў Тунісе нагадвала постсавецкую эканоміку 1990-х. 46 працэнтаў ВУП ішло на тое, каб аплачваць замежныя крэдыты. Інфляцыя складала 10 працэнтаў на год. У дадатак, у краіне актывізаваліся ісламскія тэрарысты. Яны нават паспрабавалі захапіць адміністрацыю прэзідэнта.

Пры Бен Алі Туніс выкарабкаўся. За часы яго кіравання штогадовы даход аднаго тунісца вырас з 1200 долараў у 1986 годзе да 3768 у 2008-м. 20 апошніх гадоў ВУП краіны стабільна рос. У асяроддзі амерыканскіх эканамістаў Тунісу за яго эканамічныя поспехі нават далі мянушку «афрыканскі леў». Галоўным кірункамі эканомікі краіны былі экспарт у Еўропу аграрнай прадукцыі і, натуральна, турызм. Адпаведна зборніку «Global Competitiveness Report», які выдаецца арганізатарамі Давоскага эканамічнага форуму, у 2008 годзе Туніс па ўзроўню развіцця эканомікі знаходзіўся на 32-м месцы ў свеце. Усе іншыя афрыканскія краіны займаюць у гэтым рэестры значна больш нізкія месцы.

Бен Алі змяніў таксама палітычны лад. Была прынята новая канстытуцыя. У 1992-м прайшлі першыя ў гісторыі парламенцкія выбары з удзелам апазіцыйных партый. Праз два гады, таксама з удзелам апазіцыі, адбыліся выбары прэзідэнта. Канешне, перамогу на гэтых і наступных выбарах атрымлівалі выключна Бен Алі або кандыдаты ад афіцыйнай партыі «Дэмакратычны канстытуцыйны саюз» (RCD). Ніжэй за 86 працэнтаў прэзідэнту нават не малявалі.

Аднак, у параўнанні з мінулымі часамі, гэта быў відавочны прагрэс. Нагадаем, што пасля таго, як 1962-м Туніс вырашыў будаваць сацыялізм, усе партыі, акрамя сацыялістычнай, былі забароненыя.

Нарэшце, дададзім, што Туніс добра ўпісаўся ў еўрапейскую знешнюю палітыку. Нездарма Францыя, галоўны еўрапейскі партнёр Туніса, да самага апошняга дня адмаўлялася крытыкаваць Бен Алі за гвалт і забойства дэманстрантаў.

І вось, насуперак усяму апісанаму, у студзені 2011 года ў квітнеючым Тунісе адбываецца рэвалюцыя. Не выпадкова эксперты цяпер спрачаюцца, ці не паўтораць кароль Іарданіі Абдала Другі, прэзідэнт Егіпта Хосні Мубарак і Алжыра Абдэльазіз Бутэфліка лёс Бен Алі?

Не менш цікавы феномен так званай «язмінавай рэвалюцыі» заключаецца ў тым, што яна не выклікала канфрантацыі ўнутры грамадства. Ніводны тунісец або нейкая грамадская арганізацыя, уключаючы нават апарат афіцыйнай партыі, не выступілі ў абарону Бен Алі або часткі ягонай палітычнай спадчыны. Дзяржаўныя інстытуты папросту прагнілі. Падзеі ў студзені 2011-га аказаліся канчатковай і лагічнай кропкай эвалюцыі сістэмы.

Зараз яшчэ цяжка даць комплексны аналіз гэтаму працэсу, выявіць яго храналагічныя стадыі і чыннікі. Палітолагі пакуль адзначаюць некаторыя ключавыя моманты.

Першы — палітычнае адчужэнне, якое сфармавала цэнзура ў СМІ, ціск на апазіцыю, механізм правядзення выбараў. Пры Бен Алі была распрацаваная свая арыгінальная мадэль нядопуску апазіцыі ва ўладу. Кожны апазіцыянер мог ісці на выбары, аднак пры ўмове, што за яго паручыліся 30 дэпутатаў парламенту, амаль усе сябры якога былі запісаныя ў RCD. Кандыдатам даваўся абмежаваны час для выступаў на тэлебачанні. Заклікі да Бен Алі правесці дэбаты апошні ігнараваў. Тое, што сам Бен Алі не злазіў з тэлебачання, тлумачылася тым, што ён не кандыдат, а прэзідэнт. Канстытуцыйны суд здымаў з выбараў апазіцыйных кандыдатаў «за экстрэмізм». Былі выпадкі, калі за інтэрв'ю замежным СМІ палітыкаў збівалі. Загадзя вядомыя вынікі выбараў выклікалі ў насельніцтва апатыю, якая паступова перайшла ў фазу сістэмнага недаверу да афіцыйных навін. Не будзем казаць пра тое, што Бен Алі за 23 гады свайго праўлення таксама ўсім надакучыў.

Другі — персанальная дэградацыя эліты. Пазбаўленыя кантролю з боку грамадства, прэзідэнт і яго атачэнне пачалі разумець уладу як нешта дадзенае ім раз і назаўсёды. Бен Алі змяніў канстытуцыю, якая раней дазваляла аднаму і таму ж чалавеку займаць прэзідэнцкую пасаду толькі два тэрміны. Знік з тэксту Асноўнага закона параграф пра тое, што прэзідэнтам можа быць чалавек не старэй за 70 гадоў. Такое стаўленне да законаў хутка прывяло да таго, што сінонімам слова «ўлада» ў Тунісе стала слова «карупцыя». Увасабленнем карупцыі стала першая лэдзі краіны Лейла Бен Алі, якую ў грамадстве страшэнна не любілі. Пасля рэвалюцыі па сталіцы хадзілі натоўпы, якія шукалі родзічаў сям'і Лейлы. Што да самой першай дамы, то, пакідаючы краіну, яны ўмудрылася прыхапіць з рэзерваў Нацбанку паўтары тоны золата.

Нарэшце Бен Алі — прадстаўнік генерацыі палітыкаў 1980-х гадоў, папросту страціў кантроль над сучаснымі сацыяльнымі працэсамі. Уздымаючы кошты на прадукты харчавання (першапачатковая прычына пратэсту), ён не пралічыў рэакцыю моладзі, якая вельмі слаба сацыяльна абароненая. Калі на перыферыі пачаліся першыя пратэсты, прэзідэнт аддаў загад на разгон, думаючы, што людзі не даведаюцца пра гвалт. Адкуль старому было ведаць, што ў маладых тунісцаў свае формы камунікацыі (інтэрнэт), якія могуць выканаць таксама функцыю мабілізацыі.

І яшчэ адзін фактар — старасць. У свае 74 гады, Бен Алі шмат што рабіць ужо цяжка. У тым ліку ў такім узросце губляецца палітычнае пачуццё. Напрыклад, калі трэба выбудоўваць баланс інтарэсаў і ўплываў у прэзідэнцкім атачэнні. Апошнія гады ў краіне меў месца характэрны для аўтарытарных краін крызіс пераемніка. Усе гадалі — на каго выпадзе выбар? Спекуляцыі вакол кандыдатур і чуткі пра магчымы будучы перадзел улады абвастрылі адносіны паміж чыноўнікамі розных міністэрстваў, у тым ліку паміж сілавікамі. Не задоўга да рэвалюцыйных падзей Бен Алі даў зразумець, што толькі ў МУС працуюць самыя блізкія для яго людзі. У Мінабароны пра гэта не забыліся. І калі ў студзені генералам паступіў загад страляць па маніфестантах, яго дэманстратыўна праігнаравалі. Даведаўшыся пра гэта, гарант адразу паспяшаўся пакінуць радзіму.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ГУРБАНГУЛЫ БЕРДЫМУХАМЕДАЎ



Прэзідэнт Туркменістана правёў спецыяльнае пасяджэнне Кабміна, на якім намыліў галаву міністрам. Сярод іншага яго цікавіла балючае пытанне: чаму дасюль у краіне няма апазіцыйных партый? Пра неабходнасць стварэння шматпартыйнай сістэмы туркменскі гарант пачаў казаць яшчэ ў лютым мінулага года. «Кожны можа выступіць з ініцыятывай па стварэнню новай палітычнай партыі, у адпаведнасці з канстытуцыяй нашай краіны. Такая партыя можа быць зарэгістравана адразу — гэта можа быць партыя аграрнікаў ці любая іншая», — казаў лідар. Аднак жадаючых ствараць партыі чамусьці ў краіне пакуль не знайшлося, паколькі ніякіх шансаў гэтыя партыі не маюць. Аднак дэфіцыт апазіцыянераў негатыўна ўплывае на знешні імідж дзяржавы. Пакуль у краіне як была, так і застаецца адна зарэгістраваная партыя — Партыя дэмакратаў, сябрамі якой з'яўляюцца ўсе чыноўнікі, уключаючы прэзідэнта. На думку спецыялістаў, праблема адсутнасці апазіцыйнага партыйнага жыцця будзе вырашана шляхам прызначэння таго ці іншага чыноўніка «крытыкам сістэмы». Увогуле, Бердымухамедаў арыгінальна падыходзіць да праблемаў адкрытага грамадства. Можна ўзгадаць, як ён вырашыў пытанне адсутнасці ў краіне інтэрнэту — яго забараніў папярэдні прэзідэнт Ніязаў. Гурбангулы выдаў указ, які патрабуе забяспечыць інтэрнэтам усіх выхаванцаў дзіцячых садкоў.

### БРАЯН КОЎЭН



Прэм'ер-міністр Ірландыі і экс-лідар кансерватыўнай партыі Фіяна Файл 22 студзеня падаў у адстаўку з пасады партыйнага старшыні. Такім чынам, упершыню ў гісторыі краіны кіраўнік ураду не з'яўляецца адначасова старшынёй партыі. Мясцовыя каментатары называюць гэты казус пачаткам заходу «Салдатаў лёсу». Фіяна Файл — гістарычная партыя Ірландыі, якую заснаваў у 1926 годзе Імон дэ Валера — будучы прэзідэнт краіны. Пад яго кіраўніцтвам «Салдаты лёсу» — заўзятыя нацыяналісты — перамаглі саюзнікаў Вялікабрытаніі. Партыя знаходзілася пры ўладзе 53 гады (незалежная Ірландыя існуе 84 гады), што з'яўляецца амаль еўрапейскім рэкордам. Больш пры ўладзе на старым кантыненце знаходзіліся толькі шведскія сацыял-дэмакраты. Восем сяброў партыі ў розныя часы былі прэзідэнтамі краіны. Аднак усяму прыходзіць канец. Цяпер усе чакаюць расколу партыі. Дадатковым фактарам з'яўляецца падзенне яе рэйтынгу. Зараз Фіяна Файл падтрымліваюць толькі 15 працэнтаў выбаршчыкаў. Гэта самы нізкі ўзровень падтрымкі партыі за ўсю яе гісторыю.

### АЛЬБЕРТ ДРУГІ БЕЛЬГІЙСКІ



На думку шматлікіх экспертаў, у бліжэйшы час кароль Бельгіі зменіць свой тытул. Казаць пра такі сцэнар прымушае лічба 200. Менавіта столькі дзён Бельгія не мае нацыянальнага ўраду. Партыі, якія засядаюць у парламенце, не могуць дамовіцца, прычым не толькі з-за ідэйных забабонаў (у цяперашнім парламенце дамінуюць фламандскія нацыяналісты і валонскія сацыялісты). Проста ніводны адказны палітык не хоча ўзначальваць Кабмін у час крызісу. Нагадаем, што дэфіцыт бельгійскага бюджэту складае цяпер амаль 5 працэнтаў. Сваю ўскосную ролю таксама гуляе пазіцыя фламандскіх партый, якія выступаюць за канфедэралізацыю краіны. Як вырашыць дылему, ніхто не ведае. Цяперашні часовы прэм'ер-міністр Іў Летэрм прынцыпова не распрацоўвае ніякіх доўгатэрміновых праграм. Між тым, у прэсе з'явіліся чуткі, што ў кулуарах еўрапейскіх структур ужо абмяркоўваюць план прыяднання фламандскай часткі краіны да Нідэрландаў, а франкамоўнай часткі Бельгіі — да Францыі. Самае вялікае пытанне, што рабіць з Альбертам і яго каралеўскім домам?

НАТАТКІ

# СТАРЫ НОВЫ СВЕТ

## ШТО КРУЦЕЙ: ЕЎРОПА ЦІ АМЕРЫКА?

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Я стаяла на аўтобусным прыпынку блізу Паўднёвага вакзалу Бостана і чакала аўтобуса, які возіць турыстаў на аглядныя экскурсіі па горадзе. З гледзішча большасці вандроўнікаў, якімі я захапляюся, мой учынак быў абсалютна бязглуздым. Купляць экскурсію на вакзале — тлусты «незалік» у залікоўцы сапраўднага падарожніка. Але іншых варыянтаў я не бачыла: у Бостан мяне занесла ўсяго на паўдня, з неба ліло бязбожна, апроч таго, ці не ўпершыню ў жыцці я не ведала, у які бок мне ісці.**





Не ведаць, у які бок ісці, — вельмі няпростае пачуццё. Асабліва калі табе блізу трыццаці і ўсё сваё свядомае жыццё ты ганарылася фактам, што здольная без мапы выйсці да цэнтральнай плошчы ў любым горадзе Еўропы. І вось ты трапляеш у ЗША, дзе амаль любы горад сплlivаваны прасцей няма куды — і стаіш, лыпаеш вачыма, не ведаеш, куды падацца. І калі «даўнтаўн» ад прыгарадаў можна адрозніць па канцэнтрацыі хмарачосаў, няясным застаецца іншая рэч — як увогуле займацца гарадскім турызмам у Амерыцы.

Бостан — ці не прывабнейшы для турыстаў горад ЗША, і зранку да вечара тут курсуюць маршрутныя экскурсійныя аўтобусы некалькіх кампаній. Сеў на адзін такі — праехаў, пагуляў, праз пятнаццаць хвілінаў ускокваеш у іншы. Але я марыла пра аўтобус, як дапатопныя людзі — пра каўчэг. Нарэшце ён прыйшоў, і мяне перастала паліваць вадой.

Адна з самых зацятых спрэчак у Беларусі — Еўропа мы ці не Еўропа. З самага першага дня ў Амерыцы я адказвала сабе на гэтае пытанне адназначна: «Еўропа! Еўропа!» І справа тут не ва ўзроўні жыцця ці ступені дэмакратыі — гаворка пра абсалютна розныя спосабы арганізоўваць прастору ды грамадства, якія склаліся ў нас і ў іх. Хоць, гледзячы на самы старажытны амерыканскі горад праз акно турыстычнага буса, нельга было не заўважыць — пытанне «Еўропа ці Амерыка» было і, магчыма, застаецца вельмі надзённым тут, у Новым Свеце, які з самага пачатку каланізацыі паўночнаамерыканскага кантынента супрацьпастаўіў сябе Старому.

### Гіды

Мая маці ўсё жыццё працавала экскурсаводам, бацька — кіроўцам турыстычных аўтобусаў. Яны ездзілі разам, але рабілі абсалютна розныя рэчы. І таму амерыканскія экскурсіі з іх шафёра-гідамі нязменна выклікалі ў мяне змяшаныя пачуцці.

За стырном бостанскага аўтобуса пажылы афраамерыканец, ён паспявае аднachасова кіраваць сваёй махінай, сацыялізавацца з пасажырамі і расказваць пра тое, што мы бачым навокал. «Я нарадзіўся і пражыў усё жыццё тут, у бостанскім Чайна-таўне, — кажа экскурса- і аўтобусавод, звяртаючыся да люстэрка задняга віду, — Я — тутэйшы». У Празе, Вене або Санкт-Пецярбургу турыстаў хутчэй супакоіла б навіна пра колькасць вышэйшых адукацый іх гіда, а не пра яго паходжанне. Але не такі гід у Амерыцы. Добры гід у Амерыцы — гэта яго асабістая гісторыя ў кантэксце гораду.

Дэніс, які быў нашым гідам у Сан-Францыска, — рок-музыка, які зарабляе турызмам на паездкі па свеце. «Беларусь — радасна гігікае ён, даведаўшыся, адкуль я, — я пабываў у тваёй краіне, хоць вельмі не хацеў. Мяне знялі з цягніка ў Берасці. Была патрэбная нейкая яшчэ віза. Я ехаў у Маскву з Берліну і меў толькі расійскую». Нашага вашынгтонскага гіда ўсе называлі «капітанам». Кэп кіраваў «качкай» — катэрам-амфібіяй, копіяй тых, якія амерыканцы скарыстоўвалі падчас высадкі ў Нармандыі. Спачатку ён вёў яго па вуліцах, а потым зухавата спусціў на раку Патамак, і далей мы ўжо плылі. Амерыканскія гіды расказваюць турыстам смешныя выпадкі з гісторыі будынкаў, задаюць школьнікам пытанні на эрудыцыю, падымаюць настрой жартамі і не забываюць нагадаць пра чаявыя. Шчыра кажучы, часам яны ўражваюць больш, чым паказаныя імі архітэктурныя аб'екты. Вельмі пазітыўныя людзі.

### Музеі

Турыстаў сёння няшмат. Доўгі час я еду зусім адна, і толькі праз пару прыпынкаў да мяне падсаджваецца пара з Арэгону. За ёй — сям'я з Паўднёвай Карэі. Кіроўца лічыць сваім доўгам нас прадставіць. «Бе-ла-русс?» — са здзіўленнем перапытваюцца турысты, прыглядаючыся. Добра, што не чапаюць рукамі. Я пачуваюся ўнікальным музейным экспанатам.

Залі амерыканскага мастацтва ў музеях выклікаюць дваістыя пачуцці. Сістэматызаваныя паводле эпохаў творы амерыканскіх мастакоў, яны мала ўражваюць, але робяць наглядным паступовае вылузванне Амерыкі з еўрапейскага канону.

XIX стагоддзе: мы бачым рэалістычныя пейзажы амерыканскіх прэрыяў, партрэты індзейцаў чэрокі і статкі бізонаў, што мкнуць на вадапой. У залах дэкору даведваемся, што ў 1880-я амерыканскія дызайнеры асабліва палюбілі стыль неаракако. Вось мы сузірaем амерыканскіх паслядоўнікаў французскіх імпрэсіяністаў... І раптам — ужо ў XX здараецца нешта (зрэшты, ясна што: Еўропа спатыкнулася на першай сусветнай) — і перад намі Новы Свет, адлюстраваны новым стылем.

Адкрыццём для мяне стаў мастак-ілюстратар Норман Роквэл. У Нацыянальнай партрэтнай галерэі Вашынгтона экспанаваліся яго карціны з калекцыяў Стывена Спілберга і Джорджа Лукаса. Тамсама круцілі фільм, у якім галівудскія зоркі расказваліся, што творы гэтага мастака навучылі іх рэжысуры, бо адна карціна Роквэла — гэта цэлая гісторыя, расказаная гледачу. Роквэл маляваў жыццё простых амерыканцаў яскравымі фарбамі ў плакатным стылі. Потым нарадзіўся Эндзі Уорхал і стварыў партрэт бляшанкі супу, але пакуль я глядзела на герояў Нормана Роквэла і радавалася: вось ён — момант, калі амерыканскае мастацтва вырвалася на паўкорпусы наперад.

### Войны

Мы спыняемся каля бостанскага муніцыпалітэту. Наш гід урачыста паркуе бус, зноў глядзіцца ў люстэрка задняга віду і пачынае: «Ці многія з вас могуць пахваліцца, што служылі свайму гораду ў будынку мэрыі?.. Ішоў 1970 год. Я, малады капрал, які толькі што вярнуўся з В'етнаму, быў прызначаны камандзірамі на пасаду шэфа бяспекі гэтага будынку... Перад вамі — мой былы офіс». Кажучы гэта, ён трымае ў руках партрэт сябе маладога ў парадным мундзіры амерыканскай арміі, як Скарына — Біблію. За дзень ён паспявае зрабіць тры-чатыры кола па гістарычным цэнтры Бостана і, значыць, чатырохкратна ўздымае гэты партрэт па-над стырном свайго аўтобуса.

Турыст з Арэгону ажыўляецца, у вачах — непадробны інтарэс і расчуленасць. Паміж ім і кіроўцам завязваецца кароткая размова на тэму «ў якім палку служылі». Я гляджу на абодвух і разумею, што ветэраны В'енаму акурат уступілі ў век, калі асацыююцца ў нас са словам «ветэраны».

Дзве самыя знакамітыя вайны, якія адбываліся ў межах самой Амерыкі, — вайна за незалежнасць і грамадзянская вайна паміж Поўднем і Поўначчу — здаюцца мне гульнямі ў жаўнерыкаў, калі супастаўляць іх з тысячагоддзямі еўрапейскіх войнаў. Амерыканскі настаўнік гісторыі, зразумела, знойдзе, чым запярэчыць, але для нас, еўрапейцаў, гэта былі войны з высакароднымі мэтамі і простай логікай. У адным выпадку акрыялая калонія здабывала самастойнасць («Вось тут, менавіта ля гэтай прыстані ў ваду скінулі гарбату», — неахайна паказвае наш гід). У іншым — харошыя янкі вызвалялі рабоў ад нехарошых плантатараў. У Поўдня, канешне, былі свае пачуцці, пра што сведчыць літаратурны прыклад Скарлет О'Хара, але ў цэлым гэтыя войны — галівудскія паводле драматургіі. (Зрэшты, варта згадаць пра метады, якімі новыя землі адваёўваліся каланізатарамі ў індзейцаў — і ўсё стаецца складаней).

Еўрапейскія войны былі значна больш заблытанымі, чым нам гэта паказвалі на «Беларусьфільме». Асабліва шакавала XX стагоддзе, калі ўсе ваявалі супраць усіх, і да 1945 года на кантыненце не засталося падзелу на правых і вінаватых, мірных жыхароў і агрэсараў. Галоўны герой еўрапейскай перамогі — амерыканскі чыноўнік у лагеры ўцекачоў, які выслухвае тваю біяграфію часоў акупацыі і вырашае, ці даваць табе дазвол на жыхарства ў Злучаных Штатах. Еўрапейскія войны — гэта як калі табе шэсць год і ты вяжаш-вяжаш нешта, а вязанне заблытваецца ў камяк нітак, і ты ў роспачы шмякаеш пруткі на падлогу: «Ні-чо-га не вы-хо-дзіць!!!»

Амерыка — гэта адносна ўдалая спроба чалавецтва пачаць усё спачатку.

### Кава

Аўтобус спыняецца каля нейкага гатэлю. У яго маршруце гэты прыпынак лічыцца «станцыяй №1». Тут стаяць найдолей, і кіроўца кажа, што гэта добрая магчымасць купіць кавы на вынас. Мы як хочам, а ён пайшоў.

Неўзабаве гід вяртаецца за стырно з папяровым кубкам, і вязе нас далей, піючы каву.

У параўнанні з тым жа аб'ёмам нафты, гэтая чорная вадкасць каштуе ў ЗША непамерных грошай. Але, як жартуюць зласлівыя еўрапейскія турысты, на смак амерыканская кава няшмат чым розніцца ад нафтапрадуктаў. Кава — галоўнае расчараванне «нашых», калі яны трапляюць у Царства Свабоды, галоўным сімвалам якога сталі «Старбаксы» на кожным рагу. «Старбакс» — гэта кававы «Макдональдс», наглядны прыклад таго, як можна за пяць хвілінаў задаволіць дзесяць чалавек адной порцыяй кафеіну, садраўшы пры гэтым непамерныя грошы.

Еўрапейская кава — гэта рытуал, які ўключае больш, чым каву, — адпачынак, давяральнасць, утульнасць. На нашым кантыненце гарады прaвяраюцца на «еўрапейскасць» тым, ці пануе ў іх кавярнях належная «атмасфера».

Паняцце атмасфернасці існуе і ў амерыканскіх кофе-хаўзах, але гэта атмасфернасць іншага характару. Дзелавітая, крыху мітуслівая. У амерыканскай кавярні будзе хутчэй светла, чым цёмна.

Амерыканцы п'юць каву «на месцы» ці «на вынас». Найчасцей выносяць — папяровыя вядзеркі аб'ёмам да паўлітра. Гэта так званая «цэджаная кава», падобная да еўрапейскага «амерыкана», разбаўленага разоў у пяць. Тэрмакубак-невылівайка — аўтэнтычны сувенір з ЗША. Але ў Еўропе ён будзе, хутчэй за ўсё, пыліцца ў кухоннай шафцы. Еўрапейская кава — рэч інтымная. Яе не выносяць далей за ўласнае жытло, офіс, далей за тэрасу кавярні. Амерыканец наадварот — панясе кубак у машыну, метро, на заняткі ва ўніверсітэце. Кажуць, нямецкія машыны перад продажам у ЗША пераабсталёўваюць на заводзе — дадаюць падстаўку для кавы паміж сядзеннямі.

У амерыканскай каве ёсць адзін паказальны нюанс. Паколькі гэтая кава, як і ўсё навокал, — дэмакратычная, то цукар, малако ці вяршкі, а таксама шакалад, цынамон ці іншыя прысмакі ты дадаеш туды самастойна, ля спецыяльнай стойкі. Еўрапеец, што ссумаваўся па кафеіне, папросту змушаны гэта рабіць — каб пры-

правы заглушылі вугальны смак купленага напою. Дык вось, калі ты збіраешся дадаваць малако, трэба адразу папрасіць бармэна, каб пакінуў «room for cream» — «месца для вяршкоў». Але часта здараецца, ты забываеш папярэдзіць або бармэн задумваецца і налівае каву, як належыць — па самы верх папяровага кубка. І тады ты нагадваеш: «Рум-фо-крым, пліз!» Бармэн прабачаецца і — плясь! — прыцэльным рухам выплёсквае лішак кавы з кубку проста ў мыйніцу.

У гэтым «плясь» — той акіян, які аддзяляе Амерыку ад Францыі ці Брытаніі. Магчыма, гэта ўсё стэрэатыпы, але цяжка ўявіць сабе, каб па наш бок Атлантыкі так спакойна вылівалі ў мыйніцу нешта, што завуць кавай.

Але самае цікавае пачынаецца тады, калі ты, не турбуючы бармэна, сам падыходзіш да спецыяльнай мыйнічкі пасярод кавярні і — плясь! — сам вызваляеш месца пад малако. Гэта, здаецца, і ёсць тая мяжа, за якой — амерыканізацыя.

## Мапы

Аўтобус спыняецца насупраць Бэкан Хіл. Гэты чароўны раён Бостана паўстаў ужо ў XVII стагоддзі і славіцца старасвецкімі дамамі з чырвонай цэглы, будучы сёння адным з самых дарагіх жылых раёнаў Амерыкі. «Вунь там — Бэкан Хіл, — вяшчае наш гід, прасціраючы ў бок узвышша кубак кавы. — Вельмі прыгожае месца. Тут ёсць дамы... — і ён сумленна пералічвае амерыканскіх акцёраў і палітыкаў, якія жылі або жывуць тут. — Але напраміла Бог, не хадзіце туды самастойна! Колькі народу заблукала... Гэтыя вуліцы праектавалі першыя пасяленцы. Тут проста як у Еўропе — сам чорт нагу зломіць!»

У пэўны момант, зразумеўшы, што зямлі ў іх шмат, амерыканцы развілі свой стыль праектавання гарадоў. Зазвычай вуліцы перасякаюцца пад простым вуглом ды яшчэ нумаруюцца. Напрыклад, сэрца Вашынгтона: уздоўж ідуць вуліцы A, B, C, упоперак — 1, 2, 3... Трапіць на рог 14 і H — элементарна, калі ведаеш алфавіт і асновы арыфметыкі. У Чыкага дарогу тлумачаць па баках свету, і на выхадах з метро намаляваны компас. Ходзячы па цэнтры амерыканскіх гарадоў, пачуваешся шахматнай фігурай. Бостан — адно з нямногіх дзівацтваў тамтэйшага горадабудаўніцтва, што, як можна пабачыць, нават пужае насельніцтва.

«Квадратны» прынцып працуе з усёй краінай. Паўсюль, дзе было можна, прэрыя ператварылася ў геаметрычныя палі. Квадратныя — для пшаніцы і кукурузы, круглыя — для гольфу. Мае любімыя амерыканскія штаты — Ваёмінг і Каларада. Яны ідэальна прастакутныя — межы праведзеныя па паралелях і мерыдыянах. Але чым бліжэй на Усход, тым болей абрысы штатаў нагадваюць пра Еўропу.

Дзіўна, круцячы глобус, перавадзіць позірк з Амерыкі на Еўропу, дзе кожны выгін дзяржаўных межаў — гісторыя тысяч смерцяў падчас тэрытарыяльных разборак. У Амерыцы ўсё вялікіх памераў. Амерыканцам ёсць дзе разгарнуцца.

***

Напрыканцы экскурсіі, калі мы з гідам, здаецца, — адна сям'я, нечакана перастае дождж і вызірае сонца. Я развітваюся і саскокваю на плошчы перад публічнай бібліятэкай — спарудай у неагатычным стылі. Гэта вельмі прыгожа і адначасова — вельмі ненатуральна, нібы Амерыка выставіла дэкарацыі і здымае тут касавы фільм пра Еўропу.

Амерыканскія Усход, Цэнтр і Захад — як гегелеўскія тэзіс, антытэзіс і сінтэз. Усход (Eastcost) нібы пастулюе: «Мы не горш за Еўропу». Цэнтр (Midwest) — заяўляе: «У нас свой шлях». І толькі на скрайнім Захадзе (Westcost) — такім далёкім, што нават Акіян там называюць інакш, — здаецца, зусім не пераймаюцца такімі пытаннямі.

І яшчэ — у параўнанні з Еўропай Амерыка парахнее. Знакамітыя хмарачосы, якія па азначэнні павінны быць сам шык і бляск, зблізку аказваюцца зусім пенсіянерамі ад архітэктуры. Ну так, некаторым з іх ужо за семдзесят! Вельмі дзіўна разглядаць старыя кандыцыянеры ці пракаветныя аўтаматы для паркоўкі. Тое, што прыйшло ў Еўропу як запазычанне са Штатаў нядаўна і зіхаціць бляскам новых тэхналогій, у саміх Штатах — на мяжы зносу. Эканамічны крызіс? Магчыма. Але, здаецца, Стары і Новы свет пакрысе мяняюцца месцамі.

КІНО

# ГОРАД МАЙСТРОЎ У БУНКЕРЫ ЎЗУРПАТАРА

Андрэй РАСІНСКІ

**Сярод сусветных фільмаў, якія калісьці вабілі гледачоў, ёсць стужкі, што быццам наўмысна распавядаюць пра сённяшні беларускі дзень. Гэтыя карціны ствараліся без усялякай агляду на «моцную і працвітаючую» дыктатуру. Аўтары большасці фільмаў папросту нічога не ведалі пра Беларусь і яе серыйнага прэзідэнта. Але супадзенні ўражваюць.**



«Бункер»



«Евангелле паводле Мацвея»

Адкрывае спіс нямецкая стужка «Бункер» Олівера Хіршбігеля. Гэта карціна, знятая ў 2004 годзе, расказвае пра апошнія дні Адольфа Гітлера. На вуліцах Берліна ідуць баі, горад у полымі, а ў скляпеннях рэйхсканцылярыі коўзаецца фюрэр, які ўсё болей губляе пачуццё рэальнасці.

Не ведаю, як пачуваюцца іншыя дыктатары падчас аблогі, але тое, што паказаў Хіршбігель — універсальна. Прага ўлады, шаленства, апошнія канвульсіі зла, мярцвячы спрыт запэцкаць дый зацягнуць у магілу паболей ахвяраў — зло выкрывае само сябе. Зло п'е цыяністы калій. Асаблівую ўвагу прапагандыстам і ідэолагам варта звярнуць на фігуру Ёзэфа Гебельса, чый лёс не радуе.

Блізкая па сэнсе стужка — «Агонія» Элема Клімава. Гэтым разам гутарка ідзе пра царызм. Акультная істэрыя, разгул Распуціна, міністэрская чахарда, незадаволенасць мас, што нарастае, — вось атмасфера 1916 года. Што з таго, што цар слабы і ўжо прадчувае непазбежнасць катастрофы? Расійскія закалоты, што распачаліся ў 1917 годзе, будуць скалынаць усё XX стагоддзе.

Хаця «гісторыка-рэвалюцыйныя» карціны былі паважанымі ў Савецкім Саюзе, стужку Клімава брэжнеўскія герантакраты схавалі як мага далей ад вачэй. Занадта пазнавальнымі былі паралелі з эпохай «развітога сацыялізму». Фільм, першая рэдакцыя якога была зроблена ў 1975 годзе, савецкія гледачы пабачылі толькі праз 10 гадоў. Да скону самога Савецкага Саюза засталося зусім няшмат.

А вось стужку Валянціна Вінаградава «Усходні калідор» гледачы ўвогуле не пабачылі. Гэты беларускі фільм 1966 года абвясцілі падрыўным і антымастацкім. Хаця тэма карціны — самая кананічная: падпольшчыкі на вайне. Але тое, як знятая гарадская партызанская барацьба, — кантраснае асвятленне, рэзкія ракурсы, агаленае цела, карніцкая машына — гаворыць пра адвечную «акупацыю», што можа быць калі заўгодна і дзе заўгодна.

Яшчэ паказальней правакацыі захопнікаў і спрэчкі падпольшчыкаў, якія спрабуюць вылічыць здрадніка. Такое ўражанне, што дыялогі даўняга фільму спісаны з сецевых палітычных пляцовак, а дзеянне адбываецца ў штабе адной з апазіцыйных партый пасля 19 снежня.

Агульная атмасфера ў краіне — як у польскай стужцы 1956 года «Канал». Фільм Анджэя Вайды расказвае пра Варшаўскае паўстанне 1944 года. Карнікі падавілі паўстанне, нескароныя людзі спрабуюць схавацца ў падземных каналах. Але стужка Вайды распачала «новае польскае кіно». Можна сказаць, што гэта была паваротная эстэтычная кропка, якая ўрэшце прывяла да «Салідарнасці» і да вызвалення краіны.

Пра неабходнасць «Салідарнасці» кажа і Сяргей Эйзенштэйн у сваёй першай карціне «Страйк».

Нямы «Страйк» 1924 года — гэта скарбонка не толькі мастацкіх, але і палітычных прыёмаў. Вось улады змагаюцца з бунтаўнікамі: каб спляжыць іх, наймаюцца штатныя правакатары з гаваркімі мянушкамі — Мартышка, Пугач (амаль як слынны правакатар Даўн са снежаньскай Плошчы). Правакатары, у сваю чаргу, ангажуюць для брудных справаў усялякае шалупінне. Саюз дыктатуры і поскудзі. А вось «пакаяннае» прызнанне рабочага, які здае сваіх сяброў, уражвае.

Не губляюць актуальнасці і контрмеры: забароненыя сходкі маскуюцца пад святочныя гулянні, употайкі арганізуюцца страйкавыя камітэты.

Усеагульны беларускі страйк, пра які ўзгадвалі і на Плошчы, сапраўды, здольны зваліць дыктатуру. Каб навучыцца рабіць страйкі — звяртайцеся да класічнай стужкі.

А пакуль — «Асса». Калі хто не памятае, была такая стужка 1987 года. Першая частка «маразматычнай трылогіі» Сяргея Салаўёва. У фільме юная дзяўчына, якая шукае багатага жыцця, звязалася з тагачасным мафіёзі — Станіславам Гаварухіным. Але ёсць іншае жыццё — хлопец з рок-музыкай. Паралелі з сённяшняй сітуацыяй простыя: дзяўчына, як Беларусь, галоўны нягоднік — і так зразумела, хлопец — будучыня і спроба вырвацца з замагільнай стабільнасці. Песня «Пераменаў» Цоя рыфмуецца з песняй пра муры, што спявалі на Плошчы. А дадатковы сюжэт фільма пра патаемную змову і забойства імператара Паўла нават страшна падумаць, на што намякае.

Каб падняць настрой — лепей паглядзець «Планету страху» Раберта Радрыгеса, 2007-га года выпуску. Гэта праўда, што гнюсныя зомбі-ваенныя, якія распадаюцца і смуродзяць, выглядаюць крыху лепей за беларускіх амапаўцаў. Гэта праўда, што атрутныя вірусы і адкіды можна разглядаць як штодзённы хлуд рэжымнай прапаганды.

Затое якая энергетыка ў гераіні! Гераіня Роўз МакГоўн, якой адарвалі нагу, не губляе баявой формы і набывае замест нагі кулямёт, каб размаўляць з апанентамі на іх мове. Я ў ніякім разе не заклікаю грамадзянаў краіны браць з яе прыклад, але павучыцца аптымізму і няскоранасці ў Роўз МакГоўн варта.

А вось прыклады слушных паводзінаў у сённяшняй сітуацыі, акрамя стужкі Эйзенштэйна, дае «Горад майстроў» Уладзіміра Бычкова. Гэта беларуская кіна-казка 1965 года паводле п'есы Тамары Габе гаворыць, што рабіць, калі наш горад майстроў акупаваў узурпатар. Трэба смяяцца — і з іх высілкаў, і з іх інструкцый.

Трэба сыходзіць, каб не выконваць загадаў карніка, — і гуртаваць сілы.

Трэба быць салідарнымі ў барацьбе і — самае істотнае — мець чыстае сэрца.

Пра чыстае сэрца кажуць і дзве іншыя найсучаснейшыя карціны. «Quo Vadis» 2001 года Ежы Кавалеровіча — гэта апошняя і самая ўдалая экранізацыя аднайменнай кнігі Генрыха Сянкевіча. Забойца, падпальшчык і камедыянт Нерон. Першых хрысціян праследуюць, кідаюць да ільвоў, паляць жыўцом. Але гістарычная перамога — не за дыктатарам. І чалавечая, дый мастацкая — таксама.

Нарэшце, фільм 1964 года «Евангелле паводле Мацвея» П'ера Паола Пазаліні — гэта непасрэднае кіраўніцтва да сучаснага дзеяння. Фільм даслоўна зняты па Дабравесцю — з невялікім літургічным дадаткам прароцтва ад Ісаі.

Як даказвае гэтая чорна-белая стужка, знятая ў дакументальнай манеры з непрафесійнымі выканаўцамі, словы Хрыста — самыя радыкальныя сведчанні. Жыццё Хрыста — самая важная рэвалюцыя. Да яе цяпер далучаецца Беларусь.

СПАДЧЫНА

# ШТО РОБЯЦЬ З ЛІДСКІМ ЗАМКАМ?

**«У двары Лідскага замка паўстане трохпавярховая каменная будыніна», — так ахарактарызаваў пабудову, якую пачалі ўзводзіць на месцы дома кашталяна Лідскага замка археолаг, кандыдат гістарычных навук, старшыня ГА ТБМ імя Ф. Скарыны Алег Трусаў. Пра вартасць гэтага гістарычнага аб'екта для Беларусі, асаблівасці яго рэстаўрацыі і іншае ён распавядае карэспандэнту «НЧ» Язэпу Палубятку.**

— Трэба сказаць, што Лідскі замак — адзін з самых старажытных на тэрыторыі сучаснай Беларусі, заснаваны Гедымінам у 1323 годзе. Ён даволі добра захаваўся да гэтага часу і таму яго можна ўключыць у пяцёрку лепшых беларускіх замкаў, побач з Крэўскім, Нясвіжскім, Мірскім, Старым Гарадзенскім. Ён належыць да замкаў каштэльнага тыпу, што складалі абарончую лінію Ліда—Крэва—Меднікі.

***— Рэстаўрацыя замка ўжо цягнецца не адно дзесяцігоддзе. Ці будзе ён аднаўлены адпавядаць першапачатковаму варыянту?***

— Рэстаўрацыя пачалася ў 1976 годзе і вялася больш актыўна, пакуль не разваліўся Савецкі Саюз. Тады мы зрабілі там поўныя археалагічныя раскопкі. Знайшлі ўнікальны археалагічны матэрыял. Аднавілі адну вежу. Потым грошы скончыліся, і замак доўгі час стаяў у закінутым выглядзе. Але грамадскасць Ліды «біла ў званы», і я да гэтага прыклаў руку. Усе мы агулам звярталіся ў розныя інстанцыі. Урэшце ўладамі былі выдаткаваны грошы, і рэстаўрацыя зноў пачалася. Найбольш актыўна яна праводзілася ў мінулым годзе. Актывізацыі паспрыялі «Дажынкі». Нарэшце скончылі другую вежу і аднавілі ўсе чатыры сцяны. Зараз трэба рабіць добраўпарадкаванне двара, унутранай тэрыторыі. Вось тут і пачаліся цікавыя з'явы.

Справа ў тым, што, як мне паведамілі з Ліды, у самыя маразы, у снежні мінулага года, будаўнікі пачалі выкопваць глыбокі катлаван. Метры тры-чатыры. Кладуцца нейкія падмуркі і пачынаецца будоўля. Прычым, падкрэсліваю, робіцца гэта ў маразы. Зусім нядаўна ў газеце «Звязда» з'явіўся артыкул журналіста Глеба Лабадзенкі, дзе засведчана, што ў двары Лідскага замка будуецца трохпавярховы бетонны дом. Быў надрукаваны праект велізарнага будынка, які фактычна, калі яго збудуюць, знішчыць першапачатковы выгляд гістарычнага помніка, бо ён сягае болей за 11 метраў і паўстане вышэй яго сценаў. Падумаў, што гэта можа быць такое? І галоўнае — дзе? У якім месцы? Аказваецца, там, дзе раскапаны мной падмуркі дома кашталяна, дзе жыў камендант замка. Падмуркі былі цалкам каменныя, а



дом маленькі, драўляны. Як ён выглядаў, ніхто не ведае.

Я з гэтай нагоды падрыхтаваў ліст ды адаслаў яго міністру культуры Паўлу Латушку, дзе, як аўтар шматлікіх гістарычных даследаванняў Лідскага замка ў 1977, 1978, 1980 гадах, аўтарытэтна сцвярджаю, што на тэрыторыі Лідскага замка не было асобных каменных пабудоў. Вельмі паплусію спыніць гэтую будоўлю, якая знішчыць замкавы двор і выкліча пратэсты беларускіх і айчынных навукоўцаў. Няўжо ў нас ёсць лішнія грошы, каб траціць няведама на што? Я катэгарычна супраць гэтага бетоннага хлява. Яшчэ раз паўтараю, ён фактычна нішчыць замак.

***— Хто за гэтым праектам можа стаяць?***

— Наколькі мне стала вядома, за ўзвядзеннем гэтага аб'екта стаяць будаўнікі гродзенскіх структур. Гэта не мінскія рэстаўратары. Магу засведчыць, што праект рэстаўрацыі быў зроблены ў савецкія часы. І я яго аўтар. Мы планавалі паказаць падмуркі таго дома. У цэнтры планавалася сцэна для розных спектакляў, якая павінна апускацца ўніз, падымацца, а падчас рыцарскіх турніраў двор павінен быць роўны. Цяпер выходзіць, што пэўныя структуры вырашылі тут збудаваць «казарму». Кажу зноў і зноў: ніхто не ведае, як той будынак кашталяна выглядаў.

***— Што там можа размясціцца?***

— Крамы нейкія. І яшчэ нешта. Адным словам, туды пойдуць дзяржаўныя грошы. Будаўніцтва сучаснае, а расцэнкі каштарысам рэстаўрацыі. Гэта будзе аб'ект па адмыванню грошай. Ці па закапванню ў зямлю гэтых грошай.

Зараз мы паўтараем памылкі французскіх рэстаўратараў болей чым двухсотгадовай даўніны. Пачаліся яны ў гады Напалеона. Было такое, але свет гэта прайшоў і забыў, а мы з адставаннем на стагоддзе ідзём тым жа шляхам.

***— Як ставяцца жыхары Ліды да гэтай «рэстаўрацыі»?***

— Спачатку выказвалі нязгоду, але потым іх як бы супакоілі ўлады: «Не хвалюйцеся, усё будзе добра». Але старэйшы навуковы супрацоўнік Лідскага гістарычна-мастацкага музея Валеры Сліўкін вельмі актыўна крытыкуе гэты праект. Ён катэгарычна супраць такой рэстаўрацыі. Я таксама лічу, што неабходна спыніць гэтую авантуру. Але ўжо пачалося будаўніцтва першага паверха. Чаму будуюць зімой? Зразумела — расцэнкі вышэйшыя. Аднак такая будоўля зімой стаіць кепска. Ужо быў сумны вопыт, калі зімой аднавілі адну сцяну, а яна потым абвалілася.

Лічу, што трэба правесці шырокае абмеркаванне пытання добраўпарадкавання нашай святыні з удзелам усіх слаёў грамадскасці, а не вузкім колам. Напачатку слуханні неабходна правесці ў Мінску, бо гэта помнік агульнарэспубліканскі, затым у Гродна і абавязкова — у Лідзе.

ВЫСТАВА

# МУЛЯВІН У «ДОБРЫХ МЫСЛЯХ»

Аляксей ХАДЫКА

**Мне здаецца, што, калі б Уладзімір Мулявін дажыў да свайго 70-годдзя і да 19 снежня 2010 года, то ў вечар таго дня ён быў бы ў цэнтры Мінска. Магчыма, нават з гітарай, і, перакрываючы гукі расійскай папсы, якая брынчэла з дынамікаў на Кастрычніцкай плошчы, спяваў бы. Магчыма, «Янку Купалу». Або якую яшчэ са сваіх балад. Бо Мулявін, хаця часам любяць падкрэсліць яго рускае паходжанне, быў беларускім музыкам. Беларускім чалавекам, цвёрдым воляю, як скала.**

Гэта фантазія магчымая, бо Мулявін у сваёй музыцы быў



настолькі вялікі і значны, што ў кожнага беларуса ёсць свой Мулявін. 22 студзеня ў мастацкай галерэі фальварка «Добрыя мыслі» ў Мінску адкрылася фотавыстава Яўгена Коктыша «Памяці Уладзіміра Мулявіна», прысвечаная 70-годдзю з дня яго нараджэння. Гэта — Мулявін Коктыша, пагодкі музыкі, выдатнага фатографа. 45 каляровых і чорна-белых фотаздымкаў. Асабліва выразныя — Мулявін у кажушку сярод ветак у шэрані і Мулявін на чоўне. Так і падмывае сказаць — на чоўне жыцця. У апошнія гады яму было брыдка ў гэтай краіне — і яго човен адплыў у вечнасць.

Тацццяна Гаранская і Віктар Маркавец, такім чынам, наладзілі пятую персанальную выставу Яўгена Коктыша, пасля экспазіцый, прысвечаных Васілю Быкаву, Алесю Адамовічу, Міколу Селяшчуку і Стэфаніі Станюце. Мулявінская будзе працаваць да 31 студзеня, потым запланаваны яшчэ дзве персанальныя выставы Коктыша і выданне аўтарскага фотаальбома, прысвечанага 70-годдзю майстра.

На адкрыцці выставы адбылася, як заўсёды, цёплая гутарка, госці дзяліліся ўспамінамі. Каб зразумець здольнасць Яўгена Коктыша адчуць асабістасць свайго героя і ўмельства экспазіцыянераў перадаць гэта майстэрства, на выставу лепш схадзіць. А каб падкрэсліць думку пра тое, што «Песняры» ў кожнага ў Беларусі свае (тыя, першасныя), раскажу асабістую гісторыю. Паступіўшы ў Маскоўскі ўніверсітэт у 1980 годзе, я пазнаёміўся з масквічкай, другакурсніцай, Наталляй К., дачкой савецкага прадстаўніка ў Міжнароднай арганізацыі працы ў Жэневе. Менавіта там «Песняры» давалі свой першы замежны канцэрт, і Наталля з першага погляду — і амаль на ўсё жыццё — закахалася ў Анатоля Кашапарава. Праз усе гады навучання ў Маскве маёй задачай падчас гастроляў там «Песняроў» зрабілася праходзіць за сцэну і выклікаць Анатоля на сустрэчу. Нават скончыўшы ў 1985 годзе МДУ, Наталля пайшла не ў гісторыкі, а ў карэспандэнты «Советского спорта» па гімнастыцы, каб часцей наведвацца ў Мінск, дзе гімнастычная школа ў тыя гады квітнела. Менавіта яна ратавала Анатолеў голас, калі ён садзіўся, дастаўляючы яму швейцарскія лекі. А я, выпадкова трапіўшы ў Нью-Ёрк, калі «Песняры» давалі там у рэстаране «Распуцін» канцэрт на сваё 25-годдзе, хацеў пра гэта пажартаваць, прыйшоўшы за сцэну да Анатоля.

На самай справе, канцэрт у «Распуціне» быў ужо закатам «Песняроў». Бо значна раней, у гады свайго трыумфу, Мулявін, насуперак халоднай вайне, адчыніў ключамі свайго магутнага таленту сэрцы мільёнаў меламанаў ЗША. І ўпершыню паказаў музычную Беларусь той краіне, якая ўвогуле не ўяўляла, што ў цэлым СССР ёсць іншая музыка, апрача гімнаў і ваенных маршаў. Мне ж знаёмства з «Песнярамі» падаравала адзін цуд. Неяк у выходны дзень, ідучы па вуліцы Мінска з фотаапаратам, я сфатаграфаваў сімпатычную маладую даму, і паблюзнерску прадставіўся карэспандэнтам замежнай газеты. А дама, як высветлілася, вельмі перажывала з нагоды магчымага звальнення з работы свайго былога трэнера па мастацкай гімнастыцы, і спыталася, ці няма ў мяне сувязяў дапамагчы захаваць справядлівасць. Праз «Песняроў» у мяне быў выхад на «Советский спорт», і справядлівасць была аднаўлена. А праз пару гадоў дама нарадзіла мне сына. У кожнага — свае «Песняры».

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 92

Падпісана да друку 28.01.2011. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.